# МЯСЦОВАЯ
# ГРАВІТАЦЫЯ

KAMUNIKAT.org

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага літаратурнага аб’яднання
“БЕЛАВЕЖА”

---

Серыя заснавана ў 1990 г.

Кніжка сорак шостая

Рэдактар
Галіна Тварановіч

Карэктар
Вера Іванюк

Тэхнічны рэдактар
Павел Бельскі

На вокладцы:
Марк Шагал, *Вызваленне* (фрагмент)

Publikacja ukazuje się
dzięki pomocy finansowej
Ministerstwa Kultury

© Copyright by Michał Androsiuk

Skład i druk:
Wydawnictwo PRYMAT
Białystok, ul. Zwycięstwa 26C/7
tel. 869 14 87, e-mail: prymat@stnet.pl

ISBN 83-88097-50-4
Nr 46

# Міхась Андрасюк

# Мясцовая гравітацыя

БЛА Беларускае літаратурнае аб'яднанне

Беласток 2004

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

# Шафа

Раніцай, расплюшчыўшы вочы, бачу знаёмую сцяну, акно ў сцяне, за акном – вяршыні дрэў, агаленыя нахабнымі пальцамі зімы, і толькі на досвітку сарамлівы іней апранае іх у карункавую бялізну.

Не хочацца ўваходзіць у чарговы дзень. Бо і куды пасунешся, калі ўсё мястэчка, ушыр і ўздоўж, раней паспеў ты затаптаць глыбокімі слядамі? Ну, няхай там, можна, скажам, пакіраваць на базар. А што на базары? Зараз жа, як і ўчора, прыклеіцца касавокі Жоржык. Што чуваць? – выскаляцца бяззубыя дзясны. Гм, што чуваць?! Тое, што і ўчора чуваць – адкажаш, а касое вока падміргне над тваім плячом:

– Значыць, я пяцёрку, ты пяцёрку і пайшлі. Бачыш, вунь там, *саветку*? Сівае футра, зараз за брамай. *Полька* у яе – прыма сорт.

Можна было б схадзіць да пана Агоньчыка, што трымае спажывецкую краму на самай важнай, Трэцямайскай, вуліцы і яшчэ тры ў другіх закавулках мястэчка. Даведацца, які зараз няпэўны хлеб ад гандлю кілбасамі, сырамі і півам. І наслухацца нараканняў: які клопат такая крама, на досвітку падымае чалавека з пасцелі, і ўсе тыя кантролі, і кошты, і кліенты фанабэрыстыя.....

А калі б у мяне была такая крама, я ні словам не заікнуўся б пра ніякія складанасці. Я б аддаў ёй усю

сваю душу.

Часам нават раздумваю, якія былі б там паліцы, якія халадзільнікі і маразілкі. І прадукты. Калі б была ў мяне спажывецкая крама, нідзе ў мястэчку, нат у самым вялікім супермаркеце, не купіў бы таго, што ў ёй.

Але крамы ў мяне няма. І таму, забіўшыся пад коўдру, назіраю за варонамі за акном. Чатыры чорныя пункты абсталяваліся з пачаткам снежня ў ліпавым галлі. Днём знікаюць па сваіх неадкладных справах. З кухоннага акна бачу, як сноўдаюць тратуарам, какетліва зазіраюць у вочы прахожых, а затым, прыдбаўшы згубленую крошку хлеба, вяртаюцца ў ліпавае прыпынішча. А раніцой, пакуль сонца вытыркнецца з-за блокаў, засунуўшы дзюбы ў цёплае пер’е, тырчаць на сваім месцы. І вось пералічваю іх кожную раніцу. І калі ў рахунках атрымліваецца недабор, дзіўная турбота выгартае мяне з-пад коўдры, запрашае на кухню і загадвае пільна сачыць за бліжэйшым наваколлем. Калі, аднак, чатыры чорныя пункты, аксіяматычнай канфігурацыяй стаяць на фоне шэрага неба, тады і выбівацца з-пад коўдры патрэбы няма. З’ехаўшы з акна, я разглядаю сцяну. А там, як і ўчора, шлюбны партрэт дзеда і бабы, побач бацька і маці, з такой жа нагоды запісаныя на век-вечны аб’ектывам невядомага фатографа, прыхарошаныя фантазіяй рэтушора. Чатыры пары вачэй глядзяць на мяне здзіўленым позіркам, нязменным ад чатырох дзесяткаў гадоў. І адно не магу зразумець, якім чынам, мёртвае, на паперы адлюстраванае аблічча бацькі, з дня ў дзень, непрыкметна напаўняецца дзедавай усмешкай, дзедавымі вачыма, дзедавымі вуснамі. І маршчынамі. І міжвольна насоўваецца думка: калі б на сцяне замацаваць яшчэ адзін партрэт, тады і мой твар насыціцца – пачаткова бацькавай, а затым і

дзедавай усмешкай.

Часам разважаю яшчэ, чый твар, побач з маім, мог бы запоўніць рамы шлюбнага партрэта.

Шмат якія вочы, і шмат якія імёны прыходзяць на думку.

Пані Валя, што прадае газеты ў кіёску насупраць базара. Яшчэ адна пані, якую сустракаю час ад часу на аўтобусным паўстанку – я не ведаю яе імя, але заўсёды, згодна з нормай, даю ёй "дзень добры", і яна ветліва ўсміхаецца.

Але больш за ўсіх мне даспадобы чарнявая, невялічкая, далікатная, бы шкляная, фігурка пані Ані, што жыве ў суседнім пад'ездзе. Яе спальня зараз за сцяной маёй спальні і часам, ноччу, калі спыняюцца на вуліцы ўсе аўтамашыны, і калі над мястэчкам разгартаецца абсалютная ціш, прыкладаючы вуха да сцяны, уяўляю яе соннае дыханне.

Часам яшчэ сніцца мне сон. Разгартаю сцяну звычайна, бы шаўковую занавеску, пераступаю, прыпыняюся ў паўзмрочнай спальні і гляджу ў спакойны твар пані Ані.

Але ж – кожны ведае – і адзін сон складана пераліць у рэчаіснасць, а што гаварыць пра два.

Калі б твар пані Ані стаяў побач з маім на шлюбным партрэце...

Уцякаю ад гэтых партрэтаў. А затым вочы бягуць на супрацьлеглую сцяну.

Шафа....

Бывае, раскрыю дзверы, загляну ў драўлянае нутро. З левага боку чатыры паліцы, з правага – парожняе месца для доўгай вопраткі. Ну, шафа як шафа. Ніякіх там асаблівасцяў. Восьмы месяц мінае, як у маёй кватэры яна. А пачалося ўсё зараз пасля вялікодных святаў.

Дзень быў гандлёвы, серада. У такія дні мястэчковы базар запаўняецца як завязаць. Зараз была

серада, першая пасля Вялікадня, людзі, адсвят-каваўшы тры дні, здаецца, ішлі яшчэ па святочнай інерцыі, а, мабыць, прызапасіўшы раней тое-сёе, не было ў іх патрэбы заходзіць у гэтае месца. Словам, пуставаты паказаўся базар у першую, паслясвяточную сераду. Мабыць, таму і адразу я адсачыў чалавека ў доўгім чорным плашчы. Доўгавалосы, з рукамі, скрыжаванымі на грудзях, пры-пыніўся ля ўваходу на базарны пляц. Побач стаяла шафа на двое дзвярэй. Нешматлікія кліенты праходзілі міма, міжвольна вачыма абмацаўшы шафу і яе ўласніка, хаваліся між ларкоў. Нармальна, бо каму зараз трэба старая, абшастаная мэбля?

– Купі шафу. Добрая, не пашкадуеш.

– Ды навошта мне шафа? У мяне нат і месца няма паставіць такую мэблю, – само па сабе неяк адказалася .

– Затое ёсць у цябе мроі. А месца няшмат яна патрабуе. Дзе паставіш, там будзе стаяць.

Неяк незвычайна сказаў ён гэтыя словы. Упэўнена. Быццам чытаў мае думкі, слова за словам, як чытаецца добра вядомая кніжка.

– А пры чым тут мроі?

Чалавек з шафай не адразу адказаў. Глядзеў на мяне, а яго вочы былі як цёплая летняя вада.

– Не бойся, – сказаў цёплы голас. – Мроі не сорам, кожны чалавек мроіць.

– А пры чым тут мроі? – ніякае разумнае слова не прыйшло мне на думку, і я паўтарыў раней сказанае.

– Яна здзяйсняе іх, – чалавек паказаў на шафу.

– Як, здзяйсняе? Шафа мроі здзяйсняе? Значыць, рыбка яна залатая, ці як? – мабыць, адчуўся ў маім голасе які іранічны фон, бо чалавек прыжмурыў вочы, напружыўся, здавалася, яшчэ глыбей нырнуў у мае вантробы.

– Перш за ўсё яна перайначвае людзей.

– Як перайначвае?

– Пераканайся, – адным рашучым жэстам ён раскрыў дзверы.

Нічога асаблівага за гэтымі дзвярыма не было. Паліцы, папярэчка для вешалкі. Ніякіх тунеляў, тайных калідораў, што выводзяць чалавека на новыя прасторы.

"І ўсё? – хацелася спытаць. – Гляну вось на шафу, пераступлю парог і апынуся ў другім свеце? Як зусім другая асоба?"

Але чалавек з шафай хіба здагадаўся аб маім расчараванні, а можа, карыстаючы наднатуральныя свае здольнасці, прачытаў мае думкі. І пакуль я паспеў адазвацца, ён прамовіў першым:

– Дакладна так. Пераступаеш парог гэтай шафы і вяртаешся назад, як зусім новая асоба. Непатрэбныя дзеля таго ніякія калідоры, зубатыя шасцярні, складаныя машыны.

Мне хацелася смяяцца. Ашуканцаў зараз, як ніколі раней. Дзе ні ступіш, дзе ні глянеш, прапануюцца розныя цуды.

– Самае важнае – зрабіць крок. Ступі, пераканаешся. Тут і зараз.

А наўкол гуртаваліся людзі. Бо людзі – зусім бы птушкі. У кожнай свае справы, і свае прасторы, а няхай толькі адна ападзе ў траву, калупнецца тонкімі кіпцюрамі, зараз на крылах цікавасці злятаецца гаманлівая грамада.

– Што тут прадаюць?

– Нічога, – адказаў чалавек. – Вам нічога, – паўтарыў, паставіўшы выразны націск на слова "вам". І паглядзеў на мяне. "Ідзі!".

Хацелася ступіць і было страшна. Бо і як? Зойдзеш у шафу, закрыюць дзверы, раскрыюць. Нічога не здарыцца і вернешся назад у прыдур-

каватыя воплескі выпадковых людзей, у здзеклівы смех касавокага Жоржыка. А, можа, сапраўды штосьці збудзецца? Пераменіцца ўсё і я вярнуся ў невядомае сабе месца, у чужы свет. За сцяной там невядомае, не пані Ані дыханне, чужыя птушкі за акном, чужыя дрэвы. А, хто ведае, можа сам сабе акажуся чужынцам у гэтым свеце?

– Ну як? – спытаў чалавек. – Ступіш?

Але гэтае “ступіш” апроч мяне ніхто не чуў. Прыкідваючыся купцом, я яшчэ раз абмацаў шафу, там-сям абстукаў кулаком – моцным, здаровым рэхам адгукнуліся сценкі. Закрыў дзверы, раскрыў. Працяглым енкам азваліся завесы.

– Дзверы крыху скрыпяць, але дрэва саліднае, яшчэ пастаіць. А, няхай і прамахнуся. Вазьму, – сказаў я ўголас. І падумаў: “Дома – там ніякіх сведкаў, ніякіх позіркаў – праверыцца ўсё даклад-на”.

Восьмы месяц яна ў маёй кватэры.

KAMUNIKAT.org

# Клёсы

Часам ідзём да Клёса. Гэта наш добры сябра з дзіцячых гадоў. Разам мы гулялі ў мяч, разам хадзілі ў школу. Разам збіраліся ў далёкі свет і нікуды не выехалі.

На прадмесці, між драўлянымі домікамі Клёс трымае маленькую краму. Адвёў для яе месца ў самым утульным куточку панадворку. Раней, калі яшчэ жыла маці, быў тут загончык з картоплямі, а побач з плотам зялёнай сцяной стаялі маліны. Зараз бульбянішча аддалося ў палон высокай траве, прысеў там на кукішках пластмасавы столік, а над столікам, чырвоным мухаморам красуецца вялікі парасон з надпісам *дайліды*. Маліны крыху адзічэлі, але трымаюцца някепска. Абняўшыся за плечы з прыімшэлымі штыкецінамі, малайцавата заступаюцца за інтымнасць прыватнай уласнасці, аддзяляюць яе ад калектыўнай бязглуздзіцы тратуара. Ціха тут і ўтульна. Хочаш – глядзі на дахі маленькіх домікаў або, павярнуўшыся спіной на захад сонца, назірай, як пушча ўрастае ў вечаровае неба.

Часам можна было б таксама схадзіць у цэнтр мястэчка да Нюёрка. У яго сапраўдны рэстаран, плён дзвюхгадовай пабыўкі за акіянам у самы лепшы час, калі амерыканскі долар з аднаго боку быў іконай, што абнадзейвае на жыццё вечнае і бестурботнае, а другі бок выяўляўся зялёным сатанінскім люстэркам, у якім праглядаецца цэлы

свет – распусныя зоркі кіно, бяздушныя банкіры, драпежныя сенатары, апантаныя азартам паклоннікі Лас Вегас.

У Нюёрка столікі абведзены мармурам, а сцены – люстрамі. Адвячоркам, калі змякчаюцца дзень і настрой, прыгасаюць верхнія лямпы, адзінае святло выплывае з адлітых у патынавыя бронзы кінкетаў. Яны хітра прыхоўваюцца між люстрамі і ў срэбным шкле бачыш толькі шэрыя абрысы твараў – свой, Жэніка, Сярожы, Толіка.

Дзіўна глядзець у твар, калі раней скальпель паўсвятла вымыў яго з маршчын і эмоцыяў. Няма ў тваім абліччы гневу, радасці, болю. Можна падумаць – існуеш адно на вырванай з пашпарта фатаграфіі – без адраса, прозвішча, даты нараджэння. І адчуваеш сябе нахабнікам, што, уводзячы ў зман пагранічныя службы чужой краіны, урываецца на забароненую тэрыторыю.

І таму часцей кіруем да Клёса. Ідзем туды, бы ў свой дом. Прысаджваемся пад чырвоны брызент з надпісам *дайліды*. Выпіваем піва, нагбом, з бутэлькі, заводзім гутарку пра абы-што, вось, скажам – аб джынсавай майцы Сярожы Сахарука. У яе доўгая, на чвэрць стагоддзя, гісторыя, а за познім Герэкам каштавала яна маёнтак.

– Зараз не вырабляюць такія майкі, – кажа Сярожа і цаля за цаляй, гаспадарскім вокам абмацвае пакручастыя сцежкі швоў.

Сярожа мае рацыю. Дваццаць пяць гадоў – шмат часу, усё змянілася, правалiліся старыя імперыі, узніклі новыя, а баваўняныя ніткі надалей някепска адстойваюць пазіцыі і толькі ў пунктах неўралгічных – пры кішэнях і на локцях – адступілі.

– Зараз ніхто нічым не займаецца і ўсё як трэба зроблена, – кажа Федзік.

Федзік праўду кажа. Спатрэбіўся б які занятак.

Няхай ужо не самы прыбытковы, няхай і не прэстыжны. Але яго няма.

І таму ідзём да Клёса.

Часам размаўляем аб нашых знаёмых – якую важную персону хто ведае. Сама лепш, калі асоба вядомая з тэлевізійнага экрана, або калі яе здымак запаўняе першую старонку газеты.

Але між нашымі знаёмымі дарма шукаць такіх асоб. І тады наогул называем імёны дваюрадных швграў, стрыечных братоў, сваякоў, ніколі нябачаных, што пасяліліся ў Беластоку, Варшаве, або, яшчэ за царскім часам, з’ехалі ў Канады-Амерыкі. Не распавядае аб іх ні радыё, ні тэлевізар, ды не мае гэта вялікага значэння – зарабляюць там грошы значнейшыя за нашага бургамістра, а – хто ведае – можа нават і з падляшскім ваяводам выстаялі б фінансавую канфрантацыю?

Вось і клічам нашых кроўных пад чырвоны парасон з надпісам *дайліды*. А яны прыходзяць і апранаюць нас у шаты вялікага свету. І ўжо не джынсовая майка, а пінжак Джульюс Ланг агортвае плечы Сярожы Сахарука, і пад спартыўным фасонам калекцыі Нью Джоркер схаваўся абшастаны світэр Толіка, а грудзі Жэніка напінаюцца кашуляй фірмы П’ер Кардэн.

А потым сваякі адыходзяць па сваіх справах, а мы астаемся над парожнімі бутэлькамі з-пад піва і пералічваем, хто каго бачыў у апошні час ці ўвогуле, за ўсё жыццё. Такія гутаркі струменяцца самі з сябе, выдаўжаюцца, аплятаюць лабірынты нашых сцежак вінаграднай лазой. Можна там сноўдаць з раніцы да вечара, не ступаючы на ранейшыя сляды. Бо, што ні скажы, чалавека наведваюць, а ён там-сям быў – у арміі, або – за лепшым часам па пуцёўцы.

– А я на базары Цімашэвіча ўчора бачыў, – кажа

Сярожа. – Ён купляў бананы, і я падумаў: – А няхай там! Два злоты было не было. Куплю таксама”. І купіў. Уяўляеце? На адным ларку.

З словам “уяўляеце” на Сярожавых вуснах выцвітае кветка – каляровая, экзатычная, разгартае пялёсткі – на шчокі, на вочы. І Сярожа ўсміхаецца. Так усміхаюцца людзі ў водгук аднаразоваму, неспадзяванаму шчасцю – вось, скажам, калі насуперак агульным меркаванням пашанцуе ім набраць поўны кошык грыбоў.

– Ну і дзіва, бачыў, – Федзік бесцырымонна згартае ўсмешку з вуснаў і вачэй Сярожы. – Кожны бачыў. А мне во, ён сам гэту руку пасціскаў. Гэтую, – раскірэчаныя пальцы па чарзе пад’язджаюць пад нашыя насы. – І што? І хрэн. Сціснуў і далей пайшоў. А я дзе стаяў, там і астаўся.

У апошні час Федзік скептычна глядзіць на свет. Развалілася фабрыка, злуе жонка, і яе злосць накапляецца, кандэнсуецца ў чорную хмару. Была б тая хмара сапраўдная, атмасферычная – пайшоў бы дождж, паказаўся б які грыб у лесе...

– А як быў фестываль, я бачыў прэм’ер-міністра, – кажа Толік.

Толік не першы раз вышпарваецца наперад абыякім словам. Залішне. Бачылі ўсе. Калі не твар, не постаць, тады, прынамсі, урадавы верталёт бачылі. Разганяючы на ўсе бакі галубоў, кружыў ён над купаламі царквы.

Моўчкі глядзім на Толіка, Жэнік напышліва надзімае губы, пераджоўвае нейкія словы. Мабыць, скажа зараз пра свайго сына – студэнт ён, у Варшаве, і нават на адным курсе з дзяўчынай, якую штотыдзень можна глядзець па тэлебачанні ў тэлесерыяле.

Але Жэніку не хочацца зараз пра сына.

– А гэты прэм’ер-міністр – такі невялічкі ростам

чалавечак. Малы і адначасова вялікі, – здзіўляецца Жэнік.

– Бо чалавека павышае крэсла або добрае аўта, – адзываецца Сцёпка. – Пасадзі мяне на які мерседэс, адразу буду о-го-го. О, сяджу тут пазаўчора, пад’язджае машына. Доўгая, бы аўтобус, а матор працуе ціха, нават не чуеш. Адкрываюцца дзверы і высаджваецца якісьці немяшка. “Бэлавэза. Бэлавэза”, – шваргоча. Хіба ж аб дарозе пытае? Я і ка-жу – калясі метраў сто наўпрост, павяртай у Варшаўскую, затым у Пілсудскага, а далей людзі скажуць. Язык да Кіева давядзе. Зразумеў, не зразумеў – сам не ведаю. Падумаць, звычайны чалавек, гэты немец – не абрыты, зусім як я. Ды дзе ён звычайны, на такой машыне!

Часам размаўляем, а другім разам сядзіцца моўчкі.

А часам хацелася б пагутарыць, а няма якраз з кім. Можна ў такіх выпадках перакінуцца словам з Брунерам. Брунер – спалучэнне пудзеля з таксай, на ягонай кудлатай, доўгай спіне чатырнаццаць год і неабмежаваная пашана да кліента. Шмат за сваё сабачае жыццё бачыў дык і другіх умее слухаць.

– Апорт, Брунер, – Клёс здымае тапачку, швыргае яе на крокаў дзесяць. Кудлатая служальнасць нырае ў траву, разгартае яе носам, вяртаецца з тапачкай назад.

А мы глядзім і пляскаем у далоні.

Словам “апорт” завяршаюцца ўсе нашы помсты: за разбураную Варшаву, і за той мячык, што Герд Мюлер забіў у нашы вароты ў семдзесят чацвёртым, і за ўсе бліскучыя машыны, што паўзуць у пушчу, разгартаючы нас пад адкос магутнымі буферамі. І яшчэ за зоркі, што ў дзіцячыя гады прыселі на пагонах і ніколі не ўзышлі на небасхіл дарослацці.

А між намі ёсць і Клёсы, і Штырліцы, і Чапаевы,

і адзін з чатырох танкістаў – самы мужны, Густлік. Ёсць адзін Пушкін і адзін безыменны Прафесар. І кожная мянушка прыжылася недарма і невыпадкова. Пушкін складаў у маладосці вершы, Прафесар закончыў вечаровы агульнаадукацыйны ліцэй, а вось, скажам, Федзік – часам па прывычцы клічам яго Гагарыным – у школьныя гады, быццам якая касмічная ракета быў Федзік. Сто метраў, і дзвесце, і чатырыста хучэй за ўсіх бегаў – у мястэчку і ваяводстве. Яшчэ і зараз на самай важнай сцяне Федзікавай кватэры побач з іконамі стаяць зжоўклыя дыпломы і медалі – кружкі тэктуры загорнутыя ў бліскучую, залатую паперу з–пад шакаладу.

– Добры Брунер, разумны. Малайчына, – рука Клёса ласкава паглыбляецца ў пакамечаную шэрсць, пяшчотна торгае вушы, а затым ганарыста, панскім жэстам тыркае ў разяўленую зяпу ладны кавалак кілбасы, што ў залішнім чаканні кліента прыімшэла, адышла ад спажывецкіх стандартаў.

І кудлатая зяпа ўсміхаецца. “Добры пан” – калі б хто ведаў, як чытаць сабачыя вочы, напэўна, такія словы прачытаў бы ў карых зрэнках Брунера.

# У цягніку

Колы цягніка каўзануліся па сталёвай спіне рэек, жалеза, напароўшыся на жалеза, азвалася пранізлівым віскатам, і ўсё замаўчала, спынілася так раптоўна, што Марусь, які хвілінай раней прыняў вертыкальную пазіцыю, шлёпнуўся на драўляную лавачку. А ўзняла Маруся на ногі справа канкрэтная – пузыр. Хвілінаў трыццаць, як прыйшоў адтуль першы сігнал, і тады Марусь падумаў: „Стрываю да чарговага паўстанка, здзейсніцца мара”.

Людзі часам даюць самі сабе заданні, правяраюць сябе, выстаўляюць на ўсялякія спакусы, тады асабліва, калі іх лёс у чужых руках. І ўскладаючы сваю будучыню ў тыя рукі, невядомыя ды непрадбачлівыя, чалавек стараецца, прынамсі, ірацыянальнай, тэлепатычнай сілай накіраваць падзеі ў карысны для сябе бок. А калі збываецца мара, можна з горда ўзнятай галавой, з грудзямі, бы парусы напятымі, зайсці ў чарговы дзень: “Глядзіце во, не дармаед я, не шчасліўчык лёсу, што выпадковым дарункам, на чужой спіне вылузаўся з бездані. Сваімі кіпцюрамі адваяваў усё”.

Шлёпнуўшыся на лавачку, Марусь павесіў позірк на супрацьлеглую сцяну вагона, перакінуў у думках свае мроі. Няшмат было іх там. Хто іншы ў такім выпадку зараз і разгарнуў бы якія-небудзь раскошлівыя краявіды, шыбаваў бы між воблакаў, прызямляўся б на выгладжаныя міністэрскімі

задніцамі крэслы. Хто іншы – так. А Марусь быў чалавек канкрэтны, сціплы, тутэйшы. Гэтай сціпласцю і тутэйшасцю размалёўваліся і ягоныя мары. Яны былі звычайныя, як цёмна-сіні артальён на спіне, і салідныя, як чаравікі, што цягам гадоў выстаялі не адну спёку і калюжыну, і можна іх нармальна узяць у далоні, сціснуць пальцамі, бы пяцідзесяцізалатовы банкнот – апошні, які ад лепшага часу заваляўся ў кішэні.

А зараз час прыйшоў няважны – выяўляецца залішнім, стамляючым адпачынкам і безграшовіцай.

„Стрываю да чарговага паўстанка – з пачаткам красавіка атрымаецца праца ”.

Бо Марусь быў кравец. Можа гэта і лішняе слова, можа навыраст. І калі цікавіўся хто знаёмы або калі была патрэба запоўніць якія паперкі, і між другімі рубрыкамі стаўлялася там пытанне аб прафесіі, доўга думаючы, даваў такі менавіта адказ: “Кравец я”.

Бо што скажаш? Працую ў кравецкім кааператыве, не тым, што па душы мне, займаюся, але ў будучыні – хачу, буду, зраблю, пакажу ўсім...

Людзі чакаюць адказаў ясных і простых, а ў службовых папераў таксама ёсць свае варункі і абмежаванні. У другіх выпадках, карыстаючыся нагодай, чалавек пачынае ўголас абмяркоўваць свае тайныя планы, апранаецца ў неналежныя ордэны, няўзнак перасякае мяжу між тым, што ў яго ёсць і тым, чаго яму хочацца..

Вось і быў Марусь краўцом ды працаваў у каапературыве.

Шылі там рабочыя рукавіцы – летнія, з мяккага цёмна-сіняга ціку, з пяццю пальцамі, і зімовыя – пруткія, круглыя аладкі брызенту, дэфармаваныя ізапяткай для вялікага пальца. Сшываючы брызент у прадбачаны праектантамі кшталт, Марусю заўсёды

было шкада гэтага пальца. Уяўляліся зімовая халадэча, скрыпячы мароз і іней, і чатыры браты ў супольнай, утульнай хатцы прыгартаюцца адзін да аднаго, абаграваюць адзін аднаго цёплым дыханнем, перакідваюцца словам. А пяты брат, запёрты ў цёмную келлю, дубянее, калее ў цішыні і самоце.

Але зараз нагоды для такіх шкадаванняў і роздумаў не было. Шмат якія рукі аказаліся лішнімі. Можна іх згарнуць у кулак, засунуць у кішэню, можна таксама, раскірэчыўшы ўсе пяць пальцаў, лавіць за зялёныя косы майскі вецер. І няма пры тым патрэбы адбівацца ад балючых мазалёў ніякімі рукавіцамі.

”Стрываю да чарговага паўстанка – з пачаткам красавіка атрымаецца праца”, – каб не было ніякіх сумневаў, яшчэ раз падумаў Марусь.

Але нават самыя простыя людзі побач з звычайнымі марамі носяць у сабе мроі святочныя. Прыхоўваюць іх у самых недаступных закавулках памяці і адзін раз у год або і адзін раз за жыццё, выносяць іх на белы свет – крадком і пад кантролем, бы вялікодны белы абрус разгортваюць на стале.

Часам такая мроя вырываецца з рук, уцякае, пачынае жыць сваім жыццём, нараджае чарговыя летуценні. А яны, бы фальшывыя сябры, абступаюць чалавека, клічуць, вабяць у чужы і непрыхільны яму свет.

Ніхто дакладна не ведае гэту хвіліну, што прымушае чалавека выгарнуць з сябе самае тайнае. Можа тое здарыцца, калі сядзіш за кавай у рэстаране або за кравецкай машынай “сінгер”, можа адбыцца ў глыбокім сне, а нават у начным цягніку, што, марудна каўкаючы прастрань, нямым вужом паўзе з далёкай правінцыі ў сталіцу.

“Стрываю – ўсё-такі атрымаецца тое, што хачу. Ёсць у Варшаве брат, няхай дапамагае ўладкавац-

ца”, – можна падумаць – цягнік ішоў па рэйках, паглыбляўся ў ноч. Але гэта не поўная праўда. Бо перасякаў ён час вядомы і зразумелы, адбіваўся ад яго ды ныраў у гэту своеасаблівую хвіліну, што прымушае чалавека распрануць самога сябе. І Марусь распранаўся. З цёмна-сіняй майкі. З фланелевай кашулі. З чаравікаў, што выстаялі не адну спёку і сцюжу. А калі зняў з сябе тысячы, дзесяткі тысяч рабочых рукавіц, што цягам гадоў накапіліся на душы, паказалася самае тайнае. Саноўныя вячаровыя сукні і бестурботныя летнія сукенкі. Халодныя жакеты – візіткі бізнес-вумен, і шчабятлівыя блузачкі студэнтак. Шытыя ветрам хустачкі загарэлых турыстак і квяцістыя капелюшы бледных ад палацовага паўсвятла арыстакратак.

Сотнямі мадэляў шоўк пераклікаўся з атласам, лён сплятаўся з воўнай, аксаміт адважна лашчыўся да нясмелых цюляў.

Калі б знайшоўся зараз у купэ які выпадковы спадарожнік, перачытаў бы ўсе думкі Маруся. Але Марусь быў у вагоне сам, адзін. Зусім як зімовымі адвячоркамі на кватэры, калі ўсе тыя шаты, усе мадэлі выліваліся на паперу, разрысоўваліся, набіралі кшталт.

“Ёсць у Варшаве брат, няхай дапамагае ўладкавацца ў якую сапраўдную працоўню”, – так падумаў Марусь. А колы цягніка ішлі. І шчабяталі, і звінелі, і стукалі спраўным рытмам, як звіняць і шчабечуць іголкі “сінгера”, калі вопытная краўцоўская рука стаўляе іх на доўгія аксамітныя рэйкі. За прымкнёнымі вачыма аксаміт слухмяна падстаўляе хрыбет, увішная нітка загартае яго ў элегантныя швы, адштурхоўвае назад, за спіну.

Але час ад часу іголкі памыляліся, сыходзілі з правільнага шляху, ядавітай фастрыгай угрызаліся ў напружаную скуру жывата, скаўзаліся ніжэй.

Ды нічога ўсё. Заціскаючы зубы, Марусь трываў. Яшчэ дзве хвіліны, яшчэ хвіліна. Колы трацілі імпэт, гублялі рытм, запавольвалі крок. Цягнік набліжаўся да паўстанка, што прадказвалі электрычныя лямпы за акном.

Лакаматыў увайшоў між перонаў і спыніўся.

Падчас стаянкі туалетам не карыстаюцца. Скарачаючы апошнюю хвіліну цярпення, Марусь узвёўся на ногі.

“Пойдуць колы, пайду і я”, – падумаў.

Але схадзіць у туалет ён не паспеў. Дзверы раскрыліся, і ў купэ ўвайшла жанчына.

Чалавек, які клянецца, што ў нашым зямным свеце ёсць адно сем цудаў, мабыць, ніколі гэту жанчыну не бачыў. Або здаецца яму, што ўсё важнае на зямлі адбылося раней, да дня нашага нараджэння, ды ўвогуле сусвет на век-вечны астаецца такім, якім узвялі яго за першы тыдзень боскія далоні.

Такія меркаванні далёкія ад праўды. Якраз жаночая прыгажосць – як і чалавечая мроя – не ведае мяжы ні часу, ні прасторы. Выяўляецца, дзе толькі захоча і калі захоча. Нават у звычайны будзённы дзень, у начным цягніку.

Ад уражання Марусь шлёпнуўся на драўляную лавачку чарговы раз. А цягнік пайшоў.

“Яна такая прыгожая, а ў мяне зусім празаічная праблема. Як жа так? Напэўна ж, адразу здагадаецца ў чым справа. І сказаць хай сабе нічога не скажа, а падумаць падумае: “Ён пайшоў у туалет”. І яшчэ падумае: “Слабенькі яго пузыр. Ды ўвогуле – які там ён мужчына?” Ну, быццам нічога, быццам звычайнае, чалавечае. Усе людзі час ад часу прымушаны. А можа і не ўсе? Напэўна, не. Вось, скажам, які Лінда або Пазура, ды і ўсе астатнія, моцныя мужчыны, якіх глядзіш у кіно – здараецца ж

сходзіць ім у туалет, калі побач такая прыгажосць?

Дзіўны сорам загрузіўся на спіну свінцовым цяжарам, прышпіліў да лавачкі. Гэты сорам вядомы кожнаму, чыю абдзёртую куртку ў раздзявальні элегантнага рэстарана вешалі побач з напышлівым каракулевым футрам, і зразумее яго той, хто намацаўшы ў кішэні абшастаную залатоўку, цішком адступае ў найдалейшы закавулак царквы, калі панскім крокам заходзяць на талерку папяровыя дзесяткі і дваццаткі.

Гэты ірацыянальны сорам мацнейшы за божы гнеў і лямант напоўненага пузыра.

Сціскаючы калені, Марусь забіўся ў самы адлеглы куточак купэ. Стараўся глядзець за акно. А нябачная сіла тузала ў спіну: “Глянь, якая прыгожая пані. Глядзі, Марусь”.

І Марусь глядзеў. Крадком, бо калі пані, абводзячы позіркам купэ, спынялася на ягонай постаці, вочы Маруся ўцякалі за акно. Сама выгадней было б апусціць вейкі, прыкінуцца сонным, змораным. І Марусь апускаў вейкі. А пузыр нахабна расшпільваў іх назад. І Марусь зноў глядзеў на жанчыну.

Ад ніякага іншага цярпення, голаду і холаду, час і дыстанцыя не выдаўжаюцца так значна, як ад запоўненага пузыра. Гумавыя хвіліны выцягваюцца да воблакаў, у бясконцасць. І такая гума часу можа быць як трамплін, што, напяўшыся да межаў вытрымкі, шпурне чалавека ў лепшы свет. Але можа таксама лопнуць, абарвацца з трэскам і тады стрымгаловіш у чорную прорву небыцця.

Але калі зашмат выдаўжаецца цярпенне, калі пераўтвараецца ў невыносны боль, вызначаюцца і чарговыя мэты – як вакцына, як апраўданне пакуты і адплата за яе. Бо чалавек у сіле перанесці свой, нават добраахвотніцкім жэстам загружаны крыж з аднаго кутка свету ў супрацьлеглы куток, калі

аплачваецца такая ахвяра добрай цаною. А цана – у кожнага тут свая мера – абяцанне вечнага жыцця, улада над другім чалавекам, жаночая ўсмешка.

“Няхай яна ўсміхнецца, – падумаў Марусь. – І няхай скажа слова. Стрываю яшчэ паўстанак – яна адазвецца”.

Яму раптоўна захацелася слухаць яе голас. Які ён? Безумоўна, яе голас – шолах веснавых ліўняў. Песня вадаспадаў, крынічна халодных нат у летнюю спёку. Подых жніўеньскіх палёў у лютую завею. Бальзам на балючыя закавулкі душы. Так уявілася Марусю.

– А вы далёка? – жанчына азвалася, пакуль цягнік паспеў дайсці да чарговага паўстанка. І праўда, былі ў яе голасе ўсе тыя ўяўленыя ліўні, бальзамы і вадаспады. І Марусь абліўся потам, і разгубіўся, як заўжды губляе думку і шлях чапавек, калі ягоныя мроі апярэджваюць рэчаіснасць. Страціўшы кантроль над моцна сціснутымі каленямі, нат і спалохаўся: ці ўсё нармальна там? Але, пакуль што не адбылося нічога, чаго варта саромецца. Набраўшы поўныя грудзі паветра, Марусь адказаў:

– Далёка, у Варшаву.

– Вось як добра. І я ў Варшаву. Дамоў вяртаюся. Надыхалася тут пушчанскімі араматамі. Ох, як тут прыгожа, – ад успомненай раскошы жанчына пацягнулася, хістануліся пад свіцерам стройныя грудзі. – А вы хіба не дамоў? – спытала, хоць больш у гэтым пытанні было ўпэўненасці. Вядома, не трэба быць пракрокам, даволі адзін раз глянуць, каб адсачыць не варшаўскае, не сталічнае паходжанне цёмна-сіняй майкі, і даволі адзін раз зірнуць на салідныя чаравікі, каб здагадацца, што не на сталічных тратуарах пакінулі яны сваю прыгажосць і рыпячую саноўнасць свінскай скуры.

– Не, – сумна патакнуў Марусь. – З дому якраз я.

– У Варшаву? – абыякавым голасам спытала яшчэ раз жанчына.

– У Варшаву, – адказаў Марусь. – За працай. Я – кравец. Шыю.

– Кравец? – цяпер яе вочы бліснулі маленькім зацікаўленнем. “Як – кравец? Які кравец?” – Такое пытанне яна ўголас не паставіла, але яно адчувалася – у яе вачах, усмешцы.

І Марусю трэба было нешта сказаць. Вочы крадком аб’ехалі яе постаць – твар, грудзі, спыніліся на руках і спалохаліся. Яе далоні нічым не нагадвалі тыя пляскатыя аладкі, што доўгай шарэнгай выстройваліся з-пад іголкі “сінгера”.

– Краўцоўства – гэта мастацтва. Асабліва жаночае краўцоўства. Бог стварыў жанчыну голую, а вось кравец апрануў яе і зрабіў прыгожай.

Адкуль прыйшла Марусю на думку такая думка – ніхто не ведае. Мабыць, калісьці чуў ён гэтыя словы, а можа ўзніклі яны і зараз, самі з сябе? А цягнік, абмінаючы час і прастору, паглыбляўся ў ноч. І ўсё здавалася магчымым, бы ў якім сне. Кожны можа тут думаць, што захоча, можа лётаць, можа нат бяскарна глядзець у вочы прыгожай пані і перакідвацца словам і таксама той, хто раней не меў да такіх панюсяў ніякага дачынення.

І Марусю прыйшла на памяць адна пані, здавалася раней – самая прыгожая ў краўцоўскім кааператыве. Была там брыгадзіркай, час ад часу зазірала ў прадукцыйны зал, абводзіла позіркам усе станкі, а калі прыпынялася за спіной Маруся, ён машынальна апускаў галаву, пільна сачыў за ходам сталёвай іголкі. А напрыканцы мінулага года гэтая пані зайшла якраз у злую хвіліну. Ад няма чаго рабіць, Марусь забаўляўся накідамі сваіх уяўных мадэляў. Пані прыхапіла запоўненую рысункамі

картачку, глянула і ўсміхнулася. І не было як, і не было куды ўцякаць вачам. І прышпіліўшы свае вочы да яе вачэй, ён урэзаў іголкай у вялікі палец,

Але прыгажосць сённяшняй спадарожніцы была зусім іншага гатунку – быццам абразок у кніжцы, прывезенай з далёкай краіны.

Усё ў яе было рэальнае, усё на сваім месцы, у прапорцыях як мае быць. І адначасова – усё ўяўнае, несапраўднае, выдуманае. Але калі нат хто прыдумаў гэту паню, то з канкрэтнай мэтай – раскрыць насцеж дзверы краўцоўскай фантазіі, выправіць яе ў неабмежаваныя прасторы і сцежкі.

– Ну, – сказала пані. – Можа як стрэнемся падчас якой прэзентацыі.

– Можа, – адказаў Марусь.

Жанчына прыліпла позіркам да шыбы. У шкле, начнымі фарбамі пераўтвораным у правізарычнае люстэрка, стаялі яе цёплыя карыя вочы, з-за недасканаласці люстэрка абведзеныя паўзмрокам таямніцы, і вусны, што сакавітай лініяй складаюцца ў чырвонае сэрца, і шчокі, напятыя пружыністым лязом маладосці. А затым вусны расхіліліся, усміхнуліся і ўсмешка разгарнулася на шчокі, на вочы, як разгартаюцца хвалямі зручна пастаўленыя косткі даміно.

Так усміхаюцца людзі, калі вяртаюцца дамоў – усміхаюцца сустрэчы з добра вядомай цеплынёй, з утульнымі закавулкамі кватэры.

“Якая яе кватэра, – падумаў Марусь. – Напэўна, незвычайная, напэўна, такіх у мястэчку няма. Сцярпець адзін яшчэ паўстанак, і яна мяне запросіць на сваю кватэру”.

Думка вырастала адважная, упэўненая, як ніколі раней.

А прыгожая пані ў тую ж хвіліну сказала:

– А ў Варшаве вам ёсць, дзе спыніцца? Ёсць хто

знаёмы?

– Брат ёсць, – сказалася, па інерцыі неяк. І язык, засаромеўшыся, што, мабыць, заўчасна абмінае прыадкрытыя дзверы, пачаў адступаць назад:

– Хіба што ад’ехаў дзе, бо хто яго там ведае, непаседа мой брат, сёння тут, заўтра там.

Цягнік прычаліў якраз да паўстанка і Марусь уздыхнуў з палёгкай: “Выканаў усё-такі. Выстаяў. А ты ціха там – запёрся кулаком у спіну пузыра. – Зараз яна запрапануе наведаць сваю кватэру”.

А жанчына быццам на вяроўцы ягоных думак ішла.

– Калі б якая праблема, вось вам, – працягнула візітную картку.

Марусь узяў яе, перакінуў у пальцах. Перачытаць прозвішча і адрас не атрымалася, падчас станкі лямпы ў вагонах прыгасаюць, кладуцца на сцены, на лаўкі, на шчокі пасажыраў чырванявым паўсвятлом. І ён засунуў картку ў кішэню сіняй майкі, на грудзі, туды, дзе сонным рытмам б’ецца сэрца.

А потым усё расплылося. Ноч, думка, цягнік, сусвет. Нават элегантная працоўня, дзе над вялікім аркушам паперы схіліўся Марусь, закружылася лянівым вярчальным танцам. А пасярэдзіне гэтай працоўні стаяла цалкам аголеная прыгожая пані. Але Марусь не паспеў прыгледзецца да яе сакрэтнай прыгажосці. Няспынны танец загартаў паню ў воблачныя карункі, цюлі, аксаміты.

– Пойдзем? – пытае пані і раскошлівым жэстам працягвае руку.

Расчыняюцца дзверы і з працоўні яны выходзяць у вялікі парк. Між кветак, між старых дрэў спакойным блакітам хістаецца вялікае вока басейна.

– Пойдзем? – пані пытае яшчэ раз і заходзіць у блакітную ваду.

Пытае залішне, бо Марусь ужо ідзе яе следам,

быццам ступае на непазбежны, запісаны ў кніжках лёсу шлях, ад якога не ўцячы, не адбіцца сталёвымі кулакамі. А пры тым ні ўцякаць, ні адбівацца Марусю не хочацца. Нат калі і пратэстуе пузыр. “На халеру табе той басейн, навошта ён? За працай жа ў Варшаву едзем, – вісклівым голасам высалапляецца ён з падбрушша. З-за няўвагі ўласніка выбраўся якраз на волю і, карыстаючы хвіліну, пачынае павялічвацца, надзімацца, запаўняць купэ сваімі празаічнымі жаданнямі. Здаецца, вось і рассыплецца, разарвецца тысячай асколкаў, трапляючы абы-дзе, нат на прыгожую сукенку прыгожай пані.

Але Марусь ужо не чуў вісклівага пратэсту пузыра. Сціскаючы далікатную жаночую далонь, ён паглыбляўся ў блакітныя абдымкі басейна. Цёплая, шаўковая вада агарнула сцёгны, калені. Увішнымі струменьчыкамі пабегла яшчэ ніжэй, на лыткі, у чаравікі, што цягам гадоў выстаялі не адну летнюю спёку і восеньскую слату.

KAMUNIKAT.ORG

# Дзяўчына

Яны любяць разглядаць дзяўчат, што ў разгары маладосці ідуць на сустрэчу з мястэчкам.

Прысаджваюцца за столік зараз побач з крамай “Атлянта”. Гэта добрае месца, на галоўнай вуліцы. А вуліца – і крыніца, і вусце – разгортваецца ва ўсіх напрамках ды згортвае да сябе ўсё, што мае тут якое- колечы значэнне.

І не быць, не пражыцьць у мястэчку даўжэй за два дні, каб не прайсці той вуліцай.

Гэтым шляхам вяртаюцца з мясцовага магістрату турботныя рэферэнты, калі добра не спінаецца ў іх бюджэт, і прыдзіраюцца начальнікі, бо такая праца начальнікаў. І хварэюць шлюбныя жанкі, і сыны падрастаюць неабавязкова на вобраз і падабенства, запісанае ў рамах буйной амбіцыі, і ў шырокім плане года астаецца няшмат месца для празаічнай пляшкі з кумам.

Тут а другой гадзіне пасля поўдня заўчасна пристарэлыя маткі-полькі цішком уцякаюць з ранішняй змены на фабрыцы. І ў думках лаюць гэту фабрыку, што за пяцьсот злотых у месяц бесцырымонна распранае іх з апошніх атрыбутаў прыгажосці. А затым у краме “Атлянта” пераліваюць залатоўкі ў пластмасавыя пакеты з малаком, напаўняюць водарам свежага хлеба, загортваюць у цёплыя апельсінавыя хустачкі. Выходзяць на вуліцу, а сонца ўсміхаецца дзіцячай усмешкай. І ўжо іначай,

і ўжо пяшчотным позіркам абводзяць яны фабрычны комін.

Напышліва надзімаючы бруха, час ад часу перакоціцца вуліцай штатны кіраўнік чагосьці там. Жоўты гальштук, бы кітайскі мандарын, распіраецца, напалову лежачы ў жывой рыкшы.

Часам пройдзе тратуарам пачарнелы ад сонца мужык, што з’явіўся ў мястэчку па неадкладных справах. І вызіраючы з-пад брыля кепкі на сонна спаволены свет, мабыць, тады і не задумваецца – чаму летні час выяўляецца ў розных варыянтах. Мястэчковымі вуліцамі сноўдае нага за нагу, а пераступіўшы мяжу мястэчка, паглыбіўшыся між жытніх палёў, вокамгненна паскарае крок, набірае хуткасць.

Гэтай вуліцай з ліцэальных абдымкаў Піфагора і Сакрата маладосць рвецца бестурботнай рэчкай у шчаслівае папоўдне, значыць – у нікуды.

Дзяўчыну, што ідзе тратуарам, яны бачаць упершыню. Гэта вельмі прыгожая дзяўчына. Гадоў не больш за дзевятнаццаць, высокага росту, але рост яе перш за ўсё выдаўжаюць ногі – значыць тое, што прыдае прыгажосці дадатковы бляск, як спрытная рука ювеліра апранае ў шляхецтва звычайны камень.

Побач з дзяўчынай крочыць хлопец – таксама дзевятнаццацігадовы. Мабыць, які школьны сябрук. На ўроках прысаджваецца за суседнюю парту, а калі ўсе схіляюцца над кніжкамі і сшыткамі, ён крадком спаглядае на яе плечы і ўздыхае, і мроіць якія паветраныя замкі. Ды ўсё  так і астаецца чыстай фантазіяй, бо якое можа мець дачыненне прыгажосць да штодзённай звычайнасці? Бо хлопец бачыцца ім звычайным. Можа, глядзяць на яго з перспектывы маладых, але ўжо сталых мужчын, з таго месца, дзе скульптар-час на адну хвіліну спыняецца,

адпачывае, накаплівае сілы для дэструкцыйнай працы? І тады значная частка свету аддаецца чалавеку ва ўласнасць, а ён, зведзены прывідам, напышліва выдзімае губы. А можа, бачаць хлопца праз вобраз гэтай дзяўчыны, праз яе блакітныя вочы, светлы твар, валасы, такія залатыя, што ўсё побач уяўляецца шэрым і звычайным?

Але далоні хлопца сплятаюцца з далонямі дзяўчыны, яго пакуль што не мужчынскія, але ж моцныя пальцы гуляюць яе доўгімі пальцамі. Здаецца, дзяўчыне гэта падабаецца. І яна ўсмешкай адказвае пяшчотнай гульні пальцаў.

“Чаму зараз такія прыгожыя дзяўчаты? І дзе яны былі раней?” – думае Колька. Уяўленне вылузвае з памяці моцную, прысадзістую фігуру шлюбнай жонкі. Разглядае, параўноўвае. Але параўнанне выходзіць не ў яе карысць – кароткія пульхныя ногі ніяк не паспяваюць за крокамі ног доўгіх і далікатных. Блытаюцца, губляюць дыстанцыю, сварацца адна на другую спацелым дыханнем. А доўгія ногі ідуць, ідуць, ідуць. Ёсць у іх каварства і бязгучная элегантнасць павука, што аплятае вочы тонкай сетачкай. І вачам не закрыцца ўжо, не адступіць убок. Левай – правай, левай – правай, левай – спічастыя абцасікі цокаюць аб тратуар цішэй і цішэй, аж канчаткова змаўкаюць і, узнятыя шырока раскрытымі зрэнкамі, узлятаюць у маёвы блакіт, сплятаюцца з сонечнымі промнямі.

І тады агортвае Кольку сорам, пачуццё віны. Як хлапчук, якога злавілі ў чужым садзе, апраўдваецца, клічучы на памяць усе лепшыя дні. Наогул гэта апошнія дні месяца, калі весела падсвістваючы крочыць чалавек дамоў, пяшчотна кранае запханы ў кішэню кашалёк. З парога расплачваецца з жонкай, аддае ў яе руплівыя рукі прыбытак апошняга месяца. Яна ўсміхаецца, а ён сядае на кухні –

маленькай, тры метры на два – і, зазіраючы ў акно, што раскрываецца на блізнячую, вытканую з вялікай пліты будыніну, паглыбляецца ў талерку цёплага спакою і маленькай стабільнасці.

А вечарам кладзецца побач з жонкай. У асаблівыя хвіліны, згартаючы вусны ў пульхны абаранак, яна вышэптвае адно слова – “о”. Ціхае, сціплае, заўсёды такое аднолькавае.

Колька глядзіць на дзяўчыну, дзяўчына глядзіць на свайго хлопца. Хлопец схіляецца з шэптам да яе вуха, а яе вусны складаюцца ў маленькае сонейка. “О”, – усміхаецца сонейка. Усміхаецца аўтэнтычным, свежым здзіўленнем, заахвочвае, запрашае, вабіць на сцежкі, ніколі раней не кранутыя чалавечай нагой. І Колікаў сорам зноў адступае – на адзін крок, другі. Адступае перад неназванай крыўдай, прадчуваннем, што побач з добра вядомым, рэальным светам ёсць таксама і другі свет – таксама сапраўдны, таксама рэальны. Але гэты свет – за шыбай, за халодным шклом, і не кранеш яго, працягнуўшы руку.

І Колька пытае:

– Як думаеце, ён яе... Ну, ведаеце...

– Вядома, што трахае. Як піць даць, – не падбіраючы словы, не загортваючы іх у бліскучыя паперкі, адказвае Грыша Грынь. – У іх гэта хутка зараз адбываецца. Бузі-бузі і пад коўдру.

– Не, – пярэчыць Колька. – Немагчыма. Ён, пэўна, нават не ведае, як тое зрабіць. Глянь жа, смургаль яшчэ....А і яна, далікатная такая, і такая....такая, – шукае ў памяці слова. – Яна такая чыстая.

Так кажа Колька. Але побач з наяўным голасам ёсць і другі голас – глухі і бурклівы. Колька глядзіць на хлопца, на ягонае плячо, што прыгартае дзяўчыну, бачыць, як усміхаюцца яе вочы. І чорны

глухі голас вытыркаецца з-за сцяны маўчання.

– Яна такая чыстая, – паўтарае Колька. І хочацца, каб Грыша яшчэ раз запярэчыў, няхай скажа якое слова – грубае, непрыемнае, вострае, бы лязо брытвы, што згорне ўсмешку з вуснаў прыгожай дзяўчыны і яе звычайнага хлопца.

І Грыша Грынь кажа:

– Усе яны цяпер чыстыя. Памыўшыся ў ванне. І запіраецца такая, і адбіваецца – падумаў бы хто. І охае, і ахае, і ўсё “не” ды “не” паўтарае. А натура, Колька, інстынкт. Ён у нічым не разбіраецца. Ведаю я іх, жанчын. Ух, як ведаю!

Гэтае “ух”, выказанае кароценька, але эмацыянальна, як рама, што агортвае шмат якія вобразы. Але перш за ўсё ёсць у гэтых рамах адна цыцатая прыгажуня, што прыйшла аднойчы на фабрыку, а калі вахцёры паклікалі Грышу, не гуляючы ў залішнія канспірацыі ці прэлюдыі, яна тузанула яго высока ўзведзеным жыватом. “Пазнаеш?” – спытала. І ён па сённяшні дзень адбіваецца ад гэтай прыгажуні трыма сотнямі злотых у месяц. І шукае нешта знаёмае ў маленькім тварыку, у вачах, у вуснах, ва ўсмешцы. Але адшукаць знаёмае не атрымліваецца. “Як у балота ідуць тры сотні”, – думае Грыша.

Хлопец з дзяўчынай падыходзяць якраз да паўстанка гарадской камунікацыі і прыпыняюцца. Іх пальцы развітваюцца, разбягаюцца. Стоячы побач, плячо ў плячо, разглядаюць расклад.

– Так ці сяк, усе яны б.... Зараз во паедуць на хату. А там старых няма, гуляй душа, – Грыша Грынь разгартае рамы сваёй памяці, як звычайна, знаходзіць там вочы ў вочы вядомую фігуру. Але вобраз дзяўчыны ніякім колерам, ніякай рыскай, наведзенай пэндзлікамі сонца на светлае палатно маладосці, не сходзіцца з вобразам цыцатай

прыгажуні. І дадатковы камень, дадатковая злосць загружаецца на спіну Грышы Грыня.

– Можа не, – уключаецца ў размову Эдзік. – Можа, не ўсе. Ніхто не ведае жанчын.

– Ведаю я іх, добра ведаю. Раз гляну на жанчыну і ўсё ведаю, – запіраецца Грыша, але Эдзік жмурыць вочы, паблажліва ўсміхаецца.

– Памыляешся. Ніхто не ведае жанчыну. Можа і глядзіш ты на яе, а папраўдзе, што бачыш? Сукенку, ногі, прычоску. А яна цябе – вось і разглядае. Зазірае ў вочы, а гартае сэрца, калупаецца ў душы. А часам і мускулы абмацвае, таксама ж, чаму не. Здагадаешся, што там бачыць, што чакае, на што спадзяецца – і яна твая. Спадзяецца на дзікую бестыю – будзь бестыяй. Самай дзікай і самай прымітыўнай. Кусай яе зубамі, рві кіпцюрамі. Але калі ёй хочацца ўвайсці у цёплую ваду, будзь як цёплая бяспечная прыстань.

– А як князя захоча, кажы, што ты сапраўдны князь, а часова злая ведзьма зачаравала цябе ў штатнага працаўніка дзяржаўнай чыгункі, – спрачаецца Грыша.

– Так і скажы, – згаджаецца Эдзік. – Толькі – не словам. Скажы тое жэстам, позіркам, дотыкам. І ніколі не старайся яе канчаткова пераканаць. Няхай прадчувае, няхай здагадваецца. Няхай разгортвае цябе старонка за старонкай, паглыбляецца, нырае глыбей. Аж агарнеш яе плячом, закрыеш у далонях, як безабаронную птушку. А ўвогуле – мужчына павінен маўчаць і слухаць. Тады як губка ён убірае ў сябе і яе, і яе словы.

Змаўкаюць. Хацелася б яшчэ паспрачацца, але вядома, што Эдзік мае рацыю. Бачылі ж не раз, як прызямляюцца ў ягоных далонях тыя птушкі. І зайздросцяць Эдзіку за словы, што ў ягоных вуснах сплятаюцца ў зручныя букеты, а калі трэба,

знікаюць, скаўзаюцца ў маўчанне, утульваюцца ў ціш.

– Хто кахае ўсіх жанчын, астаецца вольным, – кажа часам Эдзік. – Толькі адна паасобная жанчына мае сілу апрануць чалавека ў кайданы. Усе разам – ніколі.

І тады яшчэ зайздросцяць Эдзіку за волю.

На паўстанак пад’язджае аўтобус і хлопец з дзяўчынай знікаюць за чырвонай шырмай.

“Паедзе? Не паедзе?” – Колька ўважліва ўзіраецца ў паўстанак. Незразумелая, ірацыянальная сіла прымушае яго хвалявацца. З ад’ездам дзяўчыны нешта – невядома што – астанецца незавершаным, незакончаным і іржавым цвіком будзе муляць вантробы і скарачаць сціплую прастору мястэчка, памяншаць яе да светлага аблічча гэтай дзяўчыны. “Няхай яна не ад’язджае”, – думае Колька.

Аўтобус адыходзіць. Дзяўчына астаецца на паўстанку адна.

– А гэтай во, што якраз трэба? – Грыша хінае галавой на паўстанак.

– Не ведаю. Можна было б пераканацца.

– Праўда была б. Ты ж яе бацька, – прыдзіраецца Грыша.

– Або дзядзька, – падкідае слова Колька.

Наўмысна так кажуць. Дзяўчына апусціла вейкі, падставіла твар сонцу. Залатыя кудзерыкі рассыпаліся ветрам. Няўрымслівая маладосць стаіць люстэркам на фоне вуліцы. А вуліца ўваходзіць ў гэтае люстэрка і цішком, сарамліва вяртаецца назад – хітрымі вачыма цыцатай прыгажуні, пульхнымі вуснамі, складзенымі ў сціплы абаранак і яшчэ сотняй звычайных спраў. І хочацца – няхай які кулак, якая сіла тузане светлае шкло, а яно рассыплецца дробным макам, і ўсё будзе звычайна, як раней.

– А можа якраз і сірата яна, і трэба ёй бацька? – Эдзік уздымаецца на ногі, пацягваецца.

Моўчкі глядзяць, як ён перасякае вуліцу, пружыністым, хлапечым крокам накіроўваецца на паўстанак.

Аб чым будзе размова – з гэтага месца не ўчуеш. Эдзік нешта скажа, дзяўчына адкажа, адступіць крок, а ён ступіць следам. І яшчэ раз, і яшчэ крок. А затым яна, мабыць, спыніцца, а ён, схіліўшыся да белых кудзерыкаў, нешта прашэпча ў заружавелае вуха. І кудзерыкі страсануцца жэстам пярэчання, адмовы. А калі не будзе ў гэтай адмове злосці, яго вусны яшчэ раз наблізяцца да ружовага вуха. І зараз кудзерыкі страсануцца іначай. Здзіўленнем? Недаверам? Можа жартам, а можа ад звычайнай цікавасці, смешна перакульваючы галоўку, зазірне ў ягоныя вочы. А вочы цёплай усмешкай спытаюць: “Ну і як?”

Калі так усё атрымаецца, Колька спытае хрыплым голасам:

– Вып’еш піва?

Ад пільнага ўзірання ў паўстанак мястэчковай камунікацыі ў горле засохне, здранцвее, прыліпне да зубоў язык.

– Давай, – такім жа хрыпеннем адкажа Грыша Грынь.

А можа будзе зусім іначай? Можа, у адказ на першае слова кудзерыкі страсануцца злоснай адмовай ? І матылём, зняважаным памылковым парывам ветру, разгарне крылы, адляціць у свой свет. Эдзік прыпыніцца на хвіліну на паўстанку, правядзе вачыма лёт матыля, пацісне плячыма і, засунуўшы рукі ў кішэні, вернецца на ранейшае месца.

І пойдуць утраіх у краму “Атлянта”.

Ніхто таго не ведае, бо вуліца прыпынілася на адну кароткую хвіліну і зноў манатонным майскім

крокам ідзе па сваіх справах.

KAMUNIKAT.org

# Мастацкі нос

1.

У квітнеючы летні час пан Антон Лебяда задумаў прыдбаць новы нос. Пазбыцца – сіне-чырвонага, пляскатага, размешчанага наперакор правілам сіметрыі з заўважальным ухілам на левую шчаку. Быццам пасадзілі яго там рукі далёка нецвярозага скульптара.

Мроіўся пану Антону просты, фігуральна дасканалы нос Роберта Рэдфарда, які апранае мужчыну ў нябачны пінжак міністэрскай саноўнасці, або курносік Майкела Джэксана, той на век-вечны замацоўвае свайго носьбіта ў бестурботным хлапечым свеце або, у рэшце рэшт, хай сабе будзе любы. Абы не той, цяперашні.

– Бо і як жа так жыць? – спытаў аднойчы пан Антон, вывучаючы ў люстэрку дублікат сваёй фізіяноміі. – Дзе ні глянь – нос. Вось табе і ўся фізіяномія. Не, няма будучыні з такім картоплем між вачэй, – сам сабе адказаў, бо нос, якраз падведзены да працэсу ранішняга брыцця, не праявіў ніякага зацікаўлення да эстэтычных разладаў. Больш цікавай здавалася яму мануальная эквілібрыстыка рукі, закончанай брытвай. Назіраючы за бліскучым лязом, адчуваючы, мабыць, сталёвае дыханне, стандартна чырвоны, зараз дадаткова яшчэ прыхарашыўся крывавымі фарбамі.

“Калі б нос Клеапатры быў крышку даўжэйшы, хто ведае, у якім напрамку пайшала б гісторыя чалавецтва?” Хто такое сказаў, цяпер пан Антон не памятаў. Зрэшты, якая розніца – хто ён, той філосаф, калі сказана як адрэзана, падумаў пан Антон, выходзячы на вуліцу.

А гісторыя мястэчка ў той дзень кіравалася якраз у мясцовы парк.

Дзянёк быў нядзельны, у парку найгравала музыка, у тым жа напрамку сачыўся борзды струменьчык лакальнай грамадскасці. Згодна з рухам струменьчыка перамяшчаўся і пан Антон. А ўсё разам злівалася ў вялікую яму, невядома чаму званую амфітэатрам.

– Водачка! Сігарэты! – жанчына, замацаваная на сутыкненні дзвюх алеяў, быццам бы павесіла вочы на мяжы вакууму, а зараз яны і з рэальнага свету выгарталі ўсё, што ў гандлёвых разліках кваліфікуецца як патэнцыяльны кліент.

Аднак мясцовае грамадства толькі паасобнымі прадстаўнікамі адказвала згодна волі жанчыны. Бо, як можна здагадацца, жанчына была не з тутэйшых. Не разумела, што народ сёння якраз гуртуецца ў парку дзеля ежы выключна душэўнай. Мо з цягам часу, пасля гадзіны–дзвюх, у выніку інтэлектуальнай раскошы, і яе прапанова знойдзе пажаданы водгук. Ведаючы мясцовыя звычаі, з поўнай адказнасцю за слова можна сказаць: так яно і будзе. Але пазней.

„Вось табе! – падумаў пан Антон. – Бачаць чырвоны нос, зараз жа і прапануюць. А я не такі, як ім здаецца. У мяне на базары ларок з апельсінамі і яблыкамі. І планы, і перспектывы. Яшчэ год-два і адкрыецца сапраўдная крама, вялікая-вялікая”.

Так думаў пан Антон, але ў апошняе і ён сам мала верыў. Гадоў пяць як займаецца бізнесам, а не

надта ж разгарнуўся. А прычына, вядома, між вачэй яна. Кліенты – не скажаш – і падыходзяць, і рукі запускаюць між яблыкаў і апельсінаў. Той-сёй і пра цану пытаецца. А напароўшыся на нос уласніка, адступае ціха назад. „Такі чырванявы ворган, – думаюць кліенты, – вядома, пра якія сведчыць ён схільнасці. А дзе схільнасці, там і ашуканства”.

І не разгарнуцца пану Антону, не падскочыць вышэй за свой нос.

Хвастануты нахабным успамінам, ён выдаўжыў крок і неўзабаве аблакаціўся на амфітэатр.

А на сцэне праходзіў якраз народны фэст. Значыць, адбываліся справы дынамічныя. Спявалі хоры, танчылі, апускаліся са сцэны акцёры і вярталіся назад. То зліваліся ў магутныя, расспяваныя камбінаты, то зноў дзяліліся і метадам пачкавання дарылі жыццё новым дуэтам, трыо, квартэтам. А слухачам – радасць, бо ў выніку анёльскай музыкі людзі забываліся на штодзённыя клопаты і свае фізічныя недасканаласці.

Чарговая група ўладкавалася на сцэне. Гэта быў жаночы хор з дваццаці асоб і кожная такая асоба, упрыгожаная музыкай і каляровым касцюмчыкам, магла б без залішніх клопатаў скалыхнуць з фундаментаў, расслабіць, пераўтварыць у кіпячы вулкан самае халоднае мужчынскае сэрца. Але вочы пана Антона засяродзіліся на салістцы, што, вышпарыўшыся на два крокі наперад, прыхапіла мікрафон і моцным альтам паехала ў натоўп.

Ніхто не ведае, чаму якраз салісты карыстаюцца найзначнейшай ласкай слухачоў і чаму з-за іх падчас рок-канцэртаў згуртаваныя пад сцэнай паненкі трацяць прытомнасць. А часам і сталыя мужчыны, бы той старажытны Уліс, ашарашаныя спевам сірэнаў, забываюцца пра родную Ітаку.

Пан Антон, паглыбіўшыся ў цёплы альт салісткі,

забыўся пра свой родны, няшчасны нос.

А калі хор сышоў са сцэны, расплыўся ў натоўпе, пан Антон невыпадкова апынуўся побач з гэтай салісткай. Прыгарнуўшы пад бокі дзвюх каляжанак, яна ўсё яшчэ падспеўвала, калыхалася за музыкай. І ўсміхалася ўсяму свету. А пану Антону паказалася – яму ўсміхаецца.

І пан Антон шчыра адгукнуўся гармоніку, а нават – ці не першы раз у жыцці – зрабіў шаленчыя вакальныя спробы. Ён напіраў на высокае *до* з заўзятасцю касмічнай энергіі, што, узбуджаная першабытнай сілаю, вылузвае з мікраскапічнага атама яркія зоры, блакітныя планеты, цьмяныя галактыкі. Выкідаючы з вантробаў спантанічныя музычныя каскады, ён усё бліжэй і бліжэй падплываў да каляровага касцюмчыка салісткі. І, зазіраючы ў яе вочы, сэрцам, душою, какетліва-танцавальнай мовай цела, здавалася, пытаў: “Чуеш ты, прыгожая мая? Табе спяваю”.

Дакладна так паводзяць сябе самчыкі салаўёў маёвымі начамі, калі над мястэчковым паркам стаіць шоўкавая цеплыня. І калі з каханай жанчынай паглыбляецеся ў гэтую летнюю ціш, часам шанцуе вам паслухаць какетлівыя напевы. Прыгартаючы плячом каханую, зазіраючы ў яе раззораныя вочы, кажаце ў такіх выпадках: “Ты чуеш, мілая? Ён жа ў твой гонар так”.

Але вашыя словы не грунтуюцца на праўдзе. Каханне – самы эгаістычны стан жывой душы. Кожны тут напявае сваім голасам, і свайму адрасату, і ў сваю карысць.

Пан Антон дарыў сваю песню невядомай харыстцы. Харыстка паказалася яму прыгажэйшай за ўсё, што паклікала на свет гэта майская вясна.

Пан Лебяда быў шчаслівы. Ён адчуваў сябе неадступнай часцінай вялікага народа. Як чалавек,

якому давялося паблудзіць у цёмным лесе, праснoўдаць там увесь дзень, а ў рэшце рэшт выбрацца на, хай сабе і незнаёмую, а ўсё-такі чалавекам назначаную сцежку.

– Ну і крычыць той насаты, – моцны альт вярнуў пана Антона ў зусім немузычную прастору. Голас належыў асобе, якую ў думках паспеў ён назваць вяршыняй прыгажосці ў нашым сусвеце.

– Ага, – падтрымала яе другая харыстка. – Голас нават і нічога ды зусім непастаўлены. І ўражлівасць на мастацтва, на прыгажосць і эстэ-тыку – не адчуваецца.

– Уражлівасць – прыродная справа. Яна ёсць або яе няма. Але ж, як відаць, не ўсе такое разумеюць.

– Далёка не ўсе, – вочы салісткі згубілі ранейшую ўсмешку. Узіраліся ў пана Антона лютым холадам, як суддзі і пракуроры ўзіраюцца ў разбуральнікаў распрацаванага кодэксамі парадку.

Ад шчасця ў няшчасце, ад перамогі ў паражэнне, ад славы ў няславу – нат не крок і не міг.

„Чалавечае жыццё – бы кола аўтамашыны. І зверху ты, і адначасова знізу, і не паспееш прывыкнуць – іржавы цвік спускае дух, пераўтварае цябе ў лішні кусок скамечанай матэрыі".

Такая філасофская думка нарадзілася ў галаве пана Антона, калі на крокаў дваццаць адышоў ён ад цэнтра здарэння. Прыдбаць другіх разумных думак ён не паспеў.

– Водачка, сігарэты, – пачуўся знаёмы голас.

– Дайце пляшку, – азваўся пан Антон. А затым, між блокаў, адбіўшы капслю, заправіў вантробы доўгім глытком гаркоты.

Мястэчка тым часам заходзілася ад музыкі і ад шчасця.

## 2.

Гордзіевы вузлы рэжуцца мячом, а недасканалыя насы – лязом хірургічнага скальпеля. І яшчэ, вядома, далонямі рашучасці і адвагі, без якіх гісторыя астаецца мёртвай думкай, на век-вечны раскірэчанай між мінулай і будучай хвілінамі, а кожны няўдалы нос дажывае сумную старасць, звесіўшы ноздры між правым і левым вокам няшчаснага ўласніка.

У нашым выпадку спрацавалі ўсе неабходныя варункі.

Нос атрымаўся – цуда. Пан Антон глядзеў у люстэрка, кранаў пальцамі бадзёра насцярожаныя ноздры, абмацваў іх, а затым, паставіўшы паказальны палец між броваў, на хрыбет носа, з’язджаў уніз ідэальна прамой лініяй. А пальцамі правай рукі шчыпаў сябе ў задніцу, мацней і мацней, каб адагнаць найпрыгажэйшы сон. Твар у люстэрку, здавалася, зараз разыдзецца, рассыплецца дробным макам і пачнецца няўхільнае вяртанне да прытомнасці, і з срэбнай роўнядзі шкла, здзекліва ўсміхаючыся, вытыркнецца на свет добра вядомая бульбіна.

Твар у люстэрку стаяў непарушна. Можа, калі ад дупы, нахабна практыкаванай рэчаіснасцю, сетачкай нервовых калідораў прыбягалі балючыя сігналы, тады і крывіліся, тады і пратэставалі вусны. А нос якраз трымаў ідэальную лінію.

Ад радасці пану Антону хацелася разарваць грудзі, дастаць адтуль сэрца і шпурнуць яго між усіх людзей – знаёмых і абсалютных чужынцаў. І перш за ўсё ўкласці гэтае сэрца ў далоні прыгожай паніхарысткі, якую першы раз пабачыў у мястэчковым амфітэатры, у гонар якое вылузваў з вантробаў верхняе *до,* і якая бесцырымонна ашарашыла яго

адным словам – насаты.

Але за жорсткае слова пан Антон не крыўдаваў. Ён усведамляў, што гэтая пані прыналежыць зусім іншаму свету, і што ў тым яе свеце зусім іншыя вартасці. Вышэйшыя канстытуцыі грунтуюцца там на пашане прыгажосці, а штодзённыя законы пішуцца тонкім пяром эстэтыкі і фантазіі. Разумеў пан Антон і тое, што ягоны ранейшы нос у тым свеце можа ўспрымацца адно як антаганізм дэталёва абдуманай гармоніі.

Напрыканцы лета пан Антон пачаў зазіраць у той свет. Адвячоркамі прысаджваўся да акна і глядзеў удалеч.

Калі глядзіш у акно звычайна, вачыма, бачыш там шэрыя, шматпавярховыя дамы, вуліцу, дрэвы, запэцканы варонамі тратуар. І чуеш, як грубым голасам гудзяць машыны, і, абмяркоўваючы празаічныя справы, прахожыя перакідваюцца словамі.

Але пан Антон глядзеў у шыбу сэрцам. І ў ягоных думках адлюстроўваўся зусім другі краявід. У бясконцай прасторы ён бачыў бясконцыя шарэнгі пальмаў і кіпарысаў, і яблыняў, што згінаюцца да зямлі цяжарам спелых пладоў. Але яблыкі там не такія, як на базары. Усе яны ідэальныя кшталтам і ўсе спелыя ў чырвань і золата, быццам разбіў хто летняе сонца, рассыпаў у зялёным галлі. А па-над дрэвамі стаялі хмары расспяваных салаўёў, і людзі – усе ў доўгіх белых сукенках – шпацыравалі ў блакітным паўсвятле, хто пры тым гартаў кніжку, хто зручным пэндзлікам замацоўваў на ільняным палатне ўяўныя колеры і кшталты, а яшчэ іншы хто, прымкнуўшы вейкі, выяўляў сябе ў анёльскай песні.

А часам усе тыя пальмы-кіпрысы-яблыні складаліся ў аграмадную арфу. З усіх бакоў зляталіся салаў'і, прысаджваліся на струнах. Прыгожая пані харыстка брала ў рукі райскі інструмент, кранала

яго тонкімі пальцамі і стрэсвала тых салаўёў са струн, як летні вецер страсае расу з жытніх каласоў.

Тады асабліва хацелася пану Антону скласці ў далоні прыгожай пані свой новы нос. І ў доказ шчырага кахання з галавы да ног абсыпаць яе яблыкамі і апельсінамі. Вярнуўшыся з уяўнага свету на мястэчковы базар, ён доўга капаўся ў скрынках і мяшках. Падбіраў, вышукоўваў самыя прыгожыя яблыкі і апельсіны, насычаныя сонцам так глыбока, што і Усявышняму не было б прычыны саромецца за іхнюю якасць.

Але пані не прыходзіла. Мястэчка сцякалася зараз на базар шматлікімі ручайкамі, а ручайкі зліваліся ў гаманлівыя рэчкі, а рэчкі спалучаліся ў адну магутную плынь, і спынялася тая плынь перад ларком пана Антона, бы на якой аграмаднай плаціне. І напаткаўшы найпрыгажэйшы ў мястэчку нос, ранейшая жвавасць і гаманлівасць, пераўтваралася ў шолах, што пераліваецца з вуха ў вуха спакойнымі, паасобнымі кроплямі.

Але часам з шэпту вылузвалася на свет і мацнейшае слова, вострае, бы лязо хірургічнага скальпеля.

– Во, прыдурак які. Во, дзіва. Ніхто, ніколі ў мястэчку такога і не падумаў, а ён...

Гэтыя словы выпраўляла ў натоўп звычайная чалавечая зайздрасць. Яна заўжды пустазеллем выяўляецца там, дзе адвечная аблога расцвітае самотнай і нікому незразумелай кветкай.

Бывае, для адводу вачэй гэтая зайздрасць прыкідваецца светлай патрыятычнай хустачкай, апраўдваецца сама за сваю малечу, і ў такіх выпадках папракаюць вас у куды значнейшай віне: “Ну як жа так? – кажуць. – Без прычыны, дзеля прыватнай карысці адмовіцца, адрачыся, пусціць у заняпад, у забыццё бацькоўскі, класічна беларускі нос?”

Але пан Антон не звяртаў увагі на такія закіды. Ён чакаў блізкае сабе сэрца, брацкую душу, што зразумее кожны позірк, кожны жэст, кожнае маўчанне.

Але пані не прыходзіла. І пан Антон, хочаш не хочаш, часцей зазіраў у яе свет. Не толькі адвячоркамі, але і досвіткамі прысаджваўся да акна, а затым, разгартаючы халоднае шкло, ступаў між пальм і кіпрысаў, і перакідваўся словам з людзьмі ў белых сукенках, і як раней, як у гэтым мястэчковым амфітэатры, быў шчаслівы.

А ў ларку накапліваліся найпрыгажэйшыя яблыкі і апельсіны.

У мястэчку сталявалася восень, з пушчанскіх сцяжын уваходзіла на галоўную вуліцу, з галоўнай вуліцы сачылася між шматпавярховых дамоў, між драўляных домікаў, у чырвань і золата размалёўвала найтайнейшыя закавулкі. І тады ў рэшце рэшт здарылася доўгачаканае.

Прыгожая пані харыстка прыйшла на базар. Прагулялася між ларкамі, там-сям кранула тонкімі пальцамі якую сукенку, у люстрах, для выгоды кліентаў расстаўленых між вопраткай, папpавіла прычоску.

Следам за харысткай крочыў мужчына – моцны, булаваты, быццам у выніку якога землятрусу вырваўся з каменнай скалы.

Яны спыніліся ля ларка пана Антона.

“Які прыгожы нос, – падумала пані харыстка. – Гэта ж ці не той, пра які зараз гамоняць у мястэчку?”

Тым часам пан Антон падбіраў для яе апельсіны і яблыкі. Перакідваў у далонях, разглядаў у залатых промнях восеньскага сонца, пальцамі спраўна абмяркоўваў іх пружыністасць і сакавітасць.

– І вазьмі яшчэ кілаграм чырвоных буракоў і

дзве цыбулькі. Я люблю бурачаны бульён. Сёння зварыш мне, – моцны мужчынскі голас ні то пытаў, ні то загадваў.

А жанчына адказала:

– Так, любіш, мілы мой. Я звару табе сёння бурачаны бульён.

Адвярнулася, яе тонкія пальцы, тыя, што ўчора стрэсвалі салаўіны спеў са струн арфы, цяпер пяшчотным жэстам гладзілі твар мужчыны, яго шчокі напятыя ў два тоўстыя бліскучыя ўзгоркі, і нос, што вытыркаўся з гэтых узгоркаў доўгай, спічастай вежай.

Мужчына ўсміхнуўся, прыхапіў пакеты, загружаныя апельсінамі, яблыкамі, буракамі і цыбуляй. І накіраваўся ў натоўп. Упэўнена, вялікім носам, шырокімі грудзьмі і моцным плячом разгартаў натоўп, як сталёвы карабль разгартае збунтаваныя хвалі.

Пані яшчэ раз крадком зірнула на твар пана Антона.

“Які прыгожы нос. Шкада, што не сапраўдны ён”, – падумала яна і, нібыта бяспечным калідорам, пайшла ўслед за сваім мужчынам.

# Гравітацыя

Чалавек, такі яго склад, заўжды хоча быць у жыцці кімсьці другім, чым ёсць. Фабрыкант адвакатам, адвакат афіцэрам, афіцэр няшчасна закаханым паэтам. А няшчасна закаханы паэт, калі ўжо дашчэнту размажа па паперы свой плач і роспач, хацеў бы стаць самым буйным фабрыкантам у краіне. Ды гэтай пані, што адмовілася ад ягоных пачуццяў, даказаць, які катастрафальны зрабіла яна промах. Вось, скажам, пасылаючы ў вакацыі на яе хатні адрас фотаздымак з самай экзатычнай краіны свету.

І з фатаграфіі ягоныя вочы няхай глядзяць у вочы гэтай пані. Дакладна так, як у далеч акіяна ўзіраюцца рассыпаныя па берагах Вялікоднай выспы каменныя валуны – позіркам надчасавым і абыякавым, характэрным чалавеку, у якога заўсёды ў задняй кішэні нагавіц валяецца лішні мільён долараў. І яшчэ няхай гэты позірк уваходзіць у яе сэрца калючымі іголкамі, і ад бясконцых параўнанняў і перападлікаў няхай кожную яе ноч пераўтварае ў нямы, бясконцы папрок. У адрас, здавалася, блізкай, а папраўдзе абсалютна чужой спіны, што разлажылася побач ды храпе стомай штодзённага змагання за хлеб і кусок сала да хлеба.

Мне хочацца на Вялікодныя выспы. Глянуць адтуль, з самай далёкай перспектывы на маленькія домікі, на кумпясты купал сабора, на стральчатую вежу касцёла, што дзесяцігоддзямі калупаюцца ў

адных і тых жа воблаках. І на смешныя постаці маіх суседзяў, якія ў мурашэчай руплівасці збіваюць абцасы аб учарашнія сляды.

Штодзённа заходжу на вакзал, прысаджваюся на лавачку. Маўклівая грамада высыпаецца на тратуар, разбіваецца на паасобныя сцежкі. Па звычцы пералічваю добра вядомыя фігуры.

А часам гуляю сам з сабою і называю колькасць пасажыраў раней, пакуль раскрыюцца дзверы аўтобуса. Наогул не памыляюся.

Аўтобусы адпачываюць пяць, дзесяць хвілін. Насунуўшы брыль кепкі на вочы, кіроўцы адыходзяць у кароценькую, даступную толькі катам, бяспечную адсутнасць у натоўпе. А потым рэзка азываецца матор, выбягаюць на бела-сінюю спіну механічныя дрыжыкі, саслізгваюць на колы і нахабнымі кулакамі выштурхоўваюць іх у чарговы шлях. Праводжу позіркам сіні хрыбет. Бачу яшчэ, як аўтобус, дасягнуўшы краю вулачкі, прыпыняецца, паварочвае направа, хістаючыся перасякае чыгуначныя рэйкі, крыліць рондам побач з касцёлам і знікае за зялёнай шырмай між дрэў. Тады хочацца кінуцца наўздагон, на ляту раскрыць дзверы, нырнуць у цёплае нутро, заваліцца ў самы задні фатэль. І маленькім домікам, і вуліцы, заклятай у ліпавыя шарэнгі, і ўсяму мястэчку памахаць рукой на развітанне.

Гэтая думка – імгненне. Нараджаецца і знікае, не паспеўшы набраць рэальных кшталтаў. Я дасканала ведаю, што бела-сіні аўтобус адыходзіць не да экзатычных берагоў. Заканчвае маршрут далёка раней, у вёсках, у мястэчках кропля ў кроплю, як нашае. А пры тым, як і ягоныя пасажыры, бясконца паўтарае свой шлях, круціцца ў зачараваным коле на сярмяжных вяроўках мясцовай гравітацыі.

А мяне гэтая гравітацыя штодзённа прыцягвае

на вакзал. І сам сябе пераконваю, што мне вельмі падабаецца гэты вакзал, і ні ён, і ні я ў нічым мы не змяніліся за апошнія трыццаць год, з дня, калі зайшоў я сюды першы раз. А затым з-за аднае сяброўкі пачаў наведваць гэтае месца ў кожнае нядзельнае папоўдне.

Яе імя было Зося, найпрыгажэйшая дзяўчына ў суседнім ліцэі.

Скажаце: А як вызначыць, якая дзяўчына самая прыгожая?

А я адкажу: Дзяўчына, у якую ты якраз цяпер закаханы, прыгажэйшая за ўсіх.

Зося высаджвалася з аўтобуса, і мы ўшываліся ў маленькі сквер. З левага боку белай вежай уздымаўся ў неба касцёл, за спіною гаманіў бар „Крынічка", а тратуарам ішлі ўсялякія дзядзькі і цёткі – каму трымцела пагутарыць з Усявышнім, а каму – бліжэй у „Крынічку", дзе векавечна смутныя афіцыянткі разліваюць жоўтае, мутнае піва. Звычайны ў нядзелю абразок.

Чарговыя аўтобусы выплёўвалі на тратуар групкі хлопцаў і дзяўчат, што таксама з'язджаюцца з навакольных вёсак, рассыпаюцца па знятых кватэрах, а з панядзелку раніцай, заходзячы ў школу, даганяюць новы свет. І ўжо бачаць сябе – у кожнага тут свая мера – краўчыхамі, слесарамі, лекарамі.

Час ад часу і мне ўяўлялася такое, асабліва ўвечары. Цэнтральнай вуліцай ішлі мы з Зосяй, а шарэнгі блокаў глядзелі на нас цёплымі вокнамі. І я ў думках кляўся першаму каханню – будуць і ў нас свае вокны, самыя цёплыя і самыя светлыя ў мястэчку. І стане ў гасцінным пакоі вялікі стол, а зімовым адвячоркам, калі сонца, ледзь кранууўшы гарызонт, рассыплецца ніткамі паўсвятла, засеўшы за той стол, будзем з сонечных ашчэпкаў снаваць заўтрашні дзень.

Адкуль паявіліся на вакзале Болік і Папусь, не ведаю. У Папуся тырчала з-за пляча неадлучная гітара, ён усміхаўся на ўсе зубы, як усміхаецца чалавек, які хоча сказаць: „Глядзіце, які прыгожы свет. А я гэтага свету – уласнік”.

Болік таіўся крокам ззаду, па звычцы моўчкі лускаў семачкі ды пляваў пад ногі чорна-белымі лупінамі.

Я ніколі не мог зразумець, якая сіла спалучае гэтыя дзве, крайне розныя асобы – упэўненага ў сваёй выключнасці гаваруна Папуся і Боліка, які ад страху перад нечаканасцямі свету прыкідваецца маўклівай воўчай скурай, і ў кожную хвіліну гатоў кусаць усё, што падступіць бліжэй за працяг рукі.

– Пазнаёміш з дамай? – не чакаючы адказу, Папусь какетліва зазірнуў у вочы Зосі. – Я, Папусь.

– Дзіўнае імя, – сказала Зося.

– Як і я дзіўны. Увесь свет ужо такі. І гэтае мястэчка таксама. Чароўнае. Ведаеш нашае мястэчка? Ты адкуль будзеш? Ты даўно тут? – адно за другім пасыпаліся пытанні. А калі Зося назвала сваю мясцовасць, Папусь бесцырымонна працягнуў руку:

– Пайшлі, глянем тое, чаго не відаць на цэнтральнай вуліцы.

І мы, не спяшаючыся, нага за нагу, пайшлі глядзець мястэчка. А калі Зося, спыніўшыся побач з нейкай вітрынай, адстала на некалькі крокаў, Папусь спытаў:

– Трахаецца?

Менавіта так, груба і нахабна спытаў ён, быццам бы ў краме даведваўся пра свежы хлеб або, скажам, аб уласцівасцях легкавушкі „Волга” пытаў: якую хуткасць набірае за дзесяць секунд, які рухавік там, а якія тармазы.

І ў такі момант трэба было даць Папусю ў морду. Па-мужчынску, звычайна. А я адно ўсміхнуўся і

адказаў:

– Сам пераканайся.

А Папусь спытаў яшчэ раз:

– Напэўна, дазваляеш?

І трэба было другі раз заехаць яму ў мызу, бо важныя справы вырашаюцца неадкладна, зараз, адным махам. У іншым выпадку набываюць толькі вядомы напрамак, ніякавеюць, распаўзаюцца ў выпадковасць. І цераз дзень, цераз хвіліну не згарнуць іх, не паставіць на прадбачаныя рэйкі. Але я не заехаў Папусю ў мызу. Заціскаючы зубы, сказаў:

– Дарма прыдзіраешся.

І прыйшоў на памяць суботні вечар у Зосі, на вёсцы. Дом культуры, званы „святліцай”, запоўнены пад завязку, натоўп пажылых цётачак, прыпятых да сценаў цвікамі цікавасці: трэба ж сачыць ім за ўсялякімі выкручастымі фігурамі, што ў ніякім выпадку не прыпамінаюць добра знаёмыя вальсы або полькі. Пад поўнач, калі саліст-гітарыст ад рэзкіх рок-анд-ролаў накіраваўся ў фанетычныя настальгіі, мае вусны дакрануліся да яе вуха. „*Siedem dziewcząt z Albatrosa, tyś jedyna*”, – міжвольна прашапталася ўслед салісту. І Зося збянтэжана адвярнула твар, напружылася, засаромелася. – Не трэба, глядзяць жа, – зірнула на сцены, аблепленыя жаночымі фігурамі.

– Лішні клопат, Папусь, – падбадзёраны ўспамінамі, мой голас памацнеў, набраў упэўненасці. Але Папусь не адступіў. Ён пачухаў патыліцу, крыва ўсміхнуўся:

– Наліём, увідзім.

Я не адразу зразумеў, у чым справа.

А потым у спажывецкай краме мы прыдбалі дванаццаць пляшак звычайнага віна.

– „Кордыял”, дванаццаць штук, – так менавіта сказаў Папусь. І напаткаўшы здзіўленне ў вачох

прадаўшчыцы, дапоўніў:

– Чатыры чалавекі, кожнаму тры пляшкі.

– А я не п’ю, – Зося сказала якраз так, як я спадзяваўся.

– Ну, хлопцы, тады – нам задача. Або ўтраіх змагацца, або пераканаць і яе, – падміргнуў Папусь і вярнуўся да ранейшага:

– Усё-такі дванаццаць, проша пані.

А ў наш бок:

– Дык куды пойдзем? Болюсь, мо да цябе? Маці, як нармальна, у царкве зараз?

– А як жа іначай. Там і жыла б, бляха, калі б бацюшка нанач дамоў не вытурваў, – пацвердзіў Болюсь.

І мы павярнулі з цэнтральнай вуліцы, павалакліся між драўлянымі домікамі, што ўзвяліся неахайнымі пальцамі тымчасовасці, а зараз выстойваюць чарговае дзесяцігоддзе.

З парога Папусь узяўся выконваць абавязкі гаспадара. Заехала на стол першая бутэлька, зараз жа і распранулася на чатыры шклянкі.

– Ну, за знаёмства, – узняў пасудзіну. – І старое, і новае, а мабыць і бліжэйшае. *Kropla drąży cnotę*, як кажуць старыя палякі, – апошнія словы кіраваў чамусьці мне.

Зося ўзіралася ў сваю порцыю бронзавай вадкасці, яе вочы закругляліся ад здзіўлення, як заўсёды, калі чалавек упершыню бачыць нейкае дзіва.

– Я ніколі не піла такое....

– Заўсёды бывае той першы раз. Усё, што мае канец, мае і пачатак.

Шукаючы бяспечную прыстань, яна ўтулілася ў маё плячо.

А Папусь глядзеў мне ў вочы, як экзатычная кобра ўзіраецца ў нявінную ахвяру, гіпнатызуе яе, а затым безбалесна і не заўважыш, калі каўкне. А

можа зусім іначай было? Мабыць, між нашымі вачыма ішло нямое сілаванне, выкліканае раней, на вуліцы, яго нахабніцкім „трахаецца?” і маім упэўненым у перамогу „пераканайся сам”. У рэшце рэшт Папусь разявіў рот, пераліў туды змесціва шклянкі. А пакуль Зося ўсё яшчэ не вырашыла, што далей, падштурхнуў і яе:

– Махні. Хіба ж яго баішся? Забараніў? – выскаліў зубы ў мой бок.

– Нічога не забараніў я, – насуперак галаве, дзесьці з вантробаў азвалася дзіўная заядласць. – Махні, Зося.

І Зося махнула. Адставіла шклянку, і пасудзіна, бы чарадзейскай палачкай кранутая, зноў запоўнілася віном.

Пры восьмай бутэльцы Папусь узяў у рукі гітару, спрактыкаваныя пальцы пабеглі па струнах, ён пачаў спяваць. І Зося ўсміхнулася:

– Я таксама люблю спяваць.

– Тады давай, зложым які дуэцік, – узрадаваўся Папусь. – Гастролі, эстрады, юпітэры. Заваюем свет, ты і я.

Пачуўшы такое, мне раптоўна захацелася смяяцца: „Які свет заваюеш ты? Які дуэцік? У нас з Зосяй будзе дуэцік. Я хірург буду, а яна акуліст. Даўно абмеркавалася ўсё. Ды адкуль табе, Папусь, ведаць?”

А Зося неспадзявана сказала:

– Чаму не, цікава. Але, ведаеш, бацька і маці бачаць мяне лекарам. Я, мабыць, першы акуліст у гісторыі нашай вёскі. Ха-ха-ха.

Яна зайшлася смехам, а потым, узняўшы поўную шклянку, павяла частушку пра віно, якое кожнаму даспадобы і без якога чалавечае жыццё не мае ніякага сэнсу.

Мае вочы закругліліся ад здзіўлення. Я ніколі раней не чуў пра такія эстрадна-вінныя схільнасці

маёй дзяўчыны.

– Тады – за новы дуэт, – цокнуў шклом у шкло Папусь. Падняўся, уключыў магнітафон, на хісткіх нагах раскірэчыўся перад Зосяй, хіліўся:

– Будзем танцаваць?

„Ну, што мне рабіць?”, — пыталі яе вочы. Але разгубленасць, здаецца, даўно аддала перавагу зацікаўленню. З яе ўсмешкі, з яе ненатуральнай жвавасці можна было зразумець, што адказ на пытанне вырашаецца і без майго ўдзелу. І я, уцякаючы позіркам у куток, адно паціснуў плячыма:

– Хочаш, танцуй.

Яны танчылі, калі можна называць танцам манатоннае хістанне з нагі на нагу. Ягоныя далоні, памаленьку, пачынаючы ад шыі, вандравалі ўніз, стараліся прыгарнуць яе бліжэй, шчыльней да сябе, а мне хацелася бачыць, як мая Зося адступае, адбіваецца, абараняецца ад нахабнай атакі, аж, у рэшце рэшт, апынуўшыся ў бязвыхадным становішчы, пасылае мне апошнюю просьбу аб сяброўскай дапамозе. І я, быццам ашалелы рыцар, кідаюся ў чорныя віры, перамагаю усіх ворагаў, і ўвесь свет, і на спіне, пасечанай злымі шаблямі, выношу каханую на паласу, ясную ад сонца....

Але просьбы не было. А Папусь, хітра ўзяўшы напрамак, кіраваў Зосю ў дзверы спальні. І час ад часу, з-над пляча пазіраў у мой бок. Ягоныя вочы пыталі: „І што? Усё яшчэ хочаш пераканацца?”

„Хачу!”– адказвалі мае вочы. Тупая ўпэўненасць, што прывалаклася з алкаголем, падбадзёрвала: „О так, хачу пераканацца. Пераканайся і ты, Папусь. Зося, мая Зося, не такая ўжо яна і...”, – я не паспеў знайсці слова, што вызначыла б – якая яна, мая Зося.

Дзверы ў спальню закрыліся.

„Няўжо ўсё яно проста так?” – жоўтая лямпачка

загарэлася пад чэрапам, абліла цёплым воскам твар, спіну, ногі. У цьмяным святле хістануліся сцены вясковай *святліцы.* „Не трэба – не трэба – не трэба”, – загаманіў размазаны па сценах натоўп.

Не трэба – нямым рэхам адгукнуўся мой страх. Страх, які паяўляецца заўсёды, калі нечакана і несправядліва пераймаюць у чалавека шлях, прадбачаны ў заўтрашнім дні. Ён вылузаў мяне з-за стала, узвёў на ногі, накіраваў у дзверы спальні.

– Ты куды? Чаго там не бачыў? Сядзі, бляха, – Болюсь, які раней і словам не азваўся, палажыў руку на маё плячо, прыціснуў уніз. – Выпі. А Папусь і сам ведае, што рабіць.

І я выпіў. І сам сабе вырашыў: „Пайду ў спальню, калі яна пачне крычаць”.

Але ж з-за сцяны не даходзіў ні адзін гук. Замоўк і магнітафон, стала ціха. Адно Болюсь мармытаў нешта, прыплюшчыўшы вочы.

І раптам у раскрытых дзвярах паказаўся Папусь.

– Не магу, хлопцы, ну звычайна – не магу.

– Што – не можаш? Як? – не зразумеў Болюсь. Забіраўся пры тым за апошнюю пляшку.

– Ну, ніяк не магу. Віно хіба дурное або што?

– А-га, там. Зараз віно, – Болюсь напоўніў шклянкі, кульнуў сваю порцыю, падняўся на ногі.

– А яна, што? – паказаў галавою на спальню.

– Як, што? Нічога. Ляжыць, бы здзёртая шына. І толькі ўсё паўтарае: “Ванітаваць хачу...”

Болюсь знік за дзвярыма. Вярнуўся на кухню праз хвілінаў трыццаць. Расчохраны, пачырванелы. Левай рукою прытрымліваў нагавіцы, а пальцамі правай паказаў:

– Два разы засупоніў. Разумееш? Два, – падсунуў Папусю пад сам нос, раскірэчаныя ў літару *v* пальцы. Быццам у доказ перамогі. – Віно дурное! Сыраватку табе, не віно.

Аформіў нагавіцы, прысеў за стол.

За акном сталяваўся зімовы адвячорак. Ранейшая эйфарыя, разбіваючы апустошанае шкло, пералівалася ў маўчанне, у смутак. І Болюсь сказаў:

– А ты, Папусь, не бяры ў лоб. Здараецца.

Але Папусь хіба не чуў, што яму кажуць. Падняўся з-за стала і моўчкі пайшоў на вуліцу.

У той момант паказалася на кухні і Зося.

– О, прывітанне, – у Болюсевым голасе адчувалася абыякавасць, бесцікаўнасць уласніка, што выпадкова сустракае сваю добра вядомую ды не надта цэнную рэч.

Але Зося нат не глянула ў наш бок. Мабыць, усё, пра што яна зараз думала – нябачнай, ананімнай, не запісанай у нашай памяці пракаўзнуцца ў паўзмрочнае нутро мястэчка.

– Ванітаваць хачу, – пусцілася кулём у дзверы. А цераз хвіліну вярнулася, прыхапіла паліто, распятае на спінцы крэсла і, не сказаўшы слова на развітанне, знікла.

Чарговы раз я ўбачыў яе праз тры тыдні пасля Вялікадня. У белай шлюбнай сукенцы, у вэлюме. Нат фігура не паспела яшчэ прыпсавацца.

– Бацькам буду, бляха, – на Вялікдзень сказаў мне Болюсь. – Старшы сват патрэбны. Папусь адмовіўся. Можа ты?

– А маці, хто? – хацелася, няхай назаве тут абыякое імя, самае дзіўнае, або самае нечаканае, або няхай скажа, што ўсё гэта няпраўда, выдумка, жарт.

Бываюць хвіліны, калі насуперак фактам чалавек загадвае вачам бачыць тое, што ўяўляецца ў душы. Так нараджаюцца цуды. Ды не штодзённа прыходзяць яны на свет. І зараз таксама цуд не здарыўся.

– Сам ведаеш, Зося! – Болюсь сплюнуў на тратуар пакамечаную семачку.

А ў трэцюю нядзелю пасля Вялікадня трымаў я вянец над галавою Болюся.

*„Абрашчаецца... раб... Божій... Да... рабы Божай”*, – голас бацюшкі ўзлятаў да высокіх купалаў, вяртаўся ўніз і глухім басам забіваўся ў мае думкі, як у труну забіваюцца апошнія цвікі. А мне хацелася працягнуць левую руку, крануць белы вэлюм і ад-шукаць водар бялявых валасоў, запісаны ў памяці шматлікімі абразкамі.

Адганяючы назойлівыя думкі, я ўцякаў позіркам на спіну Болюся. І стараўся пералічыць кропкі перхаці, што, асыпаючыся з ягоных валасоў, засеялі белым вяночкам каўнер смалістага, шлюбнага пінжака. Ды не пералічыў, зашмат было іх.

А пасля царкоўнай цырымоніі, парваўшы ўсе законы, якімі абмежаваны старшы сват, я заснуў пад сталом.

– Ну і калегі ў нашага Болюся, – пад раніцу хтосьці выштурхоўваў мяне на белы свет. Пралупіўшы вочы, пазнаў злосны твар Зосінай маці. І прыдбаўшы неяк вертыкальную пазіцыю, пайшоў на вакзал.

Хацелася сесці на які-колечы аўтобус, нават не ведаючы яго маршруту, ды адправіцца ў самае далёкае месца на зямлі.

# Верш

Восень набліжалася ў мястэчковы парк. Бярозы стаялі ў золаце, чырванелі клёны, ранішняя імгла доўга, амаль да паўднёвага сонца блукала асфальтавымі сцежкамі. Восень, кажуць, лепшая пара рэкрутацыі ў паэты. Якое ж тады дзіва, што ў Сашы Перчука напрыканцы верасня аб'явіўся талент?

Пабразгваючы медзянымі чупрынамі, адыходзілі ў імглістую далеч белавежскія дубы, асыпаўся іней на жоўтыя бярозавыя сукенкі. Свет паміраў. І Сашу Перчуку таксама хацелася легчы мёртвым. З усякіх біяграфіяў яму падыходзілі асабліва тыя, дзе паэт не надта доўга бавіў час у вядомым нам свеце.

Там, куды самі не даедзем,  
Там, куды павязуць нас  
Сябры, сваякі і суседзі....

На чацвёртай лінейцы верш захрас па самыя вушы, бы той, запамятаны з дзяцінства, бацькаў воз з дрывамі, крадзенымі ў Казённым лесе. Як ні падступаў Саша да чацвёртай лінейкі, як ні браўся за яе – не рыфмавалася, а калі ўжо – то ў зусім банальную, даўно праспяваную фразу.

Нават спроба змяніць парадак слоў давала адмоўны рэзультат.

Змораны творчымі пошукамі, апранаў Саша Перчук доўгі чорны плашч і паглыбляўся ў мястэчковы парк. Крыссе плашча ён не зашпільваў, любіў, калі вецер шкуматае іх, калі дрыжаць ад

восеньскага холаду, як чорныя харугвы – прадказальнікі злавеснай навіны. Паглыбляўся ў парк, не спяшаючыся. Насы туфель міжвольна калупаліся ў жоўтым дыване, галава інстынктыўна цягнулася да ветру. Ён асабліва любіў крочыць насупраць ветру, бо тады валасы, якія, быццам бы прадчуваючы мастацкую місію, не стрыг гады два, хісткімі блёнд–ветразямі плылі за спіною.

Такі жывы малюнак бачыў калісьці Саша ў кіно. Паэт у восеньскім парку, раскладзеныя ветрам валасы, надзьмутае подыхам лістапада крысо паліто. Праўда, той асобень меў на сабе і белы шаль, доўгі-доўгі, які, двойчы завінуўшы шыю, ападаў на медзяную сцежку. У мястэчковых крамах якраз не было такіх доўгіх, белых шаляў, прадаўшчыцы прапаноўвалі ўзамен іншыя колеры або сціплейшыя памеры, ды Саша, які ў прынцыповых справах прыняў рашэнне не карыстацца сурагатамі, глядзеў на тых дзяўчат з агідаю, але моўчкі: у рэшце рэшт, не яны ж вінаватыя за сваю ігнаранцыю ў мастацкім сусвеце.

Халодны дождж Саша Перчук таксама любіў. Можна здагадвацца – ці не мацней за лістападаўскае сонца. Уяўлялася яму: вось застудзіцца ад нябеснага плачу і памрэ. Ды не проста сканае, напруціцца раз–два, бы які надарваны жыццёвымі важданінамі дзядок. О, не. Паміраць Саша будзе доўга – сама лепей ад туберкулёзу. У нейкім сырым, паўзмрочным сутарэнні, у цішыні і адзіноце. Калі тым часам за акном, што разлажылася амаль на тратуары, чалавечыя, зямныя справы, у туфлях, у чаравіках, у гумавых галёшах пабягуць – кожная ў сваім напрамку. І адно худая паненка з мясцовай арыстакратыі будзе наведвацца раз у тыдзень з клуначкам прысмакаў, крадком згорнутых з сямейнага стала. Замарудзіць якую гадзінку, слухаючы ўваж-

ліва, ці не прагучаць паміраючыя вусны яшчэ раз, мабыць апошняй, несмяротнай фразаю.

"Толькі адзінокі паэт у змозе стварыць вечнае". Вярнуўшыся з парку, Саша Перчук сядаў у пярэднім пакоі, абапіраўся спіною аб радыятар, а пані Перчук згартала ружовым ручніком з доўгіх блёнд-валасоў восеньскую непагадзь. Затым уцірала ў мужаву спіну нейкую масць ад застуды, брала яго за руку і праводзіла на кухню, дзе на стале, дыхаючы сытасцю і цеплынёю, чакала талерка з памідоравым супам.

– Еш, Сашык, – пані Перчук садавілася на табурэце ды задумліва ўглядалася ў змрочнае акно. Бо не была яна, як зрэшты і ўсе астатнія ў мястэчку, ні з князёў, ні з графаў, ні з баронаў нават.

– Толькі адзінокім паэтам ствараць вечнае. Адзінокім і галодным, – пабразгваючы лыжкаю аб дно талеркі, канстатаваў Саша. Яшчэ раз здзекліва чвякнуў страўнік, прыпамінаючы, што дарма тут спадзявацца на несмяротнасць пасля заўчаснай смерці, і можна было ісці спаць.

У сакавіку паказалася вясна. Рэчка Лясная, склікаючы да сябе ўсе навакольныя снягі, напружвалася, мацнела, выходзіла з берагоў. Спружынілася, мацнела ды вытыркалася з-пад зямлі новая трава, новае жыццё. І толькі верш Сашы Перчука, верш пра паміранне, ніяк не выдаўжаўся. Мабыць, не знайшлося адпаведнае слова, якое і запыніла ўвесь паэтычны працэс, а, можа таму, што Сашу не падабалася ўжо прадчаснае, а тым болей працяглае паміранне. Зараз было яму да густу сядзець за півам у бары *Лялечка,* глядзець на сцяну або праводзіць літаратурныя дыспуты з другімі кансументамі *дайлідаў*.

– Які ж там творчы настрой, – казаў жонцы позним вечарам, калі ўжо пашчасціла адшукаць

дзверы ў дамашняе прыстанішча. – Я кажу табе, там нават дым з папяросы мае....

Наогул не ўдавалася ўдакладніць, чым асаблівы папяросны дым у бары *Лялечка.* Ногі неяк дастаўлялі гаспадара ў спальню ды выпаўняць сваю функцыю далей выразна адмаўляліся. І пані Перчук, разуваючы іх з запэцканых чаравікаў, шаптала сама сабе:

– Спі, Сашык, спі. Заўтра будзе лепшы дзень.

А заўтрашні дзень пачынаўся бульёнам з курыцы, тонкім, якраз на хваробу, што бярэцца ад празмерна спажытага піва.

– Табе вядомы паэт Кукулка? – пытаў пан Перчук, зазіраючы ў талерку з бульёнам. І зараз адказваў: – Ну як жа, усім ён вядомы. Напісаў *Чорныя лебедзі* ды і шмат яшчэ чаго. А ўсё, паверыш, вылівалася з яго толькі тады, калі добра выпіў. Кожная зваротка, кожны радок, кожнае паасобнае слова. Нат і памёр ён... Ведаеш, як памёр?

Але пані Перчук адказвала маўчаннем. Бо і адкуль было ёй ведаць пра апошнія хвіліны паэта Кукулкі?

– Цудоўна памёр Кукулка. У творчым настроі быў якраз. Узлез на электрычны слуп, казалі – прыкурыць папяросу. А знізу стаялі менш знакамітыя паэты. Вяртайся, крычалі адны. Давай-давай! Вышэй! – юдзілі другія. А ён тых, другіх, якраз і паслухаў. І асіраціў усіх нас.

Аднак у паэта Перчука не атрымоўвалася так, як у паэта Кукулкі. Як ні стараўся, што б ні ўліваў ён у сябе – не вярталася паэтычным словам. А ўзнімацца на электрычны слуп дзеля звычайнай закуркі – саромеўся. У невялікім мястэчку – усе ж усіх ведаюць.

Спадзяванне на новыя творчыя сілы прыйшло раннім летам. Дакладна з таго дня, калі ў бары

*Лялечка* з'явілася новая барменка Лёля. Прыехала – ніхто не ведае адкуль, зусім як у амерыканскім кіно пра каўбояў. Адно яе халодны і сумненькі твар сведчыў пра якуюсьці бяду, мабыць, няшчаснае каханне, што ўяўна астаецца за лініяй далягляду, а папраўдзе ідзе за чалавекам крок у крок, па апошнія ягоныя дні.

Ці не па прычыне гэтага ж смутку закахаўся ў Лёлю Саша Перчук.

Раней былі тут шмат якія барменкі і шмат якія афіцыянткі. І ўсе кропля ў кроплю падобныя – маладыя, дваццацігадовыя дзяўчаты. Учора стаялі ў краме з вопраткай, заўтра лёс закідаў іх за прылавак базарнага ларка з картоплямі і цыбуляй.

А потым, як бы зусім выпадкова, апыналіся ў *Лялечцы*. І выяўлялася гэтая выпадковасць нязграбнымі жэстамі, кавай, вылітай на пінжак кліента, лыжкамі і відэльцамі, раскладзенымі ў парадку, што больш нагадваў хаатычную партызанскую атаку, чым строй, апланаваны дыпламаванымі стратэгамі.

Яны, свядомыя ў сваёй недасканаласці, апраўдваліся за яе сарамлівай усмешкай.

Сашу падабаліся такія ўсмешкі. Было ў гэтых дзяўчат нешта тутэйшае і безабароннае, што дазваляе ўяўляць пэўныя сітуацыі. І гэтыя ўяўленні блізкія рэчаіснаму свету – падбадзёрыўшыся півам, можаш працягнуць руку, дакрануцца да інтрыгуючых акругласцей.

Але ж на мяжы з рэчаіснасцю каханне ніколі не расцвітае яркаю кветкаю.

А ў пані Лёлю Саша Перчук закахаўся адразу. Яе фізіяномія – холад і дасканаласць каменнай структуры. Ідэальныя вочы, вусны, нос, бровы. Нават у пальцах адчувалася дасканаласць аптэчных вагаў, калі тыя пальцы рыхтавалі *крывавую мэры*. Сорак грам гарэлкі *больс*, дзесяць лімоннага соку,

сто дваццаць таматнага. Яшчэ грам солі, шчыпок перцу *табаско*, тры косткі лёду. Гэты лёд вылузвала Лёля не з халадзільніка, а проста з сэрца. Яе вочы ўсміхаліся чыстым блакітам далёкай Арктыкі, яе пальцы мяшалі халодную кроў у халоднай шклянцы. Пальцы, якія ніколі не памыляліся.

Але часам Лёля губляла свой бяздонны смутак.

– А мо паўтарыць разок, а? – падміргвала, згартаючы парожняе шкло.

– З вашай рукі – няхай і атруту, – адміргваў паэт Саша.

Так і здавалася: вось прыйдзе той дзень, безумоўна, сонечны і прыгожы, і ў такую светлую хвіліну, у рэзультаце нешчаслівага кахання ён, Саша, ды яна, Лёля, каўкнуўшы смяротныя цыянкі, спалучацца, каб на век-вечны жыць між анёлаў.

А прычына пачуцця, горкага ды няспоўненага – вядома, у асобе пані Перчук, якая на прапанову развітання з мужам адгукнецца гучным *не!*

Лета тым часам разгаралася. Вышэй праходзіла сонца, выдаўжаліся дні, паспявалі за сонцам і любоўныя крокі Сашы Перчука. З Лёляй разумеліся яны без слоў. Цяпер Лёля не пытала: *а мо паўтарыць разок, а?* Не паспявала шклянка распрануць чырвоную сукенку, як з'яўлялася новая порцыя. Ад яе ўсмешкі і ад *крывавай мэры* траціў Саша цвярозае мысленне. Набліжалася хвіліна, што закладае ў аглоблі ўсе хвіліны. Асабліва тыя, якія наперадзе, у неназванай будучыні, топчуцца з нагі на нагу ў нямым спадзяванні на рашучы штуршок.

Апошні летні адвячорак запыніўся над мястэчкам. Неяк, ніхто не ведае чаму, Сашу давялося раней сысці дадому. Ледзь адкрыў дзверы, ледзь пераступіў парог, ляснуў словам у ціш, насычаную водарам памідоравага супу, смела і рашуча, як смела і рашуча дасканалы хірург джгае лязом скаль-

пеля наспеўшую скулу:

– Закахаўся я. Так залюбіўся, што няма ўжо для мяне – ні туды, ні назад.

Накоплены за лета цяжар зваліўся з душы. Зрабілася бязважка, шчасна, не хацелася нат ступіць на кухню за памідоравай раскошай. Стаяў зараз на хісткіх нагах і толькі рука, заціснутая ў кулак, барабаніла аб грудзі ў тое месца, дзе б’ецца сэрца:

– Тут яно усё. Тут маё шчасце, тут маё каханне, тут... мае...усе вершы...паэмы ўсе...тут, – словы пачалі неяк спатыкацца, аддаляцца. – Я... адыходжу... Заўтра, – паспеў яшчэ прашаптаць.

– Заўтра, Сашык, заўтра, – пацвердзіла жонка. Супольнымі сіламі давалакліся да спальні, дзе паэт Перчук, намацаўшы добра знаёмую мяккасць тапчана, зваліўся і заціх.

Раніцай верхам на белаконнай імгле з’ехала ў мястэчка восень. Саша Перчук стаяў у акне, глядзеў на пасівелыя блокі, на жоўты бярозавы лісток, які прышпіліла да шыбы начная сырасць. Ісці яму нікуды не хацелася. Ні ад жонкі, ні нават у бар *Лялечка*. Хіба што – *туды, куды самі не даедзем, туды, куды павязуць нас....*

# Клаксон

1.

Калі ў чалавека аргазм, ён гатоў разгарнуць неба і нырнуць у прадбачаную адно анёлам раку забыцця або, выракаючыся сябе, пайсці светлымі райскімі сцежкамі. Абы-куды, абы далей ад цялеснай абалонкі.

Вітусю Агоньчыку якраз нікуды не хацелася. У яго не было жадання ступаць ні за, ні супраць чаго-небудзь. І не было жадання адмаўляцца ад сябе. Расплюшчыўшы вочы, ён ляжаў дагары жыватом. Ляжаў побач з Кавалёвай Лількай і дарэшты прызнаваўся ва ўласнай тоеснасці: ён, Вітусь Агоньчык, пяцідзесяты год нараджэння, жанаты, раней на дзяржаўнай пасадзе, зараз – гаспадар сам сабе і чатыром спажывецкім крамам. А Лілька – год нараджэння семдзесят сёмы. Другі тыдзень стаіць за прылаўкам у *Мамуазэль*. Дакладна – з дня, калі жонка пана Вітуся адправілася ў водпуск на цёплае мора. Раней гэтае месца займала яна. А цяпер Лілька ўсміхаецца кліентам, расхвальвае прадукты, а калі ўзлазіць на раскладныя драбіны ды працягвае рукі да самай высокай паліцы, усе вочы сыходзяцца на яе кароценькай сукенцы. І ва ўсіх, хто сочыць за гэтай нескладанай мануальнай аперацыяй, ёсць адно-адзінае жаданне: хай былі б у драбінаў не тры, а хоць бы і сто дваццаць тры прыступкі, і хай пра-

даўшчыца Лілька ўзлазіла б высока, на самае неба.

А зараз Лілька ляжыць побач з Вітусем Агоньчыкам у ягонай аўтамашыне. Машына – метраў дзвесце за каталіцкімі могілкамі. Светлым днём гэтае месца шмат хто наведвае. Бо і як не наведаць. Ступіш крокаў дваццаць ад белавежскай шашы і ўжо агортвае цябе пушчанскі спакой. Яшчэ крокаў дваццаць, яшчэ і выходзіш на зялёную паляну. Раней была тут футбольная пляцоўка ды і зараз падлеткі час ад часу забіваюць мяч у прыімшэлыя вароты. А побач з сабачкамі шпацыруюць панюсі, споўдаюць памежжам святла і ценю саноўныя пенсіянеры. Паглыбляюцца і далей, у духмяныя хмызнякі, дзе ў сонечныя майскія дні ліцэісты і ліцэісткі частуюцца танным віном або салодкім, ліпкім лікёрам. Бывае, у выніку віна-лікёрнай кансумпцыі тая ці другая паненка застыне на імху пад ляшчынай і калі ты не ў дзіравым карабе радзіўся, можаш пазіраць, як руплівая мурашка, пачынаючы з лакіраванага боціка, перадольвае напружаную далеч лыткі, абмацвае закругленасць калена, апынуўшыся на спацелай плошчы сцёгнаў, паўзе направа і налева, аж, дэзарыентаваная навіной краявіду, знікае ў цяністым прыстрэшку сукенкі. Вось чаму, пачуўшы маладыя галасы, той-сёй дзядок, выдаўжае ў іх напрамку свае крокі.

Але зараз тут пуста і ціха. Па-над пушчай, над лясным стадыёнам стаіць чэрвеньская ноч. Раззоранае неба абапіраецца на дубовыя каланады, і вось хвілінай раней з гэтага неба Вітусь Агоньчык апусціўся знічкай на плоскі, напружаны жывот Кавалёвай Лількі. А чвэрць гадзіны раней Лілька сказала:

– Я не хачу так.

– Як – так? – не зразумеў Вітусь Агоньчык, бо і

забрыў якраз у пункт, з якога няшмат што бачыцца ды разумеецца.

– А вось так, нагалыша. Нацягніце кандом, – сказала і засмяялася. Зразумела раптам недарэчнасць сітуацыі: зараз атрымаецца ў іх блізкасць самая блізкая, а яна да яго звяртаецца на *вы*. – Бо ведаеш, я ніколі яшчэ....

– Што, ніколі? – рука, якая сціскала Лільчыны трусікі і даязджала якраз да каленяў, спынілася.

– Я ніколі яшчэ без рызіны, – прашаптаў у вуха засаромлены голас. – Разумееш? Баюся.

– Э-э там! – было хіба спадзяванне на штосьці другое, ці не на абсалютную цнатліваць, бо і рука, знерваваная залішнім перапынкам, спрацавала жвавей. – Што тут баяцца. Усё як трэба будзе.

– Але ці напэўна? – недавер'е, якое адчувалася ў голасе, неяк спрачалася з дзеяннямі астатніх органаў. Калені гойснулі амаль да падбародка, добраахвотна пазбываючыся карункавай абалонкі.

У той момант у Вітуся ўдарыў пярун. Вядома, не фізічна-атмасферычны, бо і неба стаяла над лесам чыстае ды зорнае. Быў гэта абсалютна ўнутраны пярун, які нараджаецца ў чорных хмарах падсвядомасці, агортвае вантробы клубамі агню, спапяляе ўсё наваколле, аж на пажарышчы астаецца адна-адзінокая, узведзеная ў неба, абсмаленая дубовая кукса. У гэты ж момант пярун дасягнуў таксама ж і Лількі. Патрапіў дакладна, і дзяўчына, быццам ашарашаная мільёнам вольтаў, жыватом кінулася наперад, яе ногі напружыліся, расцягнуліся, закружылі млынком, быццам на веласіпедзе ехалі. І раптам левая пята, пакаўзнуўшыся на шыбіне, прызямлілася. Якраз на чорную спіну клаксона. Тэхніка, для яе выпадковасць ці памылка не маюць ніякага значэння, адазвалася.

Светлым днём, у цэнтры горада, мабыць, ніхто

не звяртае ўвагі на такія акустычныя сігналы. Зараз жа, пасярэдзіне лесу і ночы, клаксон азваўся галасам сотні зуброў, тысячы аленяў, раз'юшаных барацьбой за прыхільнасць самкі. Гэты рык спутаў, спаралізаваў Вітусю Агоньчыку ўсе мускулы. І Вітусь апусціўся знічкай на напружаны жывот Кавалёвай Лількі. І знерухомеў. І, як спяваецца ў песні, стала ціха-ціха па усёй зямлі. І ў такую найцішэйшую цішыню Лілька спытала:

– Ужо?

Вітусь не адказаў. Ён кульнуў у бок і памаленьку пачаў прыходзіць да прытомнасці. Пытанне паўтарылася, але цяпер у дзявочым голасе адчуваўся спалоханы, амаль адчайны тэмбр:

– У-жо-о? Чуеш ты, ці не чуеш? Ужо?

У асаблівых сітуацыях так пастаўленае пытанне мужчыне не ў гонар. Бо  як жа словам дапоўніць тое, што ў добра скамплектаваным калектыве адчуваецца без ніякіх слоў?

– У мяне, значыць,  будзе дзіця. У нас будзе дзіця, – сказала Лілька. – Разумееш ты? Ты разумееш, што нарабіў?

Ён не разумеў. Не зусім яшчэ прытомны, ён стараўся адлюстраваць у думках падзеі апошняй хвіліны. Не атрымоўвалася. Усё, што неяк вярталася на памяць – пранізлівы гудок клаксона. Так ён і сказаў:

– Я нарабіў? Я? А трэба было пятамі ў клаксон барабаніць?!

– Такое малое-маленькае, – не звяртаючы ўвагі на сказанае Вітусём, хіба і не яму, а сабе гаварыла яна. – Такое во, – развяла пальцы на сантыметры два, а затым прыклала іх да жывата, быццам бы стараючыся ўлавіць той момант, з якога пачынаецца новае жыццё. – Наша дзіця. Тваё. Не ўцячэш жа, не адмовішся хіба ад свайго....

У Вітуся не было жадання ні ўцякаць, ні адмаўляцца ад чаго-небудзь. Расплюшчыўшы вочы, ён ляжаў дагары жыватом. І думаў. Пра бліжэйшую будучыню. Перш за ўсё – як аб'явіць такую навіну жонцы. Што ёй сказаць? І як сказаць? З жонкай, хаця і пражылі разам гадоў трыццаць, ніколі такога не было. Ніколі, нат пасля самай блізкай блізкасці, не сказала яна Вітусю: у нас будзе дзіця. І яго не было.

А затым у разгубленасці, непазбежнай у новай сітуацыі, пачаў вылузвацца дзіўны мужчынскі гонар, упэўненасць у сваёй выключнасці, несмяротнасці амаль. „Як ўсё нескладана. Не было дзяцей, адна хвіліна – і ёсць яны. Маё жыццё пяройме мой сын", – падумаў. І тут жа захваляваўся: „Сын? Адкуль жа ведаць. А, можа, дачка?" І зноў спалохаўся: „Як жа – дзіця?

– Што цяпер будзе? – апранаючыся спытала Лілька.

Вітусь не адказаў. Ён не ведаў.

2.

Кажуць, усходам сонца пачынаецца новы дзень. І яшчэ кукарэканнем пеўняў. Такія меркаванні грунтуюцца на стандартах далёкай мінуўшчыны, калі свет пераліваўся з хвіліны ў хвіліну кроплямі ранішняй або вечаровай імглы і калі чалавек слухмяна хадзіў наўкол сонечнага манежа, закладзены ў ягоны дышаль.

За нашым часам дзверы ў новыя дні раскрываюцца спажывецкімі крамамі. Ігнаруюць гэтыя крамы і сонечны гадзіннік, і кукарэканне пеўняў, і ранішнюю расу. Страўнік бесцырымонна вытурвае чалавека на вуліцу. „Ідзі, – кажа. – Есці хачу". І чалавек не дыскутуе са страўнікам. Ідзе ў

*Мамуазэль.*

А ўласнікі такіх крамаў падымаюцца на ногі раней за ўсіх астатніх. А можа, хто іх ведае, бы які біялагічны варыянт *perpetum mobile*, функцыянуюць бесперапынна і кругласутачна?

Яркае сонца ўзвялося на трэці паверх летняга неба, а Вітусь Агоньчык усё яшчэ ляжаў пад коўдрай. Ён не спаў. Заплюшчыць вочы не дазваляў гадамі настаўлены біялагічны гадзіннік. А таксама і думкі, што натоўпам гуртаваліся ў галаве, гаманлівым разнагалоссем спрачаліся кожная за сваю рацыю. Прыходзіла на памяць крама і Вітусю рабілася сорамна. Зараз, пэўна, там чарга кліентаў, а на паліцах дзяжураць учарашні хлеб і ўчарашняе малако. І за неахайнасць гаспадара апраўдваецца перад кліентамі прадаўшчыца Лілька.

Лілька. Прыходзіла на думку яе імя, і Вітуся агортваў раптоўны сполах, бо за Лількай ішло чарговае слова – дзіця. Прыпаўзала ракам, разгартала ружовенькія ручкі, з-за абсліненай соскі ўсміхаліся кругленькія губкі. Соска выплёўвалася кароценькім словам: тата.

Ад слова “тата” ўскалыхнулася, напоўнілася насалодай сэрца. Ён амаль і прызабыў гэтае слова, згубіў спадзяванні на яго. А тут – вось і на табе. Зараз ракам яно прыпаўзае, а не заўважыш, калі ўзвядзецца на ногі, прыбяжыць, застукае ў дзверы, закіне ручкі за тваю шыю, маленькая шчака прытуліцца да вялікай. Затым пойдзе гэтае слова ў школу і будзеш цешыцца кожнай пяцёркай, кожным, хай сабе і самым дурненькім, вершыкам, вывучаным на памяць. Аж у які прыгожы дзень прыйдзе ў дом – пад ручкі з такім жа, як ён, словам, толькі другога полу. І разам адтэрмінуюць тваё небыццё на яшчэ адно пакаленне.

А потым Вітусю прыйшоў на памяць Грыша

Грынь, што жыве па-суседску і ў якога за дзве вуліцы ўбок прыдбалася дзіця ад аднае грудастай панюсі. Хлопчык часам забягае на іхнюю вуліцу і, напаткаўшы Грышу, кліча яго – тата. Але гэтае кліканне Грышу Грыню не падабаецца. Каштуе яно трыста злотых у месяц. Няшмат, бо як сказалі ў судзе – браць больш за палову зарплаты негуманна.

"А калі і Лілька захоча палову? Значыць, дзве крамы? Можа нават *Мамуазэль*?" – Гэтая думка яшчэ глыбей забіла Вітуся пад коўдру. Заплюшчыў вочы, прытаіў дыханне. Дарма. З абсалютнай цемры, літара за літарай вытыркаўся зялёны неон: *МАМУАЗЭЛЬ*. І крышку ніжэй: "Уласнік – Кавалёва Лілька".

"Не, не можа быць. Лілька не такая. Не ад карыслівасці ўчора там, у лесе за могілкамі", – вярнуліся на памяць абразкі ад апошняй ночы, і ў цемры пад коўдрай Вітусь усміхнуўся сам сабе. "Можа нават кахае мяне Лілька? Яна такая прыгожая і такая сумленная". – Згарнуў коўдру з галавы, зірнуў на свет. Сонца пераступала чарговы паверх неба, а на Вітуся зваліўся наступны спалох. "Там, у краме натоўп злых кліентаў, бедная Лілька, апраўдваецца, узлазіць на расстаўныя драбіны, сарамліва ўсміхаецца... Менавіта. На якую халеру ўсміхацца чужым мужыкам? І сукенка – кароценькая такая. Магла ж бы апрануць якія нагавіцы або што... Прыстойныя дзяўчаты не гойсаюць па драбінах у такіх сукенках. Нават тая грудастая прыгажуня Грышы Грыня – хто калі бачыў яе на драбінах? А не такая яна ўжо і прыстойная – за яе ж "дзецяробам" клічуць Грышу ў мястэчку".

"Дзецяроб. Значыць – што? Ніхто зараз не скажа: Я купіў сыр у Агоньчыка? Або: Іду за півам у *Мамуазэль*? Схадзі за хлебам да дзецяроба – так, мабыць, зараз выправіць мужа за пакупкамі якая

жонка?” І Вітусь чарговы раз нырнуў пад коўдру.

“А Лілька, – яна такая прыгожая і такая сумленная. Калі хто спытае: Дзе ж ты зараз працуеш, Лілька? Што ёй астаецца? У дзецяроба за прылаўкам я працую – адказаць? А сваім шляхам – ад сумленнасці да несумленнасці адзін крок. Была ж нястача ў касе на мінулым тыдні. Праўда, за руку ніхто нікога не злавіў. Але ж – стаяла за прылаўкам жонка і ніякай нястачы не было. Жонка. Заўтра пятніца, а ў суботу вяртаецца яна”.

Цёплая, як ніколі раней, хваля агарнула Вітуся. Знаёмыя вочы, знаёмая ўсмешка. У суботу пасля поўдня ён сядзе ў машыну, паедзе на вакзал. Будзе спяшацца, каб да прыезду цягніка знайсці добрае месца на пероне. І калі з грукатам вагоны зойдуць на станцыю, пакуль спыняцца між піронаў, праз адкрытае акно яна памахае рукой. А ён, як заўсёды, радасна адмахне. Прыхапіўшы багаж, пойдзе перонамі. Яна будзе ісці побач, а ён тады скажа: – Ведаеш? Гэта прадаўшчыца, што ты да ад’езду вынайшла яе... А, дарма і казаць што.

– Зноў нястача ў касе? – як заўжды спытае жонка і смутна ўсміхнецца. – Зараз не трэба давяраць маладым.

– Ой, не трэба, – адкажа Вітусь у суботу пасля поўдня. Але цяпер ён ляжыць пад коўдрай і думае.

# Сустрэча

1.

Здараецца такое асабліва ў час цвіцення яблыняў і вішняў, калі чалавек, адурманены белым і ружовым кветам, не змяшчаецца ў свой звычаёвы касцюм, не згаджаецца сам з сабою. І шукае зусім лішняе ў сваім штодзённым свеце. Тое шукае, што не ўпісваецца ні ў простыя фізічныя правілы, ні ў матэматычныя формулы. Паэтам мроіцца абсалютнае шчасце, філосафам – воля, палітычным шаленцам – справядлівасць. А звычайныя людзі шукаюць знешнюю красу. Жанчыны забіваюцца ў новыя сукні, у свежыя прычоскі, у яркія грымы, у какетлівыя ўсмешкі. Прыгажэюць.

А мужчыны горда выпінаюць грудзі, пружыняцца мускуламі, а ў думках новыя жанчыны выштурхоўваюць за далягляд вачэй жанчын ранейшых, што абселі гэтыя месцы з наіўным перакананнем у сваёй выключнасці.

Папаўднёвай гадзінай апынуўся пан Носік перад дзвярыма пад'езда, знаёмага, шэрага і гэтак абдзёртага з алейнай фарбы, як шэрай і абшастанай з мрояў была ў апошні час яго мужчынская экзістэнцыя. У акацыях шчабяталі птушкі, кветкі падміргвалі майскаму сонейку, дзень увогуле прэзентаваў сябе быццам з турыстычнага праспекта.

А на трэцім паверсе чакала пані Носічка, прыд-

баная за жонку даўным-даўно таму назад, у выніку палымянага і, як наогул у маладосці бывае, зусім неабмеркаванага пачуцця.

І зараз тырчаў пан Носік перад дашчэнту знаёмым блокам і сумна ўсміхаўся. Не тут пана Носіка месца. Не тут. І, мабыць, адно рэзультатам незразумелай касмічнай катастрофы запаўняе ён гэты, а не іншы фрагмент прасторы.

Ён урэшце адчыніў дзверы. І натрапіў на незвычайную з'яву. Трыццацігадовую, высокага росту, тонкую, зафіксаваную зверху навальніцай фіялетава-чорных кудзераў. З'ява апранута была ў летнюю сукенку, даўжынёю больш-менш у палову сцягна. Калі, аднак, названы цуд краўцоўства разглядаеш з вертыкальна-касой перспектывы лесвіцы, прапорцыі між закрытымі і незакрытымі раёнамі перасоўваюцца якраз у карысць раёнаў, пазбаўленых вопраткі.

Нам, абыякавым да тайных сеансаў душы, пазбаўленым лішняга красамоўства – што астаецца? Астаецца падтрымаць прымітыўную мазню вачэй: пані Зіна сходзіць па лесвіцы. Так успрымаюць свет нашыя зрокавыя інструменты. А калі б, скажам, не пан Носік стаяў тут, а пан Сандро Батычэллі? О, так! Тады зусім іншая іншасць. Тады б не ступала пані Зіна празаічна, лесвіцай. Была б яна вылузана з залатой ракавіны, і з шэпту марской хвалі, і з анёльскай музыкі. А калі б, выпадкова, прыплёўся сюды ў гэты момант пан Рэмбрант, пранікнуў бы ў ласку каханай Данаі залатым дажджом, што ідзе з неапісанай светласці.

– У вас прыгожыя ногі, вельмі стараньліва выкананыя, – азваўся пан Носік, бо не быў ён тым Рэмбрантам, які хітрасцю і нахабнасцю ўладкоўваецца ў белагаловыя сны.

– Дзякую. Вы вельмі мне ласкавы, – адказала пані Зіна. І ўсміхнулася смуткам Джаконды, што свед-

чыць магло пра вялікую самоту яе бяздоннага нутра.

– Ёсць яшчэ шчаслівыя людзі, – уздыхнуў пан Носік. Месца атрымалася зручным для назіральнага працэсу, і ён не адыходзіў ад дзвярэй. І пані Зіна прыкмеціла зацікаўленне. З належнай жанчынам сціпласцю спрабавала выдаўжыць сукенку. Дарэмна, бо, як агульнавядома, законы фізікі грудзьмі стаяць за справу расцяжнасці тэкстыльнай матэрыі. І пані Зіна паўтарылася сарамлівай усмешкай Джаконды.

– Шчаслівыя людзі?

– Далёка і не шукаць, – упэўнена падтрымаў пан Носік. – Вось, скажам, ваш муж.

– Ах, муж-муж, – сарамлівасць пераўтварылася ў здзіўленне. – Працуе адно і працуе. А я зусім адзінокая. Тэлевізар, кніжка. Кніжка, тэлевізар.

– Прыгожая дама не можа быць адзінокай, – голасам, спавіваючым у цёмны шоўк меланхоліі, прашаптаў пан Носік. Утоптваў пры тым акурак папяросы ў зацухмолены горб лесвіцы.

– Быццам бы і так, – згадзілася пані Зіна. – У нармальным свеце за дамай ступае натоўп паклоннікаў, рыцараў. У нармальным свеце. А тут? – паехала позіркам па закураных сценах. – Тут не-э! Тут можна быць толькі нешчаслівай жанчынай.

– Та-ак. Тут усё не так. Дзе ні глянь, правін-цыя, – працягваючы настрой, уздыхнуў і пан Носік. А на душы – пасвятлела. Вось, аказваецца, не адзін ты ў няшчасці, ёсць і ў цябе таварышы.

– А можа, – пачала і спынілася. Яшчэ раз цаля за цаляй сумнымі карымі вачыма абмацала забуксаваную каля падножжа лесвіцы постаць. – А можа вы будзеце маім рыцарам? Або, прынамсі, сакрэтным адаратарам?

– А чаму ж не? Буду! – амаль не закрычаў ад радасці пан Носік. Неяк паўстрымаўся: падобныя ж

прапановы не ляжаць навалам на мястэчковых тратуарах. “Тут і адказ трэба даць высокамоўны”, – падумалася пану Носіку, а ў разумовых рэсурсах ішлі пошукі слоў. Вялікіх і прыгожых. Слоў важкіх, бы валун, і адначасова далікатнейшых за подых майскага неспакою. Аднак у Носікавых арсеналах не знайшліся такія дзіўныя, ці не алхімічныя структуры. І ён сумна заціх.

– Ну як? – пані Зіна ступіла адзін крок уніз, затым другі і трэці. Раскошлівы далягляд скараціўся да мала цікавай перспектывы.

Тым часам лесвіца дыхнула пахам варанай капусты. У кампазіцыі кмену, маярану, ангельскага перцу апазнаў пан Носік кулінарнае ўмельства сваёй жонкі.

– Я буду вашым рыцарам. Я абараню вас ад дрэнных людзей і злога свету, – пакланіўся прыгожа ён і, падбадзёраны жылістым кулаком страўніка, шмыгнуў на спатканне са штодзённай, па-правінцыянальнаму зямной раскошай.

## 2.

Першы летні дзень у Носікавай кніжцы жыцця, тоўстай і нуднай як пазітывістычны раман, раскрыўся цалкам новым абзацам. Ён шыбаваў на спатканне з Зінай. Затрымліваўся перад вітрынамі, абыходзіў кіёскі, збаўляў крок, то зноў нечакана набіраў хуткасці.

Ёсць хвіліны, калі свет ападае на тваё плячо каляровай птушкай. І зазірае табе ў вочы, і чырыкае, і манернічае, а калі падстаўляеш далонь, садовіцца на ёй і слухмяна збірае нябачныя крошкі з тваёй рукі. І нават мястэчка, у іншыя дні – быццам старая дзеўка – засохлае і прагорклае, зараз вітае

цябе ветлівай усмешкай. Дзень добры! – гранітным капялюшом кланяецца банк, які ўчора пад пагрозай секвестратара дамагаўся вярнуць напампаваны адсоткамі крэдыт. Прывітанне, браток! – падміргвае курдупляваты магістрат, хаця ніколі раней не адазваўся да цябе іначай, як *обывател*ю*, вы абавязаны....*

З такіх хвілінаў пачынаецца новае жыццё. Пан Носік шыбаваў зараз у мястэчковы парк на спатканне з Зінай і новым жыццём.

Убачыў яе здалёку. Квяцістая сукенка на фоне пабляклай лавачкі паказалася райскай птушкай. І пану Носіку стала прыемна. Ён прысеў на крайняй лавачцы і глядзеў. Там, на сто крокаў далей, бачыш прыгожую жанчыну. Яна чакае. Побач праходзяць людзі. Мужчыны, хто крадком, а хто і адкрыта, спаглядаюць на яе, прыпыняюць крок. Мо нат і абмяркоўваюць, якія эквілібрыстычныя канфігурацыі былі б яны ўзмозе вырабіць з гэтай во паняй, калі б здарылася адпаведная нагода. А яна абыякава гартае кніжку. І ты, адзін на ўвесь свет, ведаеш аб’ект яе чакання. Таму пану Носіку было прыемна сядзець і сачыць за паняй Зінай. Было таксама жаданне падняцца, падысці бліжэй, пацiснуць яе рукі. Хто ведае, мо нават пад парасонам летняга прыцемку, вуснамі крануць яе вусны. А людзі – ідуць і ідуць, і шмат хто знаёмы. І згодна, здаецца, трымаюць вока на асобе пана Носіка, гатовыя кінуцца з усіх бакоў, калі толькі пераступіць ён нябачную, назначаную мястэчкам мяжу прыстойнасці. “А калі трэба, няма чалавека”, – падумаў пан Носік. І ад незаслужанай крыўды, прыкурыў. А затым – другую папяросу ад першай, трэцюю ад другой. Закругляючы вусны, пускаў дым зручнымі абаранкамі. Далікатны летні вецер псаваў іх, развейваў. Здавалася, усё зараз разыдзецца з вет-

рам – парк, летняе папоўдне, пані Зіна. Думка, што менавіта яна можа зараз ператварыцца ў чысты прывід, халоднай іголкай забілася ў грудзі. І пан Носік узняўся на ногі. Ступіў, глянуў, спыніўся. Побач з Зінай прысела нейкая постаць. З перспектывы ста крокаў цалкам падобная на цётку Варвару, якая на тое і жыве, каб ніякая мястэчковая таямніца не змушалася занадта доўга аставацца ў самоце і забыцці. А вось з перспектывы гадоў, заглядаючы ў далёкую і блізкую мінуўшчыну, можна даць другі адказ. Калі следам тваім крочыць нейкая ўсюдыісная, фатальная сіла, будзь упэўнены: во яна – і тут, і зараз. З'яўляецца невядома адкуль і адно для канспірацыі прыкідваецца цёткі Варварынай абалонкай. З'яўляецца, каб зруйнаваць усе твае, Носік, планы. Няважна – на вадзе ці ў камені запісаныя. І пана Носіка ўскалыхнула злосць. Эх ты, доля ! Эх ты, мястэчка! Яму захацелася раптам разбурыць увесь той парк, дашчэнту, да апошняга дрэва, да апошняй сцежкі, да апошняй травінкі. І горад – хай ад яго не астанецца каменя на камяні, ні след людскі, ні слова, ні думка нават. Заціснуўшы зубы, як чалавек, якому ўсё адно – зараз ці праз сто гадоў паміраць – пайшоў пан Носік наўкола лавачкі. Адзін круг завінуў, другі, трэці і чарговы. Аж закружылася ў галаве. Спыніўся. Кінуўшы вокам направа і налева, упэўнены, што ніхто не сочыць за ягонымі змаганнямі за перамену лёсу, прыцэліўся і ўрэзаў выспятка ў зялёную парэнчу. – А на табе, праклятая! – І канчаткова ўжо прыніжаючы ворага, сплюнуў. І змораны барацьбой, пасадзіў сябе якраз у апаганенае месца. Задумаўся. Ад чэрвеньскай цеплыні злосць расслабілася, размякла, цёплым воскам паплыла ў ногі. Пан Носік падставіў твар летняму сонцу, за-

плюшчыў вочы. Доўгай, зялёна-блакітнай сцежкай, што пабегла пад павекамі, накіраваўся ў напрамку квяцістай сукенкі. Разлажыўшы на вецер нябачныя крылы, ён закружыў ці то пярэстым воблакам, ці мо бязважкім матылём, а мо толькі неслухмяным бярозавым лістком, які, не чакаючы лістападу, дае веры абяцанкам бяздоннай прасторы. Яшчэ хвіліна і ападзе побач з лавачкай.

– Ну, я ўжо тут, – прывітаецца.

– Ах, ужо тут, – ледзь заўважальнай усмешкай аб'явіцца Джаконда і працягне на прывітанне ру-ку. – Прагуляемся?

– Прагуляемся, чаму не, – адкажа пан Носік.

– Можа да *Белай ружы*? Або – у *Алімп,* – запрапануе яна, усміхнецца ветліва.

– З вамі – нават на другі край свету, – адкажа пан Носік. І зараз два воблакі, два матылі, два лісткі бярозавыя пабягуць па зялёна-блакітнай сцежцы.

Калі б у нашым мястэчку, нягледзячы на малады яго ўзрост, паспеў нарадзіцца, пасталець ды падняцца на неба сапраўдны паэт, то разглядаючы панараму з-па-над бярозавых вяршыняў, праўдападобна сказаў бы так: вось двое людзей, што ідуць на спатканне з няўхільным лёсам. Прыгожыя, светлыя і саноўныя, як прыгожым, светлым і саноўным бывае чалавек, калі ў ягоных руках – шчасце. Аднак у гэты момант адзінае, што займала рукі пана Носіка, быў пагаслы акурак. Апошні ад распячатанай раніцай дваццаткі. І нашаму чалавеку, дзесь там, на анёльскіх літаратурных нівах, заставалася, як і заўсёды, адкласці чарговую скібу пра любоў да роднай зямлі на пазней.

# Ветэраны

Гэтыя мужчыны даўно ўжо вызваліліся з жалезных абдымкаў часу, цяжкіх яго ланцугоў, што звязваюць чалавека з канкрэтным месцам, канкрэтнымі абавязкамі. Маглі б яны без залішніх цырымоній пазбыцца сваіх календароў і гадзіннікаў, аддаць іх у які музей або звычайна абдарыць унукаў для гульні. І не пацярпеў бы ад гэтага свет. Так ці іначай ён выконваў бы свае справы своечасова і паспяхова.

Але яны ўсё яшчэ ішлі плячо ў плячо з календарамі і гадзіннікамі. Кожную першую суботу месяца дакладна а васемнаццатай гадзіне пераступалі парог рэстаранчыка.

Заходзілі камплектам або паасобна, але наогул у прызначаны час усе пяць фігур займалі месцы за сталом. Прасілі гарбату. Разгортвалі газеты. Глядзелі адзін другому ў вочы, параўноўваючы запісаныя ў памяці вобразы з замалёўкамі бягучай хвіліны.

Гэта былі звычайныя мужчыны. Па іх біяграфіях не здымалася кіно, не пісаліся гераічныя аповеды, не складаліся школьныя падручнікі. А калі нат і пісаліся якія гісторыі, дык не фантазійнымі, выкручастымі літарамі, а дробным макам штодзённых мазалёў. Чыгуначнік на пенсіі Іван Пракопавіч. Селянін Віктар Сцяпанавіч, што больш дзесяці гадоў таму як аддаў наймалодшаму сыну лейцы і з'ехаў у мястэчка, дзе прытуліўся да нейкай удавы.

Максім Карпавіч і Пётр Паўлавіч адпрацавалі жыццё на мясцовай фабрыцы.

Мэту гэтых сустрэч дарма замыкаць у рамкі якое-колечы логікі. Не вырашаліся тут справы ні сённяшняга дня, ні будучыні. Не прымаліся ніякія пастановы ці рашэнні. Ніхто не назіраў за ходам падзеяў, нат так сабе, без прычыны, каб праз дзесяць-дваццаць год, прыгарнуўшы да грудзей унука, прашаптаць у ягонае вуха банальнае: "Я бачыў".

Мабыць, склікала іх у гэтае месца своеасаблівая дэманстрацыя – доказ прысутнасці, існавання, перамогі над чарговым днём.

Часам нехта спазняўся і яны моцна ў такіх выпадках хваляваліся.

"А дзе Пётр Паўлавіч?" Або: "А дзе Віктар Сцяпанавіч?" – неспакойным голасам самы старэйшы выклікаў непрысутную асобу. – Бачыў хто сёння Віктара?

– Я бачыў. Учора раніцай у малочнай краме. Усё нармальна, жывы ён, – чыйсьці голас супакойваў астатніх.

І яны сядалі за стол. Але неспакой не адступаў далей як на крокі два, таптаўся за спіною, прысаджваўся на парожняе крэсла. Нават калі і не гаварылася пра тое ўголас, яны дасканала ведалі цану аднаго дня, разумелі, што кожная хвіліна павышае яе, падвойвае, патройвае, аж у рэшце рэшт заўтрашні дзень пераўтвараецца ў тавар не на чалавечую кішэню.

Афіцыянтка махала на стол шклянкі з гарбатай, папёлку, абдорвала іх ветлівай усмешкай і, хвалюючы бязмежнымі клубамі, плыла на сваю службовую прыстань. Гартаючы каляровы часопіс, час ад часу абмацвала іх службова чуйнымі зрэнкамі, а яны сачылі за яе чорным, бліскучым боцікам, што машынальна гойсаўся на назе, закінутай на другую

нагу.

– Эх, зоранька, – Іван Пракопавіч папраўляў гальштук, штурхаў наперад грудзі, а жывот і сам здагадваўся, што не ён першачарговы тут герой ды ўпотайкі адступаў у ёмістыя абдымкі пінжака.

– Гэ-гэ, загуляў бы, а? – падміргваў Максім Карпавіч і ад такіх слоў Пракопавіч напаўняўся асалодай. – Ну, табе што? Малады ж яшчэ. Сярун.

Дэкларацыі ў адрас жаночага полу не ўспрымаліся сур’ёзна. Яны ўваходзілі ў той этап жыцця, калі без крыўды для гонару мужчынам дазваляецца жартаваць або і здзекавацца над сваёй недасканаласцю. Бо і яна, цяперашняя няспраўнасць, як доказ, як рэзультат ранейшай мужнасці. Балючая ўсё-такі ўзнагарода за перамогі маладосці.

Але нешта хлапечае астаецца ў мужчын да апошніх іх дзён. Няўлоўнае, неназванае адгукаецца рэхам у застольных размовах, прыхоўваецца між слоў, апранаецца ў шматзначныя ўсмешкі.

– Я, у шэсцьдзесят, о-го, – абводзіў позіркам афіцыянтку Максім Карпавіч. І, прыкідваючыся смутным, уздыхаў. – Божа ж ты мой! Забраў сілы, вазьмі і ахвоту.

Такі цырыманіял паўтараўся кожны месяц. Мяняліся адно сцежкі гэтых, па-хлапечаму канспірацыйных, па-хлапечаму недалёкіх ад бацькоўскай хаты, эскападаў. Адзін раз кіраваліся яны на афіцыянтку, а другім разам бралі напрамак на зусім выпадковую паненку, што прытулілася якраз да суседняга століка.

Але маладыя паненкі натоўпам сюды не заходзілі. Рэстаранчык быў з другой, прызабытай цяпер палоскі часу. У далёкай мінуўшчыне – можна дадумацца – разгарнуў нехта на сталах цыратавыя загончыкі, абсеяў іх алюмініевымі лыжкамі і відэльцамі, там-сям уваткнуў хісткае драўлянае крэсла. А

затым, не чакаючы жніва, з’ехаў у другую краіну або ў вечнасць. А можа невыпадкова, можа з думкай аб такіх якраз кліентах чыясьці міласэрная рука вывела гэты куточак з гаманлівай сучаснай прасторы?

– Каму забраў, а каму і не, – на нараканні Карпавіча адгукаўся таямнічай усмешкай Віктар Сцяпанавіч. – Мне таксама семдзесят пяць. А пакуль яшчэ мая Маня не наракае.

Паўслоўцамі, зразумелымі толькі мужчынам, называліся прыемнасці, якія можа мецьмястэчковая ўдава ад кансерваванага сонцам, дажджом і ветрам вясковага хлопца.

Але наогул Сцяпанавіч не паспяваў падзяліцца з сябрамі гэтай радасцю, што час ад часу выпадае на долю ягонай Мані. Гутарка пераходзіла на зусім другія рэйкі. Пётр Паўлавіч выгартаў з кішэні пінжака насавую хустачку, збіраў пот, што бліскучымі жамчужынамі гуртаваўся на кончыку носа – ад гарачай гарбаты, а мо ад якога жахлівага ўспаміну.

– А я ўчора ўпаў, – заяўляў сумным голасам.

– Як, упаў? Дзе? – хваляваліся астатнія. Але хваляванні былі павярхоўныя і тут жа знікалі. – Калі ты тут, значыць, падняўся, нічога страшнага не адбылося.

– Нармальна, на вуліцы. Ішоў і зваліўся. Цяжкое штосьці села на грудзі, потым свінцовым холадам пералілося на плечы і ў ногі. А потым сцямнела ў вачах і я страціў прытомнасць. А калі разбудзіўся, нейкія маладыя людзі акружалі мяне шчыльным вяночкам. На фоне чыстага неба я бачыў іхнія галовы і чуў іхнія галасы. І яны разважалі: п’яны ці хворы я. А я ж і ў рот не бяру. З маім сэрцам, самі ведаеце, было б самагубства.

– Нічога не разумеюць маладыя, нічога не ведаюць, – горка ўсміхаўся Іван Пракопавіч.

– А ў мяне грыжа, – адзываўся Віктар Сцяпанавіч. – Такая, во, –  згартаў далоні ў кшталт футбольнага мячыка. – Усе тыя мяшэчкі картопляў і жыта, што вамі, гарадскімі скарміліся, зараз і выбіраюцца на белы свет. Аперацыя неадкладная. Сам не знаю – лепш паміраць пад нажом  ці ўсё-такі ў сваім ложку?

Грыжу Віктара Сцяпанавіча дасканала ведалі. Тут яна нараджалася, пачыналася з маленькага гарохавага зярнятка, надзімалася ў тэнісны шарык, аж зараз дасягнула памераў футбольнага мяча. Карыстаючыся правамі, належнымі поўнацэнным удзельнікам застолля, уключалася ў размову ў любы момант, не чакаючы сваёй чаргі. І была пры тым прэлюдыяй, запрашэннем у своеасаблівы акцыён, біржу, дзе чалавек стараецца апярэдзіць іншых, узляцець вышэй, галасней за ўсіх астатніх назваць сваё імя, накрыць козырам усе, раней раскладзеныя на стале, карты.

–  А ў мяне лёгкія на кволых нітачках чапяць. Як сказаў лекар: “Інжынер які або другі панок даўно з зямлёю шлюб узяў бы”. І яшчэ сказаў лекар: “Адракацца трэба ад гэтага гаўна”, – Максім Карпавіч вылузваў з кішэні пачак папяросаў, шпурляў на стол. А потым пяшчотным жэстам прыгартаў яго бліжэй, да сябе. – А як пакінеш, калі шэсцьдзесят год курыш? У сорак чацвёртым вывучыўся, на савецкай перадавой. Махорка была ў іх – моцная, бы спірт. Увогуле, моцныя былі яны хлопцы, адважныя. Жыццё аддаць – тое, што і сплюнуць.

І, паўтараючы адвагу савецкіх разведчыкаў, разгартаў пачак, спраўна пстрыкаў у тэктуравае дно, і папяроса, бы на якой пружыне, выскаквала між пальцаў. Каўкаў дым, аж напіналіся грудзі – горда, рашуча, можна  падумаць – выходзіў на сустрэчу свінцоваму дажджу, агнявой лавіне.

– А ты, Пракопавіч, што можаш ведаць пра пера-

давую? Сярун быў...

Гэтым словам Карпавіч называў Пракопавіча часта і густа. Часам яно Пракопавічу падабалася, а часам не. Асабліва, калі размова кранала справы важкія, адлеглыя на шэсць дзесяцігоддзяў, рабілася крыўдна Пракопавічу. Бо ў чым вінаваты чалавек, што якраз у той гераічны час, хадзіў ён у пяцігадовых смургалях? І тады Пракопавіч выкладаў на стол свой ці не адзіны джокер, што крадком прыхоўваўся ў абшастанай калодзе дзён:

– А ў восемдзесят пятым, як мяне вагоны сціснулі, так і думалі ўсе: памрэ, не выжыве. А як бачыце – не памёр.

Гісторыю пра вагоны яны дасканала ведалі, не першы ж раз сядзелі за гэтым сталом.

У восемдзесят пятым Пракопавіч працаваў на чыгунцы. Спіналі аднойчы вагоны ў адзін даўжэзны эшалон, машыніст памыліўся, лакаматыў заўчасна тузануўся назад. Усе паспелі выскачыць, а Пракопавіч не паспеў, апынуўся між буферамі вагонаў. Штосьці трэснула, нешта ляснула, і ён паваліўся на рэйкі. Доўга там ляжаў ці каратка – дакладна не ведае. Але, мабыць, даволі доўга, бо калі расплюшчыў вочы, першае, што ўбачыў – пабялелы, спалоханы твар начальніка вакзала. І зрабілася Пракопавічу сорамна. Ён ляжыць, а начальнік, бы радавы жаўнер, выструніўшыся перад афіцэрам, хвалюецца: “Дыхае ці не дыхае Пракопавіч?” Учапіўшыся растапыранамі пальцамі за чорныя хмарыны, што плылі перад вачыма, пачаў уздымацца на ногі.

– Другі хто нат і не зіпнуў бы, – казаў потым. А мне, быццам і нічога. Праўда, правая нага не зусім у калене згінаецца. Ды што там – нага?

– А ў мяне вада ў каленях, – карыстаючы аказію, што гутарка ідзе пра канчыны, уключаўся ў размову Хведар Антонавіч.

Але прэтэнзіі Хведара напалову жартам, а напалову і ўсур'ёз ігнараваліся. Як адзіны тут, ён значную частку жыцця прахадзіў у начальніках прафсаюзаў. Напачатку ўсё было нармальна, спалучала іх адна вуліца і адзін фабрычны станок, а потым у Антонавіча з'явіўся свой офіс і свой пісьмовы стол, і яшчэ маленькі столік, дзе, бы які турэцкі султан, драмаў кумпясты чайнік. А наўкол чайніка антычнымі служкамі-вартаўнікамі тоўпіліся шклянкі. Часам, па інерцыі або карыстаючыся ранейшымі сувязямі, яны заходзілі ў гэты офіс. Прысаджваліся ў мяккія крэслы, глядзелі, як спраўныя рукі сакратаркі пераліваюць з чайніка ў шклянкі ўскіпелую ваду.

– Хіба ад кавы і гарбаты тая вада ў каленях, – падміргваў Іван Пракопавіч.

– Або ад гэтай сакратаркі, – выскальваўся жоўтай усмешкай Максім Карпавіч.

Пасмейваліся жартаўліва, па-сяброўску, але ж быў у словах і тонкі папрок, слушны закід: "Смешна і далёка несправядліва стаўляць у адну шарэнгу, параўноўваць прыдбаныя ў барацьбе кантузіі і раны з звычайнымі хваробамі, што, бы тыя байструкі, прывалакліся ў хату невядома адкуль, прыліплі да чалавека невядома чаму".

Крыўдуючы на ўвесь свет, Хведар Антонавіч задзіраў калышыну. Сіня-белую, худую лытку завяршала непрапарцыянальна круглая булава. Сціскаў гэту булаву пальцамі, затым забіраў руку, а на беласіняй скуры аставаліся кругленькія ямачкі.

– О, бяда якая! А вы тут кава-гарбата кажаце, сакратаркамі папракаеце.

І яны замаўкалі. Мабыць, у гэтай цішыні адабраўся, прызнаваўся за роўнацэнны і Хведара Антонавіча жыццёвы ордэн, яго пакута і ўзнагарода за поспех гэтага мястэчка.

– Усё-такі пайду ў той шпіталь. Ці не ў бліжэйшую сераду, – перапыняў цішыню Віктар Сцяпанавіч.

– Будзем праведваць, – казаў Іван Пракопавіч.

Афіцыянтка прыбірала парожнія шклянкі, а яны сачылі за яе няспешнымі жэстамі. І зноў маўчалі. І думалі, што ўсё-такі не ў шпіталі, а тут, у маленькім рэстаранчыку, стрэнуцца чарговым разам.

Гэта былі звычайныя мужчыны, якія паміраюць у сваіх ложках, на сваіх падушках. Так ціха, што можна падумаць – не паміраюць ніколі.

KAMUNIKAT.org

# Зубр

Зубр быў звычайны. Ні малады, ні стары, ні малы, ні вялікі. Галава, тулава, хвост, ногі. Значыць – усё, што і трэба дзеля існавання зубрынай матэрыі.

Такую ацэнку даў лясны вартаўнік Гудзейка – што ні скажаш – асоба ж кампетэнтная, калі ўпершыню агледзеў знаходку на тратуары ў цэнтры мястэчка.

Сонца не паспела выкаўзнуцца з-за гарызонту і якраз у туях, што аддзяляюць тратуар ад магістрацкай сцяны, ноч апошнімі сіламі адбівалася ад новага дня. Вось тут, у змрочным закавулку, і ляжаў сабе зубр, калі першым знайшоў яго кандуктар Самахіл. Спяшаўся трушком на цягнік, а пятай пятнаццаць у Седльцы, і на памяць яму прыходзілі малаважныя перспектывы – сумны, смярдзючы тытунёвым дымом вагон, чырвонае, непрыхільнае ўсяму свету аблічча начальніка Кукулкі. Ёсць такія людзі: як ні хадзі кругом іх на пальчыках, як ні танцуй, як ні ўсміхайся – атрымаецца дрэнна. А ўжо асабліва яму, Самахілу заўжды не так ступі-лася, не так сказалася. Усё не так. Узяў Самахіла на прыцэл начальнік Кукулка ды смаліць пры нагодзе і без нагоды. А пры тым, можна падумаць, лічыць самым у раёне неабходным чалавекам. У нава-годнюю ноч – хто злётае ў Седльцы? Вядома, Сама-хіл. А Вялікодным святам у Варшаву? Ён жа. А яш-чэ і той хітры натоўп, што, тыркнуўшы кандуктару

абшастаную залатоўку, мае жаданне з'ездзіць на край свету ды шчасліва вярнуцца дамоў. Не надта ж выдаўжаюць крок такія думкі. Усё-такі чыгунка гэта чыгунка, гадзіннік гэта гадзіннік і справа якраз кандуктара звянчаць грубую магутнасць лакаматыва «гагарын» з усялякімі тонкасцямі швейцарскай «амэгі», а затым пунктуальна пятнаццаць пасля пятай з гонарам падняць руку і: „Ся-дай! Па-ехалі!" Праверыўшы гадзіннік, ён спалохаўся: часу астаецца няшмат, а абавязкаў – хоць адбаўляй. Хіба што, калі б зараз за поштай павярнуць між блокаў, скараціць шлях....

У той момант нешта зашавялілася ў кустах. „Птушка?"– кандуктар зірнуў туды і прыпыніўся. Невялікі чорны ўзгорак – ніколі тут раней не бачаны – зараз выразна выпукляўся з плоскасці тратуара. Цікавасць хапілася загрудкі з пунктуальнасцю, і яна, мабыць, перамагла, бо кандуктар між блокаў не павярнуў. Ступіў яшчэ крок наперад і спыніўся канчаткова. З тратуара уздымаўся чорны лоб, разгортваючы змрок хісталіся магутныя рогі. Па левы бок – непрыхільны начны сквер, з правага – маўклівыя прамавугольнікі паштовых будынкаў. А наўкол ні жывой душы. Самахілу зрабілася страшнавата. Яшчэ раз зірнуў у напрамку туяў. Рагаты лоб, як і раней, тырчаў на фоне шэрага тратуара. „Які чорт? Жарты ці як?" – ён зняў з пляча службовую торбу, на выпадак нечаканай атакі.

На шчасце, ад цэнтральнага скрыжавання, заўзята націскаючы на педалі, хтосьці пхаўся на ровары. Па вінтоўцы, што тырчала з-за спіны, кандуктар рассакрэціў ляснога вартаўніка Гудзейку.

– Ну што стаіш, кіраўнік, закапаўшыся. Качай, брат, іначай без цябе паедуць, – азваўся хрыплы бас. Але кандуктар не зварухнуўся.

– Ніхто нікуды без мяне не паехаў і не паедзе, –

ён быў стрыманы ў сантыментах да  век-вечна надзьмутага лясніка. Але тут, мабыць,  захацелася адзначыць важнасць сваёй асобы. – Там он, глянь! – паказаў на туі.

– Што, там? – не зразумеў вартаўнік.

– Ха, калі б я ведаў, што...

Ровар прызямліўся тым часам на тратуары, і пан Гудзейка, падмацаваўшы адвагу стволам вінтоўкі, зрабіў тры па-партызанску чуйныя крокі ў напрамку магістрата. Сціскаючы слізкі прыклад, ён і не падумаў пра амуніцыю, што ў выніку ранішняй мітусні асталася ў хаце. Ды хто б і думаў пра такія дробязі, калі істотныя справы наступаюць на спіну. Чалавечае жыццё, у чым пераканаўся пан Гудзейка не раз і не два разы, складаюць аказіі, наогул непаўторныя, праваронiш зручны момант, пішы прапала. А тое-сёе выпусцілі ж жылістыя рукі пана Гудзейкі, не вытрымалі. Вось, хаця б вадзіцельскія правы... Вядома, агульны перападлік атрымоўваўся цалкам прыстойны: была свая хата з саліднымі пушчанскімі сценамі, была сям’я, дзеці, сяк-так уладкаваныя ў свеце, машына на панадворку таксама не з апошніх.

Успамін пра машыну і забіваў калючую іголку ў шырокія грудзі пана Гудзейкі, асабліва калі ўжо, перакінуўшы нагу паўз зялёную раму, даводзілася нажымаць супроць ветру. Не заўсёды так было. У апошняе лета, вызваліўшыся ад непрысутнай у ніякіх паперах бярэзіны, адзначалі той факт на светлай, утульнай паляне, зараз за Ліпінамі. Дзень быў дужа святочны, майскі Мікола ў календары, а пан Гудзейка таксама ж Мікола, і гонар свой мае, і фінансавыя магчымасці за той гонар заступіцца. Словам – зацягнулася. Дадому даехаў нармальна. Якое ж тут дзіва? Ці раз, раскрыўшы дзверы, снапом вывальваўся ў траву? А ў той дзень  не пашчасціла.

Быццам і невыпадкова чакалі на панадворку.

Адвячоркам, прыхапіўшы дзве літровыя пляшкі “стальпіна”, гайсануў на кватэру знаёмага камісара: „Ратуй брат! Такая вось і такая бяда”, – разгарнуў праблему на сукно ды замацаваў яе “стальпіным”. Камісар крадком абмацаў шкляныя фігуры, падняў трубку, набраў нумар. „Алё! У мяне на кватэры Гудзейка”, – больш нічога ён і не сказаў. Слухаў. Затым, адлажыўшы трубку, развёў рукамі: „На жаль, нашы хлопцы тут ні пры чым. Тваю праблему ўзяла ў свае кіпцюры ваяводская. Ведаць не ведаю, але, на маю думку, была нейкая мо-о-ц-ная заява. Ворагі ёсць?”

Ну і пытанне! Чалавек, у якога няма ворагаў, не чалавек проста, а сірата круглая. Дык вось. Будзь разумны і здагадайся, хто якраз прыслужыўся. „Няма доказаў, няма вінаватых”, – кажуць у судзе. А людзі кажуць – помста куды ж смачнейшая, калі ахвяра ведае, хто паспяхова так аддзячыў за ранейшую крыўду. Мабыць, і праўду кажуць людзі.

Праз тры месяцы віноўнік рассакрэціўся сам. Спыніўся аднойчы пан Гудзейка ля кіёску на Сівай Калёніі, не паспеў і каўкнуць піва, як прагучала за спіною: „Так роварам-роварам, пан вартаўнік? Не на машыне? Ну ясна, дзеля ж здароўя ўсё. Зараз і прэзідэнты спортам займаюцца, і міністры, і другія важныя.” Словы насцярожылі пана Гудзейку: “А гэта што за ён? Ну, Груль з Юдзянкі, усё, што зараз вядома. Чорт яго знае, мо некалі і пісаўся асобеню які-небудзь штраф? Ды адно Грулю пісалася квітанцыя? Шмат такіх паперак запоўнілася цягам дзесяцігоддзя. Дзе лес, там і дэфраўданты, хто ў лесе не злодзей, той дома не гаспадар – кажуць у народзе. Ды калі ж тое было?” – шукаў у памяці. “А два гады – не вечнасць”, – адыходзячы, далажыў асобень. Тут канчаткова раскрыліся вочы: „Так, без-

умоўна. Адкуль жа табе, вош кудлатая, ведаць пра двухгадовы тэрмін маіх вадзіцельскіх правоў? Газеты ж не пісалі. Сарокі не галасілі. Ды нічога, сабачы сын, пападзеш у кіпцюры Гудзейку, во тады і спорт атрымаецца, во адгудзеш ты! Будзе аказія – на ровары даганю".

А вось аказіі ніяк не выдавалася. Пільнаваў – нічога. На хітрасць браўся – дарма. Чуткі пусціў у народ – без водгуку. „Госпадзі, дай іскру, адну-адзіную, маленькую іскрынку, а я ўжо раздзьмухаю пякельнае вогнішча, у якім згарыць тая Грулёўская сіла нячыстая, без дыму і попелу прападзе", – за снеданнем шаптаў у вочы святому Мікалаю. Той глядзеў у малочную зацірку з вышыні іконы і маўчаў. А ўчора адвячоркам азваўся тэлефон. Незнаёмы, затое вельмі ветлівы голас без залішніх цырымоній заявіў:

– Заўтра а палове шостай, дарога ад Выдмухова, Груль і яго швагер едуць з дубінай. Сёння ссеклі. Памятай – заўтра, палова шостай, – тэлефон, як нечакана азваўся, так раптоўна і замоўк, і пан Гудзейка не паспеў нат даведацца імя, прозвішча ці іншыя каардынаты ананімнага дабрадзея. Адклаўшы трубку, ляснуў кулаком у стол: „Значыць, ёсць у свеце справядлівасць! Ёсць праўда! Ну, брат, папаўся ты."

А затым падумаў ён пра добрых людзей, якія заўсёды ёсць, былі і ніколі не звядуцца ў нашым народзе. Да поўначы ён не заплюшчыў вочы. А пад раніцу, расслаблены хатнім цяплом, задрамаў. Снілася яркае вогнішча, вялікі ражон, Груль на ражне пераўтвараецца ў сакавітую скварку. А ён, Гудзейка, падмацоўвае агонь учора ссечанай дубін-аю.

Пятнаццаць да пятай заядлым званком загаласіў будзільнік. „Ніхто яму не казаў, а вось узяў і азваўся", – падумаў вартаўнік, забіваючыся ў службовыя

чаравікі. „А калі б не азваўся, тады што? Не, немагчыма, няма ў свеце ніякай выпадковасці, чаму быць, таго не пазбегчы”. Паспеў яшчэ прыхапіць вінтоўку і ўжо сядзеў на ровары.

А цяпер, натапырыўшы ствол, ён набліжаўся да чорнага ўзгорка побач з магістрацкай сцяной. Яшчэ крок, і ўсё праяснілася:

– Ну-у, зубр.

– Як жа, зубр? – не зразумеў Самахіл, які стаяў у дзесяці кроках ад цэнтра здарэння і пільна сачыў за дзеяннямі Гудзейкі. – Хіба ж жывы зубр тутакі, пад сцяною магістрата?

– Зубр як зубр. Не малады, не стары, не малы, не вялікі. Ну, можа, з зімы худы крыху, – удакладніў Гудзейка. – Шмат такіх зараз валэндаецца ў пуш-чы, – тут ён зірнуў на гадзіннік. – Аж едрона, спра-вы важныя ўцякаюць, а ты, Гудзейка, бавіш час, зубра быццам не бачыў.

Зірнуў на гадзіннік і кандуктар Самахіл. І пад службовай шапкай здубянелі валасы. Стрэлка на пятнаццаць хвілінаў адышла ад пятай. Уявіўся зло-сны твар начальніка Кукулкі, неспакойная мітусня ў вагонах і на пероне, і раптам кандуктару Самахілу захацелася аднаго: няхай зараз праваліцца свет, хай задрыжыць зямля, хай акіян выступіць з берагоў. Няхай, адным словам, здарыцца абы-які цуд ды ап-раўдае яго, Самахіла, непрысутнасць у месцы, прад-бачаным службовымі абавязкамі.

Пятнаццаць хвілін на шостую ў блоку па вуліцы Трэцямайскай расплюшчыў вочы сакратар партыі Яўхім Гаворка. Звычаёва падступіў да акна, пагля-дзеў уніз з вышыні трэцяга паверху. Між ліпаў чар-неў асфальт вуліцы. Там было ціха і пуста, быццам мястэчка, скарыстаўшы ўсе свае сілы, адышло заў-часна на пенсію. У адстаўку. Страшнае слова – адс-таўка. Шмат у ім часу, што не раздзяляецца на

паасобныя дні, гадзіны, хвіліны. Спакойнай рэчкай, згартаючы за сабою ранейшыя гонары, перамогі, ідэалы – усё кіруецца да няўхільнага вусця. А вусце, вядома – нябыт. Нат тэлефон – раней гаваркі і чуйны – зараз, расцягнуўшы чорны зліняЛы хрыбет, дажывае апошнія дні, бы стары кот на ласцы таксама ж старога гаспадара. Час ад часу патэлефануе Хведар Жменька, раней сакратар партыі ў суседнім мястэчку, цяпер, як і Яўхім, закінуты ў самыя апошнія закавулкі памяці. „Няма партыі, нічога няма”, – падумаў Яўхім. – Значыць, не зусім няма. Партыяў зараз – хоць адбаўляй. Ды якія ж там яны? Гуляюць між сабою, бы хлопцы з дзяўчатамі ў каханне, то сварацца, то абдымаюцца, сходзяцца і развітваюцца. У іхняй канверсацыі слова “не” неабавязкова чытай “не”, а слова “так” наогул ніякага не мае значэння. Раней усё было проста. Прагучала Яўхіма Гаворкі слова і ніякай мястэчковай сіле не адклікаць, не аспрэчыць яго. А вось у дзевяноста восьмым і Яўхіму сказалі – не! І падумаць – хто? Засранцы маладыя. Сваімі грудзьмі карміў іх. Асабліва цяперашні сакратар – бацькам быў яму і настаўнікам, і сябрам, а ў зручны сабе момант ён што сказаў? „Партыя не тая ўжо, – заявіў. – Новы час, новая партыя! І людзі таксама ж! Вы, Яўхім, прабачце, вы надта выразны. Учарашні вы. Біяграфія ў вас... Ну, самі ведаеце, самі разумееце...”

А пятай раніцы Паўлюка Палітуру разбудзіў грукат Пагоні. Яму снілася магутная, зачытаная ў кніжках далёкая мінуўшчына: вялікі князь Альгерд пад мурамі Масквы. Сеўшы на каня, ён якраз пад’ехаў да Крамля і дакрануўся да яго дзідай. Крэмль, як то ў сне, быў зусім падобны на мястэчковы магістрат, а маскоўскі валадар Дзмітры Іванавіч меў, невядома чаму, твар бухгалтара

Лявона Пупко. „Памятай, што дзіда літоўская стаяла пад Масквою”, – звярнуўся да Дзмітра-Лявона князь Альгерд. „Па-мя-та-ай!” – паўтарыў яшчэ і яшчэ раз, а затым, сціскаючы каленямі конскія бакі, кінуўся галопам у белую імглу. Дружына з дзесяці рыцараў пайшла следам. Грукат капытоў разбудзіў Паўлюка Палітуру.

„Добра, што разбудзіўся ў час, – падумаў пан Палітура. – Навошта здабываць нам тую Маскву. Славянская яна ж. І праваслаўная”. А над галавою барабанілі пятамі ў столь суседавы дзеткі. І зараз, увайшоўшы ў рэальны свет, аб іх і падумаў Паўлюк: „Слухмяныя жэўжыкі, не скажаш. І *дзень добры* заўсёды гавораць на сходах, нат і кланяюцца з пашанай старэйшым. І ў царкве, а як жа, бачыш іх у нядзельныя поранкі. Калі б вось не тое “цоканне-пшэканне”... Знікае наша Бацькаўшчына. Сто га-доў – і след астыне. Хіба ж цяпер, у пачатку трэцяга тысячагоддзя, яшчэ здараюцца цуды?” – Такія вось думкі таўкліся ў галаве Паўлюка Палітуры, калі сумным вокам глядзеў ён у акно. Праз дзве гадзіны самыя старанныя смургалі будуць ужо маршыраваць тратуарам у школу. Зазіраючы з перспектывы трэцяга паверха ў загружаныя рукзакі, ён убачыць там усякія “трылогіі, элемэнтажы” ды і ўсе іншыя інструменты, што непрыкметна высысаюць душы з маладых целаў. ”Куды ідзеце? На смерць ідзеце!” – захочацца крыкнуць. Але ён змаўчыць. Адступіўшы ад акна, моўчкі прысядзе за сталом і закурыць. Захочацца плакаць.

Пятнаццаць хвілінаў на шостую Агафон Сакалюк яшчэ не спаў. Сядзеў за столікам у зале рэстарана і заўзята крэсліў на паперы нейкія лічбы, словы, геаметрычныя зігзагі. „Піва плюс біфштэкс дае злоты дванаццаць”, – пасылала імпульс галава. – „Воля плюс роўнасць дае братэрства”, – у халод-

ную бухгалтэрыю бунтарская душа падкідала свае гарачыя словы. „Суп – два злоты  трыццаць грошы”, – абмяркоўвалася ў галаве. “А хлеб для ўсіх”, – з тайных закавулкаў свядомасці вылівалася на паперу.

У Агафона быў малы рэстаранчык і вялікія мары. Мроіўся Агафону рэстаран аграмадны, не такі як зараз: двума дзесяткамі людзей яго запоўніш ды і тыя дзесяткі не склікаць нат у святочныя дні. Вось хаця б у апошні вечар: пяць кліентаў, пасядзелі, выпілі піва, а ў касе што асталося? Пуста ў касе. А прытым у мястэчку шмат галодных і беспрацоўных. Вось і мроіўся Агафону рэстаран вялікі бы свет, бясконцы, даўжэйшы за дах неба, пад якім згуртуюцца ўсе жыхары нашай планеты – чорныя, белыя і жоўтыя, каталікі, праваслаўныя і мусульмане. А ён, Агафон Сакалюк, усіх накорміць, усіх напоіць і кожнаму паасобку знойдзе добрае слова і ветлівую ўсмешку. І ўжо ніколі галодных на зямлі не будзе.

Пералічваючы бараноў, якіх рэзаць давядзецца дзеля пачастунку ўсяе планеты, якраз шаснаццаць на шостую ён заснуў. І спаў да адвячорка.

Але шаснаццаць пасля пятай здарыўся цуд. Узышло красавіцкае сонца. Нібыта штодзень вырываецца яно з абдымкаў супрацьлеглага паўшар’я, падымаецца на неба, вандруе з усходу на захад, але... Светлыя промні рассыпаліся ўздоўж вуліцы, пабеглі ў сквер, між блокаў. Як дзеткі, залішне прызамкнёныя ў цеснай хаце, цяпер, знюхаўшы волю, шнырылі па ўсіх самых тайных закавулках, адштурхоўваючыся ад тратуара, узлазілі на сцены, на дрэвы, на зубрыны хрыбет.

Хто згледзеў той цуд першым, сёння ўжо невядома. Калі а восьмай раніцы лясны вартаўнік Гудзейка даваў інтэрв’ю мясцовай газеце, ён сказаў:

“Я во перакладаў якраз ногу паўз раму, нават і замарудзіў крыху і зазлаваў быў на той ровар, што нязручны ён такі, а справы якраз былі неадкладныя, дэфраўданты ж не спяць... Вось, змагаюся з клындаю, а тая ніяк не лезе, куды яе месца. Ну, Груль, думаю, няўжо ж ізноў табе пашанцуе?! Няўжо няма справядлівасці ў свеце? Раптам, гляджу, паблісквае штосьці ў туях. Маладзік? Не маладзік? Ды адкуль малады месяц на тратуары? Вінтоўку з пляча – чаму быць, тое і будзе – іду. Ступіў крок – блішчыць. Яшчэ крок і яшчэ – а як жа, блішчыць! Падыхо- джу – бліжэй ужо не падступіш – а тут, кажу вам, не блішчыць, а проста ззяе. Як сонца ў чыстым не-бе!”

Тым часам у пяці кроках далей сваю гісторыю ў мікрафон распавядаў і кандуктар Самахіл. І Самахілу было вельмі прыемна – гляньце, не якісьці там надзьмуты начальнік Кукулка гаворыць свету пра самыя важныя справы, а ён, кандуктар. На ягонай асобе засяроджваецца ўвага прысутных. Словы ішлі ў прамы эфір: “Ну што тут скажаш? Як сумленны працаўнік чыгункі, нармальна, устаў, памыўся, торбу на плячо і ў дзверы. Час, разумееце, не чакае. Кажуць – чыгунка без пунктуальнасці не ёсць ніякая чыгунка, а звычайны бардак. І так сабе іду і думаю: бедная наша чыгунка, ну зусім небагатая яна. І уніформы вось, самі бачыце. І вагоны нейкія такія абшастаныя, і рэйкі расхістаныя. Кіраўніцтва, вядома, стараецца, ды што тут настараешся. Хаця, дарэчы, не ўсе кіраўнікі добра працуюць. Іду вось і разважаю: будзе лепш ці мо горш будзе? А на душы дзіўна неяк, быццам у святло якое ступаю. А калі б так, думаю, здарыўся якісьці цуд... І не паверыце – толькі паспеў падумаць, як тут жа з-пад зямлі і высоўваецца зубр з залатымі рагамі”.

А восьмай раніцы на тым месцы стаяў натоўп, як за лепшым часам ля мясной крамы. Як снежная

куля, сходзячы з узгорка, каўкае ўсё на сваім шляху, так зубр з залатымі рагамі згартаў да сябе мястэчка. Хто падышоў, той і прыліп. І працоўны народ, і беспрацоўны, дырэктары і сяляне, лекары і пенсіянеры, настаўнікі і школьная моладзь. І ўсё яшчэ прычалялі новыя. Кожны з уласнымі спадзяваннямі.

Пяць на дзевятую згледзеў той натоўп Кастусь Шыла. Ён ішоў на шпацыр. Як штодзень абмінуў касцёл, банк, за банкам быў намер павярнуць у самае цікавае месца, на базар, а тут – натоўп ля магістрата! „Няўжо ізноў забілі кагосьці?” – мільганула ў галаве кволенькая надзея. Раз у год, рэгулярна, каго-небудзь у мястэчку зацюкаюць, а ён, Кастусь Шыла, ніколі ў добры час у адпаведным месцы не акажацца. Пакуль з’явіцца пан Шыла, чыста ўжо і гладка, а доказ злачынства даўно прыбраны санітарнымі або паліцэйскімі службамі. Ён і не надта любіў тыя службы за такую, залішнюю пасля фактаў, актыўнасць. Праўда, здавалася, на мінулым тыдні вось-вось і здзейсніцца доўгачаканае. На скрыжаванні Пілсудскага і Трэцямайскай ровар сутыкнуўся з машынай. Нібы і не дзіва, ровар тут самы лепшы сродак камунікацыі. Значыць, так: жанчына, гадоў пад семдзесят, абмінаючы ўсе дарожныя законы, лоб у лоб шлёпнула ў буфер “форда”. Смешна перабіраючы нагамі, падскочыла на метры два ўверх і, як чорная варона, распласталася ўпоперак вуліцы. „Падымецца? Ці не падымецца?” – захваляваўся пан Кастусь Шыла. Ён шчасліва знайшоўся якраз на ўскраіне мястэчковага скверу і, карыстаючыся дарункам лёсу, пільна сачыў за падзеямі. Ахвяра дарожнай аварыі ўсё яшчэ спачывала там, дзе яе пакінуў буфер “форда”. „Не ўстане, няма моцных”, – паспеў зрабіць прагноз, а ў той момант жанчына прыпадняла спіну, села. Хвіліны тры вярталася да прытомнасці. Побач,

збялелы ад страху, хістаючыся на мяккіх нагах, таптаўся кіроўца. " Усё нармальна, цётачка? – працягнулася дапаможнае плячо. – Вы мяне бачыце?" Жанчына, ігнаруючы прапанаваную падтрымку, узнялася на ногі сваімі сіламі. "І як едзеш, балван ты! Хто табе правы даў? Панства халернае. Бачыце, бачыце вы яго, яшчэ пытае. Дзе ні глянь, таксоўкі ўсё", – згарнула з тратуара ровар, які ў выніку здарэння страціў камунікацыйныя ўласцівасці і павалаклася сабе далей. Куды пайшла, пан Шыла не ведае. З тае хвіліны, калі жанчына ўзнялася на ногі, ён страціў сэрца да гісторыі, што пачалася, здавалася, гарматным салютам, а далей пайшла на схіл, да банальнага завяршэння. Як чалавек, абшастаны з гучных абяцанняў, пан Шыла адступіў у свой шэры, знерухамелы свет.

Так было тыдзень назад. А цяпер ля магістрата стаяў натоўп.

– Забілі каго? Каго забілі? А паліцыя? Ну, вядома, калі няма патрэбы, валэндаюцца кагалам. А калі ў бядзе грамадзянін, абдзіраюць з кашалька яго або і зусім забіваюць – ніякага паратунку, – разгортваючы натоўп, пан Шыла дабіраўся да цэнтра падзеяў. – Хто ж зараз галаву палажыў?

– Нікога не забілі, ты што, чалавеча? Зубр во з залатымі рагамі аб'явіўся, – з памылковага становішча выправіў пана Шылу нейкі чужы голас. Але пан Шыла, выбіўшыся на першы план, і сам ужо ўбачыў, у чым справа. Ад нечаканасці разгубіўся. Не ведаў – шкадаваць ці не шкадаваць? Пабачанае ў ніякім сэнсе не сыходзілася з ранейшымі спадзяваннямі. З другога боку – не штодзень з'яўляецца ў мястэчку такое. Ба, добра падумаўшы, ніколі раней і не здаралася. І хто ведае, мабыць, і не будзе чарговага разу. „А зацюкаць каго-небудзь, раней-пазней зацюкаюць", – ад такой думкі пасвятлела на душы.

– Я яго, я першы напаткаў, – адбубніўшы інтэрв'ю рэгіянальнаму радыё, кандуктар Самахіл даводзіў перад натоўпам свае правы на знаходку. – Адразу, як толькі вочы расплюшчыў, так і ведаў – сёння здарыцца важнае. Прадчуванне такое было. А калі выйшаў з хаты, зараз і знак на небе паказаўся. – Чаму тое ляпнуў? І сам не ведае. Мо хацелася выдаўжыць сваю прысутнасць у цэнтры здарэння?

– Які знак? Мо крыж агнявы які? – збянтэжаным голасам хістануўся натоўп. – А можа Матка Боская? – падключыўся паасобны, жаночы голас. І пан Самахіл таксама збянтэжыўся. Не абдумаўшы дэталёва стратэгію прэзентацыі сваёй асобы, ён неасцярожна вышпарыўся наперад. Трэба было ратавацца. „Мабыць, і фактычна пакарыстацца аўтарытэтам Божай Маці? Даўно ж не аб'яўлялася ў павеце якая-небудзь святая постаць", – падумаў ён. Ужо збіраўся з адказам, калі ў задніх раёнах грамады зашавялілася чорная сукенка бацюшкі Рыгора. Можна меркаваць – ён настойліва намагаўся ў цэнтр натоўпу. Наперадзе крочыў Макар Хавоська, па прычыне буйнай фігуры званы Бомбай. Гэты – зараз царкоўны стараста, у васьмідзесятыя гады капітан мясцовай міліцыі – уласным целам і прабіваў шлях айцу Рыгору. „Вось табе, калі б так ляпнуў", – спахапіўся ў добры час Самахіл. – Зараз жа пайшлі б пытанні. Асабліва з боку гэтага Бомбы: А якая была сукенка ў Божай Маці? А прычоска якая? А ўсміхалася яна ці можа сумнае было аблічча? А што ж сказала Цудоўная З'ява? А на якой мове? Па-расейску ці па-польску? А можа на ангельшчыне? – О так, такое пытанне з асаблівай асалодай паставіў бы Бомба. А ўжо прыпомніўшы ангельшчыну – з імперыялістычнай гніллю ўсё яшчэ асацыюецца яна Бомбе – ягоныя вочы адразу звужаюцца ў дзве вострыя брытвы. І не прыхаваць ад гэтых брытваў ні

слова, ні думку.

Знюхаўшы небяспеку, Самахілаў інтэлект спрацаваў на ўсю пару. Цудоўны знак, які зараз трэба было назваць, мабыць, і не адзначаўся залішнімі прыкметамі арыгінальнасці, з другога боку – пытай, Бомба. Што толькі захочаш, пытай. Не зловіш ты Самахіла, не запрэш у цёмны закавулак. І Самахіл сказаў:

– Ну, дзіўны знак, касмічны. Чатыры зоркі над пушчай зліліся ў адну. З чатырох бакоў свету ляцелі і якраз па-над нашай пушчай у адно сышліся. А потым адным, аграмадным святлом на мястэчка накіравалася ўсё. Памаленьку небам плыла тая светласць, быццам бы клікала: „Ідзі, Самахіл, да мяне ідзі”. Аж спынілася над магістратам. Ну што тут яшчэ скажаш... Знак.

– Набамболіўся мусь, то і сышліся ўсе зоркі ў адну, – Бомба дабрыў якраз на апошнія словы. Зубра, што спакойна спачываў у цяньку туяў, ён пакуль не прыкмеціў. – Ты што, Самахіл, народ цудамі якімісь туманіш? Ніякіх цудаў няма, – у той момант ён адчуў на спіне стомленае дыханне айца Рыгора і насуперак ранейшым намерам выдаўжыў думку:

– Няма цудаў без прычыны. А тут што?

– А хіба ж і не прычына? – рука Самахіла працягнулася ў напрамку туяў.

Цяпер і Бомба згледзеў тое, з чым астатнія паспелі пазнаёміцца раней. Ступіў яшчэ крок: хацелася абмацаць тыя рогі, дакрануцца. Усё-такі... У вялікіх карых вачах як бы спакойная абыякавасць... А што чаўпецца ў кудлатым ілбе? Адкуль жа ведаць.

З небяспечнымі людзьмі быў у Бомбы неблагі вопыт, здаралася – садавіш асобеня на табурэтку, сам забіваешся за стол, моўчкі гартаеш паперы. Твар – камень, вочы – шкло. Дзесяць хвіляў гартаеш тыя паперы, дваццаць – няма патрэбы спяшацца.

Курыш, струменіш дым зручнымі абаранкамі. Прыкідваешся чалавекам, якога змарылі справы сусветнага маштабу, а той, згорблены на табурэце нуль, адно мантачыць твой цэнны час. Тады і кажаш: „Так і так мае быць! Усё ясна? Прызнавайся, твая маць, бо іначай...” А вось з зубрамі – што і як? – не разглядалася на курсах. І Бомба няўпэўнена спыніўся. Азіраючыся на айца Рыгора, здавалася, у яго разумных вачах шукаў падтрымку, падказку нейкую, адно слова, што дазволіць з гонарам адступіць на раней прадбачаныя пазіцыі ды ў добры момант ізноў узяць ініцыятыву ў свае рукі. Але бацюшка пакуль маўчаў. Ніколі раней не спатыкаўся з ніякімі цудамі, нат самымі маленькімі. Дык і зараз тое, што тут адбываецца – сапраўды цуд? А калі містыфікацыя якая? Або – грубае ашуканства? Падтрымаць такое, адобрыць сваім аўтарытэтам, вядома, што абазначае: смех вечны і ссылка ў далёкія Бяшчады. Або і яшчэ далей, у Шчэцін. Але тут жа і другое прыйшло на думку: “А калі сапраўдны цуд? А калі, у рэшце рэшт, прыйшло змілаванне і на наш панадворак? І тады што? Абмінуць маўчаннем? Абыякава паставіцца? А калі рабіць, дык што рабіць? Месцы, пазначаныя цудоўнай ласкай, увекавечваюцца неяк, адзначаюцца наогул новымі храмамі. А тут жа цэнтр мястэчка, запоўнены кожны пляц, кожны квадратны метр...”

З такімі думкамі абвёў ён вачыма бліжэйшае наваколле, спыніўся на вяршынях дрэў у парку. “Не, не быць такому – розум адразу адагнаў нованароджанае. – Ніхто не дазволіць прыбраць і адно паасобнае дрэўца. Эколагі з усяго свету зараз азвуцца. Ды што казаць – азвуцца! Вэрхал падымуць такі, што і ў нябёсы рэхам панясецца. Хіба, калі б... – І тут жа ў другім напрамку злёталі вочы айца Рыгора. Прагуляліся над магістрацкімі сценамі, кранулі блі-

жэйшыя блокі, што выцягнуліся вышэй за магістрацкі дах. – А што, калі б завяршыць той дах купалам? – падумалася. – Пры нагодзе прыхавае ён тое сацыялістычнае шматсямейнае і шматпавярховае шкарадзенства. Так, тут можна выпрацаваць які кансэнсус. Мясцовыя людзі – зразумеюць. Не, усё-ткі не, – дзіўная цеплыня, быццам якія асколкі, быццам воск касмічны ад чатырох зор, пра якія хвіліну раней правіў кандуктар Самахіл, усё гэта яснай палоскай сышло на айца Рыгора. – Яшчэ не, яшчэ не зараз”, – прашаптала светлая палоска.

– А я таксама бачыў у небе тое, аб чым тут Самахіл, – дзесьці з задніх радоў натоўпу вырваўся нясмелы, дрыжачы голас. Народ скалыхнуўся, усе галовы павярнуліся ў тым напрамку.

– Ён бачыў, ён бачыў, ён бачыў, – пайшоў шарэнгамі неспакойны шэпт. І зараз вярнуўся назад. – А хто гэта-гэта-эта?

Значыць, трэба паказацца. Невысокі ростам асобень, гадоў за пяцьдзесят, узняўшы руку, быццам вучань, што ахвотнікам аддаецца пад ацэнку, цяпер ужо голасам болей упэўненым паўтарыў:

– Праўду кажа Самахіл. Ён, як ведаеце, не спецыяліст па касмічна-тэхнічных справах, мабыць, у агульных рысах прадстаўляе праблему. Але ў прынцыпе, згодна з праўдай. У мяне, як ведаеце, адукацыя тэхнічная. А хобі вось, таксама ж не таямніца, можна сказаць – касмічнае.

– А хто гэта? – паўтарылася пытанне. Паколькі асобень і яго прафесійныя ды хабістычныя кваліфікацыі ўсё яшчэ не сталіся даступнымі шырокай публіцы, трэба зрабіць тут невялікую рэкамендацыю. Калі вам спатрэбіцца чалавек, які на жыццёвым шляху размінуўся з голасам душы, чалавек, які насуперак снам і мроям, замест каляровых, духмяных ды квяцістых лугоў прымушаны быў абраць

абмежаваны матэматычнымі законамі свет бяздушных лічбаў і геаметрычных зігзагаў, калі вам цікавы такі чалавек, загляніце ў нашае мястэчка. І пытайце аб Сашку Тытуньчыку. Ён цяпер вядомая ў мястэчку асоба. Неабходныя каардынаты атрымаеце ў першай крайняй краме, у адміністрацыйнай установе, або – звычайна – на вуліцы. А калі заглянеце ў мястэчка ноччу, мабыць, пашанцуе вам напаткаць Сашку ў такую хвіліну, калі ягоная душа, сэрца і цела, аб'яднаныя ў шчыльную структуру, на крылах прыдбанага ад савецкіх базарных турыстаў тэлескопа, узлятаюць у зорнае неба.

– Кажа спадар Самахіл – вось, здарыўся цуд... Праўда, можна і так сказаць. Але – дзеля дакладнасці – я скажу інакш. Я скажу – пацвердзіўся цуд жыцця. Цуд існавання матэрыі і думкі. Бо, дакладна хачу тут зазначыць, у мяне таксама была нагода ў апошнюю ноч сачыць за тым, што бачыў спадар Самахіл. Раней чыталася аб тым у кніжках, у газетах, глядзелася па тэлебачанні. І заўжды здаралася такое дзесьці ў свеце, дзесьці далёка. А то ў Амерыцы, а то ў Англіі, а то ў Францыі ці другім вядомым месцы. А сёння пад раніцу і нас наведалі. Значыць, і наша мястэчка не горшае за іншыя, і нашы людзі – не абы-хто, калі тут якраз аб'явіліся Яны. Пры апошнім слове Сашка ўзвёў вочы ў сіняе неба. Следам пайшлі і астатнія, усё яшчэ спадзяючыся, мабыць, на прысутнасць таямнічых Іх у застылай над магістрацкім дахам вышыні. Неба стаяла чыстае, дзе-нідзе красавіцкімі, перыстымі воблакамі засланяўся блакіт.

– А якія Яны? Хто – Яны? – пан Кастусь Шыла, зведаўшы адзін цуд вачыма, другі вушамі, ці не канчаткова забыў пра ранейшыя спадзяванні.

– Гм, – пан Сашка таямніча ўсміхнуўся. – Яны – госці, за якімі сачыў я ўсё жыццё. Нашы, безумоўна,

старэйшыя браты....

– Значыць – расіяне? – радасным воплескам выскачыў з натоўпу голас Паўлюка Палітуры. – А я так і думаў – ці не яны тут абдорылі нас? Золата ў Расеі, во, пад завязку. Усіх зуброў азалаціць у пушчы – тое, што і сплюнуць для Расеі.

– Э там. Зараз – расейскі той зубр. Калі б расейскі, то не рогі, хучэй ужо зубы былі б у яго зала-тыя, – скептычна адазваўся Бомба.

Сашка Тытуньчык шукаў тым часам словы, якімі скажа зараз пра ўсе недаспаныя ночы, пра неба, цаля за цаляй абшныранае халодным шкель-цам тэлескопу пад скептычныя заўвагі жонкі Алім-піі, што, вырваўшыся спрасоння пасярэдзіне ночы, не раз і не два паўтарала: „Кінь жа дурноты, за працу вазьміся. Людзі вунь якія бізнесы парас-кручвалі!” Думаў пан Сашка расказаць пра сваю бязмежную, матэматычнымі перападлікамі пацвер-джаную ўпэўненасць у існаванні другіх сусветаў, другіх земляў, запоўненых фантастычна пакручас-тымі істотамі. Ці адну ноч рысаваў ён іх на служ-бовай паперы? Нат калі і трэба было, згодна з загадамі начальства, зусім другое выліць на папе-ру – нейкія бяздушныя схемы, аловак міжвольна раскрываўся цудоўнымі істотамі – двухгаловымі, трохногімі, крылатымі.

За туямі, за вокнамі магістрата малады павятовы сакратар вядучай партыі падняў тэлефонную трубку. Збіраўся пазваніць у Варшаву знаёмаму міністру. Ды як пачаць размову – не ведаў. Значыць, што? Так і так сказаць, вось аб’явіўся зубр з залатымі рагамі, ляжыць побач з магістратам, народ гуртуецца, аб цудах правіць... А міністр спытае: які зубр, чаму ён тут, адкуль узяўся, ці не якая ён палітычная правакацыя? А дазвол ляжаць зубру побач з магістратам – улада дала? І асноўнае – у чыёй

справе разлажыўся ён? Каго падтрымлівае, лежачы там?

На такія пытанні не адкажаш у адну хвіліну. І сакратар пасадзіў трубку на ранейшае месца. Задумаўся. Вось табе і заварэнцыя. А ўсё добра было, спакойна. А цяпер па прычыне кудлатай чатырохногай жывёліны гэты спакой разбураўся. Штосьці пагрозлівае, некантраляванае нябачнай птушкай разгортвалася над мястэчкам. Яшчэ няўмела, пакуль хаатычна і навобмацкі. Але ж усялякія катастрофы, на якіх правальвалася любая ўлада, ці не з нуля пачыналіся? Ад аднае кулі, што трапіла ў цэль або абмінула яе, ад аднаго слова – сказанага або прамоўчанага.

І сакратар яшчэ раз падняў трубку, набраў нумар. "Раз казе смерць!"

Адазваўся адзін гудок, другі, трэці, аж электронныя вантробы азваліся знаёмым голасам.

– Так?

– Міністр?

– Так.

– Гэта я, сакратар партыі ў мястэчку.

– Так? І як там у мястэчку? Нармальна ўсё?

– Зубр аб'явіўся ў мястэчку. Ляжыць побач з магістратам, а народ – хто жывы, усе тут! – адным рашучым сказам, адным рашучым жэстам разрэзалася набрынялая скула. Накрыўшы мікрафон далоняй, каб прытаіць неспакойнае дыханне, сакратар чакаў адказу. Але насуперак спадзяванням адказ прыйшоў халодны, сціплы, безэмацыянальны:

– Так? І ў чым справа?

– Рогі яго залатыя

– Залатыя?

– Ну, залатыя. Бліскучыя-бліскучыя.

За гэтымі словамі разгарнулася ў трубцы даўжэйшая цішыня. "І што, здзівіўся?!" – душа сакра-

тара напоўнілася насалодай. – "Думаў, зноў без прычыны барабаніць сакратар?! Ад няма чаго рабіць на тэлефон абвесіўся?!".

Але трубка працягнула размову манатонным і абыякавым голасам:

– І што, падабаецца зубр?

– Ну-у, ніхто не ведае адкуль ён. Народ гуртуецца, аб нейкіх цудах балбоча.

– Ніякіх цудаў наша партыйная ідэалогія не прызнае. Гаварыў я вам ці не гаварыў? А вы зноў сваё. Выступіць, сказаць як трэба, што трэба і няма дыскусіі, – знервавалася трубка.

– Але ж і бацюшка там, – голасам сакратара авалодала збянтэжанасць.

– Ага, – маленькі перапынак уварваўся ў размову. – Такая справа. Але агульна – народ задаволены? Цешыцца, спадзяюся?

Цяпер не ў міністэрскім, а ў магістрацкім кабінеце прыпынілася слова. Націскаючы на педалі думак, сакратар маланкава аналізаваў, абмяркоўваў пачутае. Асабліва з-за апошняга, з-за гэтага, абыякавым голасам сказанага, "цешыцца, спадзяюся" і прытармазілася размова. "Значыць, што? Ёсць тыя цуды ці няма іх? А калі ёсць – дык адкуль бяруцца?".

У гэты момант сакратар адчуў сябе сапёрам, што, узяўшы ў рукі невядомую міну або гранату, абмацвае яе позіркам, песціць далікатна пальцамі, здагадваецца – смерць або жыццё прытаілася за жалезнай абалонкай?

Але сакратар быў палітык. У палітыкаў ёсць свае міны і свае разрыўныя гранаты. Гэта – словы. Яны дораць палітыкам будучыню або высылаюць іх у нябыт. І сакратар абмацваў сваю міну. Песціў яе ў думках, разбіраў на паасобныя гукі, склады. Разбройваў.

– Па-да-ба-ецца, – сказаў, даводзячы голас да межаў ідэальнай ласкавасці. – Як жа не па-да-баццца? Хто другі, калі не вы, мог прыдумаць такое. Бо, добра думаю, за вашай справай гэты зубр? За вашым хадайніцтвам?

– Ну-ы, – трубка прахрыпела неяк дзіўна. Ні так, ні сяк. Але сакратар, прымусіўшы вуха да максімальнай працы, нават у гэтым абыякавым "ну-ы", вычуваў перавагу станоўчага над адмоўным.

– Увогуле – геніяльная ідэя. Я заўсёды паўтараю людзям: не сіроты мы, не бязбацькавічы якія. Бачаць нас і клапоцяцца пра нас. У Варшаве і ўвогуле, – падбадзёраны трапнасцю сваіх дыяг-назаў, сакратар разгартаўся ў доўгую песню. Але калі шосты або дзесяты раз словам "дзякуй" паў-тарыўся прыпеў, яго спынілі:

– Так вось і скажыце людзям – няхай карыстаюцца на здароўе. А мы тут памятаем і клапоцімся, і забоцімся. І ўсё ведаем, бачым і чуем.

Апошнія словы сказаліся ветліва, адчувалася ў іх бацькоўская цеплыня і жартоўнасць. Але ж і вытыркалася з-за жартоўнай цеплыні нешта сухое, перасцерагальнае, пагрозлівае. І сакратар, як бы шукаючы тайнае вока і вуха, аб'ехаў позіркам сцены, партыйную шыльду на сцяне, нават жырандоль, чатырма лямпамі развешаную над галавой. Але сцены глядзелі адно партрэтамі ранейшых сакратароў, што, адслужыўшы свае тэрміны, выканаўшы даручаныя заданні, адышлі, хто куды, на больш адказныя па-зіцыі, на пенсію, у лепшы свет. І ўсе партрэты, усе вочы зірылі за маладым сакратаром – турботна, абыякава, іранічна. А найбольш іроніі было ў вачах Яўхіма Гаворкі.

Партрэт Яўхіма апошнім заняў месца на сцяне, і сам Яўхім не так даўно сваёй чыста фізічнай асобай запаўняў гэты кабінет. Яго астральную прысутнасць

адчуваў малады сакратар па сённяшні дзень. “Ну што, хлапец, захацеў быць грыбом, палязай у каробку”, – так менавіта ўсміхаліся гэтыя вочы. – Ідзі, выштурхоўвалі вочы. На вуліцу ідзі, там чакаюць”.

А на вуліцы мітусіўся народ. Гаманіў, пераступаў з нагі на нагу. Сакратар хвіліну адчакаў, абвёў позіркам знаёмыя і незнаёмыя твары, узняў распасцёртыя, адкрытыя рукі і, бы які Кашпіроўскі, пасылаючы ўсяму свету добрыя флюіды, заклінаў гоман. Гэты жэст заўсёды спрацоўваў. І зараз таксама – людзі пагаманілі яшчэ хвіліну і замоўклі.

– Дарагія сябры, добрыя людзі. Мне заўсёды прыемна бачыць вас у нашых сценах. Гэта вельмі важна, калі народ цікавіцца пачынаннямі сваёй улады. Аспрэчвае іх або адабрае. Калі сумняваецца і стаўляе пытанні. Так і зараз шмат якія пытанні тут прагучалі.

– Адкуль узяўся ў мястэчку цудоўны зубр? – выскачыў з натоўпу голас Бомбы.

– І хто расплаціцца за яго? Ці якраз не мы, беспрацоўныя і рабочыя? – з задніх шарэнгаў вышпарылася чарговае пытанне.

– На маю думку, расіяне, зусім бясплатна абдорылі нас, – паспяшаўся з адказам Паўлюк Палітура.

– Э там! Зараз – расіяне. Калі б расейскі ён, то не рогі, а зубы былі б залатыя, – са скептыцызмам паўтарыўся Бомба.

У гэты момант дыскусію трэба было спыніць.

– Пытаеце і прапануеце адказы – часта вельмі цікавыя, але ж і вельмі складаныя. А свет не такі ўжо і скамплікаваны. У свеце, таксама ў свеце палітыкі, усё мае канкрэтную прычыну. За злом ступае кара, за дабром – узнагарода.

– А нас за што ўзнагародзілі? – яшчэ адно пытанне ўваткнулася ў словы сакратара.

– А звычайна, за тое, што мы ёсць, – усміхнуў-

ся сакратар. Трэба было безбалесным і натуральным шляхам пераходзіць да сутнасці справы. І сакратар перайшоў. – Вы добра ведаеце нашага міністра. Ён заўсёды з намі, у добрую хвіліну і ў благую. Днём і ноччу. І зараз ён тут – думкамі і душою, – удакладніў, бо людзі зірнулі зацікаўлена ўбок, шукаючы добра вядомую постаць.

– Значыць, што? Міністэрскі гэты зубр?

Сакратар зноў усміхнуўся. Чакаў, даводзячы іх сумняванні і цікавасць да межаў вытрымкі. І калі гэтая цікавасць узнялася на самы высокі паверх, ён сказаў:

– Так, дарагія сябры, вы ідзеце ў слушным напрамку. Шмат якое дачыненне мае наш міністр да гэтага цудоўнага зубра. Ягоны гэта дарунак. А ён, міністр – дарунак нябёсаў нашаму мястэчку, – апошнія словы сакратар, безумоўна, адрасаваў айцу Рыгору. “Як цудоўна ўсё атрымалася”, – падумаў ён.

Але нябёсы якраз прыхоўваліся за чорнымі хмарынамі. Адвёўшы ўсю ўвагу важкім, але ж зямным справам, яны праваронілі той момант, калі ў небе мяняюць антураж, прыбіраецца са сцэны ідылічнае афармленне і яго месца запаўняецца больш драматычнымі рэквізітамі. Такія ракіроўкі неабходныя. У другіх выпадках чалавек забываецца на вартасць святла, добраахвотніцкія пачастункі ўспрымае як належны сабе паёк і пачынае дамагацца – давай больш і больш.

Першая кропля дажджу пакаўзнулася па зубрыных рагах і апала залатой слязой у траву. Затым яшчэ адна, і яшчэ. Ніхто пакуль што на гэтыя кроплі не звяртаў залішняй увагі. Нават і добра, нават і трэба – хутчэй падымецца, раскрасуецца ў агародчыках вясновая трава, вясновая кветка.

А хмарыны замацоўваліся на нябесных пазіцыях. Дождж гусцеў і ад кожнай кроплі на бліску-

чым золаце зубрыных рагоў вырастаў дзяружны шрам.

– А гэта што? – Яўхім Гаворка апынуўся ў першай шарэнзе. Паказальным пальцам каўзануўся па зубрыных рагах і палец набраў бляску. І Яўхім узвёў высока-высока залаты палец, прэзентаваў яго ўсім прысутным і ўсяму сусвету. І яшчэ раз, зазіраючы ў вочы маладому сакратару, запытаўся Яўхім: – А што ж гэта такое?

Пытанне было лішняе. Сакратар і сам не быў сляпы. З першай кроплі дажджу адсочваў усё належным чынам. Але ж...

Чалавек – наогул істота аптымістычная. Бачыць тое, што хочацца бачыць, на што спадзяецца сэрца. А калі абразкі разыходзяцца, калі сварацца між сабою, спрачаюцца, тады чалавек закрывае вочы, раскрывае, закрывае зноў. І так да бясконцасці, аж вобразы вачэй і сэрца спалучацца ў згодную пару, прагучаць адным акордам.

А тут прагучаў голас Яўхіма Гаворкі – гучна, груба. Забіўся цвіком у сэрца, і сэрца зрабілася нямое ды сляпое. “І што ж зараз будзе? Што будзе? Гэтыя на вуліцы, хрэн там. Ім усё можна патлумачыць, што толькі захочаш. А вось міністр...”

Слова “міністр” забівалася паасобным, самым вялікім і самым вострым цвіком. “І які чорт падшапнуў тэлефанаваць адразу ў Варшаву? Які д’ябал?”

Шукаючы адказу на такія пытанні, ён шукаў таксама самы зручны, самы ананімны шлях для эвакуацыі з гэтага месца.

Тым часам маладыя гарцэры, выштурхнутыя наперад пачуццём грамадзянскага абавязку, разгарнулі над зубрынай спіной вялікі парасон. Але дождж, абмінаючы заслону, рабіў сваю працу паспяхова. Падпіраючыся рэзкім ветрам, наступаў з аднаго

боку, з другога, адбіваўся рыкашэтам ад туяў. Праз хвіліну ні залатой кроплі, ні заблытанага праменьчыка, ні якога-колечы ўспаміну ад незвычайнасці не асталося ў зубрыных рагах. А чорныя хмарыны ападалі ўсё ніжэй і ніжэй. Прысаджваліся на дах магістрата, на паштовыя будынкі, разгортваліся па тварах людзей, кандэнсаваліся ў вачах сакратара. І бы праз чорнае шкло ён бачыў заўтрашні дзень. Адчуваючы халодны, сыры подых будучыні, малады сакратар зрабіў крок назад, потым яшчэ адзін і яшчэ, аж апынуўся ў бяспечных абдымках кабінета. Глянуў на тэлефон, з агідай падумаў пра вучоных канструктараў, што прыдумалі такую тэхніку, абвёў вачыма абвешаную партрэтамі сцяну. Фізіяномія Яўхіма Гаворкі, заўжды задумлівая і сур'ёзная, зараз расцвітала ўсмешкай на ўвесь пратэз. А можа сакратару тое проста ўявілася? Ляснуў дзвярыма з усяе сілы – няхай сарвецца той Яўхім, няхай праваліцца ў бяздонную прорву!

Чорным ходам сакратар збег з магістрата, сеў на машыну і ад'ехаў.

– Панове, прапусціце. Гэта мой зубр. Мой, – малы, дзесяцігадовы хлапчук, разгартаючы пінжакі і сукні, выбіваўся з перыферыйных раёнаў натоўпу. У руках хлопца паблісквала бляшаная баначка. – Я першы знайшоў яго, учора вечарам. І нават, о, глядзіце, гэтай во фарбай рогі памаляваў.

Апынуўшыся побач з зубром, хлопчык працягнуў руку. Залатая стужка спрэю мільганула ў паветры, сыпанулася на рогі бліскучым золатам. Але дождж ішоў ужо густы і моцны, і золата вокамгненна сплывала ў траву. Хлопец паўтарыў аперацыю, затым яшчэ раз, але вынік быў ранейшым. І ад бяздраднасці ён развёў рукамі.

– Будзе лепшае надвор'е, памалюю яшчэ раз. Зараз не атрымаецца. Фарба кепская – даждж баіц-

ца, – вінавата ўсміхаючыся, зрабіў крок назад і знік у натоўпе.

Зусім блізка ляснуў з неба пярун, агнявым асколкам забіўся ў фабрычны комін. Агартаючы галовы парасонамі, хустачкамі, пластмасавымі пакетамі, народ хістануўся, пайшоў хто куды, урассыпную. І з гэтага своеасаблівага поля бою кожны выносіў сваё. Хто бліскучыя ордэны, хто балючыя шрамы, а яшчэ хто – звычайны сорам.

Кастусь Шыла назіраў за ходам чаравікаў і думаў пра коўзкі асфальт – ці не стане ён прычынай для яшчэ больш цікавага спектакля. Яўхім Гаворка крочыў з горда ўзнятай галавой: рассакрэціліся цяпер канчаткова мазня і тампак сучаснай палітыкі.

Бомба трушком спяшаўся за айцом Рыгорам і абураўся: чаму адпаведныя службы не займаюцца зараз засранцамі – абмазваюць жа каляровымі спрэямі ўсё, што трапіць пад руку – сцены, вокны, нават зубрыныя рогі. Айцец Рыгор праслаўляў у думках вышэйшую сілу – з яе гэта падтрымкай пазбеглася вандроўка ў далёкія рэгіёны нашай прыгожай краіны.

А ананімныя героі гэтай гісторыі, мабыць, звычайна думалі – нічога тут не было, нічога не будзе.

Здавалася, мястэчка памірылася з лёсам, пайшло па сваіх рэйках. Дзень памаленьку ўладкоўваўся ў шэрую гадзіну, калі з гэтага паўсвятла паказалася шэсце. Дакладна – азвалася голасам гармоніка. „Wyklęty powstań ludu ziemi” – знаёмай мелодыяй разгортваўся пакуль яшчэ нябачны мех гармоніка. І ўсе чорныя вароны, што звычайна прысаджваюцца ў ліпавым галлі, падняліся ў сырое неба, закружылі, замітусіліся.

А потым гармонік прыціх і раптоўна азваўся “кацюшай”. Адгаманіў зваротку, прыпеў, зручна пераліўся ў душашчыпацельнае “ах судзьба мая судзь-

ба” і нечакана вярнуўся да пралетарскага гімна. А калі шэсце павярнула з Пілсудскага ў Трэцямайскую, гармонік заходзіўся “першай брыгадай”.

Шэсце было з дваццаці асоб і кожная асоба сціскала ў руках свой сцяг. І былі там сцягі ці не ўсяго свету, ці не ўсіх палітычных партыяў, ці не ўсіх ідэалогіяў, што валодалі людзьмі ў далёкай або і блізкай мінуўшчыне. Чырвоныя і бела-чырвоныя, блакітныя і зялёныя, чырвона-зялёныя і бела-чырвона-белы.

“ПЕРАКАВАЦЬ ЗОЛАТА Ў СУП” – чорнымі літарамі на зялёным фоне выцвітаў ці не супольны для ўсіх пяцімятровай даўжыні транспарант.

Калі б не асоба Сакалюка, які крочыў саноўна на чале шэсця, можна было б падумаць – вось Персефона, у рэшце рэшт, вызвалілася з зімовых кайданоў ды разгортвае над мястэчкам свае каляровыя далоні.

Але шэсце было ад Сакалюка. Гадзінай раней, калі ўдарыў у мястэчка гучны пярун, Агафон Сакалюк пралупіў вочы. Услед за перуном азваўся і тэлефон.

– Зубр? З рагамі залатымі? Побач з магістратам? – ад кожнага слова, сказанага трубкай, вочы Агафона Сакалюка закругляліся, заходзілі здзіўленнем, здзіўленне пералівалася ў задуму, задума ў злосць. “Вось табе і ўлада! Вось табе і абранцы народныя! Народ галадае, а яны золатам абвешваюцца! Дашчэнту звар’яцелі, нават жывёліне не даруюць. Даволі ўжо”. Так падумаў Агафон Сакалюк. Ад жалю і бездапаможнай роспачы яму хацелася плакаць. Але Сакалюк быў мужчына моцны. Абцёр слязу, адклаў трубку, пляснуў кулаком у стол і, зацiскаючы зубы, прахрыпеў: “Даволі! Час склікаць дружыну”.

Заварочаўся між столікаў, спатыкнуўся аб крэс-

ла, адбіўся рыкашэтам ад прылаўка і паляцеў назад, аблакаціўся на тэлефонны апарат. “Спакойна, Сакалюк, спакойна. Не ўсё яшчэ страчана”, – прыпыніў сам сябе. Набраў адзін нумар, другі, трэці...

І неўзабаве дружына з дваццаці асоб прычаліла да магістрата, дзе было ціха і бязлюдна. Натоўп знік, адно тры маладыя гарцэры ўсё яшчэ выпаўнялі сваю функцыю. Дождж спыніўся і гарцэры знайшлі сабе другі занятак. Поўзаючы на каленях, самы маленькі зрываў маладзенькую красавіцкую траву. Перадаваў яе крыху большаму, той згортваў траву ў спраўныя букеты і аддаваў самаму вялікаму, ці не камандзіру тройкі. Самы вялікі гарцэр, прысеўшы на кукішкі, падсоўваў букет пад натапыраныя зубрыныя ноздры. І кудлатая зяпа хісталася мана-тоннай, лянівай жуйкай.

– Дзе рогі залатыя? – прадчуванне злога абліло Сакалюка халодным потам.

– Маю гонар далажыць – няма залатых рогаў, – самы старэйшы гарцэр падарваўся на ногі, выструніўся, прыкладаючы два пальцы да брыля шапкі, глядзеў у вочы Сакалюку. Той не зразумеў.

– Што няма? Як няма?

– З адказнасцю заяўляю – дождж абмыў. Такі ліўны пайшоў, усё дашчэнту выпаласкаў. О, глядзіце, – сыходзячы са службовай пазіцыі, гарцэр зноўку прысеў на кукішкі. – Тут можа дзе якая кропля і асталася.

Побач з гарцэрам упаў на калені і Сакалюк. І зараз чатыры рукі пабеглі ў траву. Абмацвалі яе, разгарталі, рвалі з карэннем. Авалодала Сакалюком адно-адзінае жаданне, адна мроя – адшукаць у траве – хай сабе самую маленькую, хай сабе самую крывалапую залатую кропельку ды перакаваць яе ў талерку з гарохавым супам. Але на пальцах аставалася адно красавіцкая сырасць.

– Няма? Вядома, што тут няма. І вядома, дзе яно зараз ёсць, – выкрэсліваючы каленямі фантастычныя зігзагі, можа сабе, можа згуртаванай побач дружыне, а хутчэй за ўсё магістрацкім вокнам кіраваў гэтыя словы Агафон Сакалюк. – Золата саскрэблі, фарбай пamалявалі і на табе, дурны народ. Глядзі, цеш вока і каўкай сліну.

А за спіною моўчкі стаяла дружына. Чатыры дзесяткі вачэй напружана ўзіраліся ў мітусню Сакалюковых пальцаў. Але пальцы вярталіся з нічым. І з кожным такім вяртаннем, з кожным беспаспяховым жэстам наводзіўся смутак на твары людзей. Іх галовы апускаліся ніжэй, за галовамі, складаючы крылы, ціхлі і ніякавелі харугвы і штандары.

Здагадваючыся аб агульным настроі, прадчуваючы няўхільнае падзенне баявога духу, Агафон Сакалюк узняўся на ногі. Рашучым жэстам адбіўся ад леташняй сухой травы, што прыліпла да нагавіц, сплюнуў.

– Мегафон. Давайце мегафон, – замітусіўся залішне, бо нейкая чуйная рука ўжо пад’язджала з тэхнікай. Прыхапіў інструмент, нацэліў у вокны магістрата. Думкі разляцеліся кожная ў свой бок, рассыпаліся бы спалоханыя птушкі. Стараўся згарнуць іх, вярнуць назад, пасадзіць на ранейшае месца.

Вельмі важнае ў такіх выпадках першае слова.

– Miałeś chamie złoty róg, – запамятанай са школьных гадоў фразай праграмеў мегафон.

– І дзе ён? І дзе ён? – дваццаткай горлаў адгукнулася дружына, а мегафон і на гэтае пытанне адразу даваў адказ:

– Няма. Прагулялі ўсё, прамантачылі, прапіз... – Месца было ўсё-такі публічнае і апошняе слова ён затрымаў у добры час.

– Прагулялі, прамантачылі, прапіз... – дружына

пайшла ў раней прыадкрытую фортачку. Пайшла лёгка, навобмацкі, імпульсіўна, хоць горлы не ўсе паспелі спыніцца і слова прагучала з першай да апошняй літары.

Настрой уздымаўся. Узняліся галовы і харугвы, узнялася і рука Агафона Сакалюка. Левая ўсё яшчэ заціскала прыткнёны да вуснаў мегафон, а правая – напружаная, звязаная ў магутны кулак, быццам ствол процітанкавай гарматы, пацягнулася да магістрацкіх вакон.

– Браты, панове, таварышы! Даволі! – з узлётам харугваў мегафон набіраў новую моц.

– Даволі, – згодна падтакнула дваццацігалоссе.

– Ура! Ура! Ура! – падбадзёраны калектыўнай магутнасцю сваіх шарэнгаў, Агафон Сакалюк праграмеў трыма сальвамі і ў гонар кожнаму "ура" зрабіў адзін крок у напрамку магістрата. Але зараз водгук з-за спіны атрымаўся не зусім камплектны. Папраўдзе, не больш за тры, чатыры галасы далі чаканы адказ. І чацвёрты крок Сакалюк не зрабіў. Спыніўся, павярнуўся тварам да дружыны. Усе дваццаць фігур застылі на ранейшых пазіцыях.

Гледзячы на тыя фігуры, ён пачаў здагадвацца – ніякая рэвалюцыя тут ні сёння, ні заўтра не атрымаецца. Але здагадка не была новаю. Ці раз або два намагаўся падарваць, скалыхнуць гэты прыімшэлы камень? Дзесяткі разоў. Зрабілася Сакалюку і крыўдна, і кепска. Як заўжды, калі аддае сябе чалавек поўнасцю вышэйшым мэтам, агульным справам, змаганню за лепшае заўтра другіх, а ўзамен атрымоўвае пякучую фігу. Усё-такі кожную пазіцыю, кожнае поле бою пакідаць трэба з гонарам і з горда ўзнятай галавой. Гэта абнадзейвае на будучыню. І галава Сакалюка ўзнялася вышэй.

– Мы яшчэ вернемся сюды, – пагрозлівым жэстам вышэй галавы ўзляцеў магутны кулак.

– Мы яшчэ вернемся сюды, – згодным строем пашыбавалі ў магістрацкія вокны і астатнія кулакі.

А вокны глядзелі на гэтую дэманстрацыю халоднымі мёртвымі зрэнкамі. Ні жывой душы не было ўжо ў магістраце. Усе чыноўнікі пайшлі дадому.

Агафон Сакалюк адступіў крок назад, павярнуўся спіной да магістрацкай сцяны і таксама пайшоў. Следам рушыла і дружына. Перакінуўшы за плячо каляровыя харугвы, яны ішлі ў маленькі рэстаранчык, дзе за лепшым часам згуртуюцца ўсе жыхары нашай планеты – чорныя, белыя і жоўтыя, каталікі, праваслаўныя і мусульмане.

KAMUNIKAT.org

# Кандыдат

Памёр наш Адам Антонавіч Падробка. Сышоў на вечны спачын неспадзявана, не паспеўшы папярэдзіць аб сваіх намерах ні жонку, ні пляменнікаў, ні – што самае балючае – нас, сваіх супрацоўнікаў. Вечных, вядома, няма, аднак сыходзячы са сцэны жыцця (асабліва, калі тая сцэна нера-зрыўна звязана з палітычнай трыбунай), недас-таткова заплюшчыць вочы, легчы ў дамавіну ды спусціць дух. Трэба падумаць і пра тых, каму ў гарачы час выбарчай кампаніі не пашчэнсціла даць драла. А не пашчэнсціла нам.

І вось сядзім у маленькім пакойчыку, курым у шчырай задумёнасці і глыбокімі ўздыхамі адганяем ад сябе і чорны сум, і бэжавы цыгарэтны дым. З афішаў, аддрукаваных загадзя, спаглядаюць на нас пранізлівыя вочы Адама Антонавіча, а ягоныя вусны, заўжды гаваркія, цяжарныя абяцаннямі і пахваламі, сёння маўчыць, як той банальны прыдарожны камень. І здаецца – няпраўда ўсё. Не на той свет аддаліўся Адам Антонавіч, а звычайна – пайшоў у кіёск за газетамі, за цыгарэтамі, і неўзабаве на каменным паркеце пачуюцца знаёмыя крокі, адчыняцца дзверы ды ўсё вернецца на старую каляіну.

А можа, як добры і чуллівы бацька падчас нядзельнай гульні ў лесе, пажартаваў з нас, прыхаваўся між тоўстых соснаў і сочыць адтуль за нашымі крокамі, правярае нашу кемлівасць і спрыт?

Маўчаць, аднак, паркеты, не адчыняюцца дзверы, а замест Адама Антонавіча метафізічнымі шчылінамі скрозь сцены і скрозь падлогу прасочваецца непазбежная рэальнасць.

– Прыгожы быў мужчына, – пацягнула носам Алёна і выцерла заплаканыя вочы, каб нам, заскарузлым у панцыры ўяўнай мужчынскай абыякавасці, паказаць свой жаноцкі, звычаямі і законамі несапсуты боль. Нам і без бабскага стогну дастаткова балюча, а ўжо пачуўшы сакраментальнае “быў”, якому няма ніякай альтэрнатывы, якое немагчыма адмяніць ні сеймавай, ні ўрадавай пастановай, той-сёй, адкінуўшы ўбок правілы добрага тону і няпісаныя мужчынскія законы, горка заплакаў.

– І за каго галасаваць цяперака? – у фальцэтах стогнаў і енкаў бас Віктара Раманавіча прагучаў быццам грубая прафанацыя.

У першы момант я нават падумаў, што трэба супрацьставіцца гэтаму грубіянству, шукаў ужо адпаведныя словы, калі раптам мне прыйшло на думку і іншае: смерць ёсць смерць, хай сабе і належыцца ёй пашана, а ўсё-такі жывым трэба жыць ды заплямбоўваць такія, як хаця б пасля Антонавіча, дзіры.

– Мы заўжды за Адама, – перамагаючы пахліпванне, азваўся Яська Румянюк.

Яська не быў скамплікаваны чалавек. Наогул ён маўчаў, а калі ўжо і даводзілася яму ўзяць слова, паўтараў тое, пра што ўсе добра ведалі.

Прычыны, па якіх мы дапускалі Яську ў кампанію, былі дзве. Па-першае, ён нікому не перашкаджаў. Як пасадзілі яго ў маладосці за сталом старшыні прафсаюза, так і прыліп там па сённяшні дзень. Па-другое, добра танчыў ды як ніхто ў свеце прыкідваўся пеўнем. Сёння, аднак, наш час поўніцца жалем. У ходзе сустрэчы не прадугледжваюцца

ні танцы, ні хіхіканне, ні кукарэканне. Прабач, Яська, табе застаецца адно: забіцца ў кут ды маўчаць нібы тая – з поўнай павагай – Антонавіча магіла.

– На маю думку, – Пятро Уладзіміравіч падняўся з крэсла, дастаў з кішэні дробным макам запоўнены аркуш, з другое кішэні выцягнуў акуляры, пасадзіў іх на нос і вярнуўся да першага слова. – На маю думку, пара было б кінуць на глыбокую ваду, – ён павёў вачыма па аўдыторыі, – адсутнага тут Ігара Рыгоравіча. Малады ён, здольны. А, як ведаеце, сярэдняга ўзросту ў нашых шарэнгах балюча павялічваецца. Ігар Рыгоравіч...

– А каму ён вядомы, гэты твой Ігар, – выскачыў з месца Раманавіч. – Мне, табе і, пэўна, Алёне. А можа найперш – Алёне, – удакладніў.

Назваць гэтае выступленне дыпламатычным было б крыўдай для дыпламатыі. У малым мястэчку ўсе пра іншых ведаюць якраз тое, чаго ведаць не трэба, аднак не ўсе гэтымі ведамі карыстаюцца пры кожнай нагодзе. Праўда, паўтараюць сёе-тое ціш-ком, з вуха на вуха, але ніколі ж публічна. Не, з такімі штучкамі нават Яська Румянюк не выскоквае.

– Які прыгожы мужчына быў, – загаласіла Алёна. Цяпер яе плач не быў ужо такім шчырым, бескарыслівым, выкліканым патрэбай душы. Ёй хацелася зняць з сябе непатрэбную ўвагу ды накіраваць яе на агульнавядомую асобу. – Быў і няма.

– Няма і не будзе, – рашучым тонам закончыў хаўтуры Раманавіч. – А цяпер трэба шукаць кандыдатаў. І калі так, тады ў распараджэнне шаноўных калег стаўлю сваю сціплую асобу. Магу прыняць на сваю спіну першы ўдар ды адкрыць сваім прозвішчам наш партыйны спісак.

Шаноўныя калегі павялі наўкола крышку разгубленымі позіркамі. Была ж нагода хвіліну раней пазнаёміцца з дыпламатычнымі здольнасцямі Віктa-

ра Раманавіча і, праўду сказаўшы, ацэнка атрымалася не надта высокай. Аказваецца, дзесяцігоддзямі сябруеш з чалавекам, ды так і не здагадваешся, што сядзіць у ягоных вантробах. Хто і калі падумаў, што Віктару мроіцца ўзняцца на вяршыні нашай мясцовай палітыкі? Пэўна ж, ніхто! А сітуацыя – нязручная, каб не сказаць – зусім дурная. Падняцца і запярэчыць? Так звычайна, парваўшы ўсе ранейшыя сувязі, сказаць: не, Віктар! Хто як хто, а ты вось – не!

Адам Антонавіч зірыць на нас з партрэтаў і ўсміхаецца іранічна: хі-хі-ха, шукайце, шукайце лепшых за мяне...

Проста сказаць – шукайце, а злётаўшы туды і назад у доўгія шарэнгі прозвішчаў, пералістаўшы ўсе спіскі, аказваецца, няма там сапраўдных кандыдатаў.

І тады голас узяў Асіп Паўлавіч. Той Асіп, якому не раз даводзілася выпаўняць няўдзячную функцыю апошняга апірышча, апошняй надзеі. Асіп, якога апаненты называлі хамелеонам, а мы хвалілі за гнуткі хрыбет, свежы погляд і адкрытую думку.

– Шаноўныя калегі. У нашым палажэнні ўсё-такі найлепшы кандыдат – Адам Антонавіч. Я ведаю, што хочаце сказаць, – ён рашучым жэстам у зародку пагасіў нашае здзіўленне. – Хочаце сказаць: Адама ж няма. А вось я скажу вам так: ёсць наш Адам. Бо хто ён, Адам Антонавіч? Антонавіч – легенда нашай зямлі. Несмяротны яе міф. Так, так, дарагія сябры. Не-смя-рот-ны! Бо міфы і легенды не паміраюць так сабе, раптоўна, адразу. Хай сабе і адышло ў нябыт вядомае, дарагое нам цела. Няхай. Пярэчыць дарма. Аднак, аказваецца, побач з целам ёсць таксама і душа. Доўга ішлі мы да гэтай праўды, але ж дайшлі. І можам зараз сказаць адкрыта: душа ёсць. І несмяротная душа Адама Антонавіча таксама

з намі. Тут і зараз.

Пры гэтых словах той-сёй аглянуўся крадком, быццам шукаючы нейкі доказ іншаземнаму існаванню чалавечай матэрыі. Аднак у непарушанай і сумнай прасторы гучаў адно голас Асіпа Паўлавіча:

– Суродзічы дарагія! Адам Антонавіч – наша надзея. Мая, твая, усіх нас спадзеў на лепшую будучыню. І трэба быць бяздушным, халодным прахвостам, каб адабраць у нашых людзей апошняе, што ў іх засталося, менавіта – надзею. Я, дарагія сябры, моцна здзіўляюся, што некаторыя з нас спрабуюць скарыстаць асобу Адама Антонавіча для сваіх прыватных мэтаў. Вылузацца ўверх, вышпарыцца наперад на ягонай, уяўна мёртвай спіне.

Асіп Паўлавіч не чытаў з лістка, ён – звычайна прамаўляў. Засунуўшы левую руку ў кішэню, правую зацiскаў у кулак і час ад часу гэтым кулаком забіваў у зялёнае сукно якое важнае слова, важкі сказ. Падабалася нам такая элегантная свабода амерыканскага менеджэра, скрыжаваная з самаўпэўненасцю савецкага камісара. З кожным словам, з кожным ударам кулака расшыралася і паглыблялася прорва паміж Адамам Антонавічам і тымі кандыдатамі, якіх у сваёй наіўнасці бачылі мы на перадавых пазіцыях спіскаў. Яшчэ слова, яшчэ сказ, яшчэ ўдар кулака ў зялёнае сукно і ў полі бою застаўся адзін кандыдат – Адам Антонавіч Падробка.

***

На выбарах Адам Антонавіч перамог. Галасоў – асабліва ў правінцыі – набраў столькі, што хапіла іх, каб засекчыся ў сеймавыя дэпутаты і Асіпу Паўлавічу, і Пятру Уладзіміравічу, і мне.

Па суботах, адвячоркамі, калі сціхае сеймавая калатнеча, калі палітычны гоман аддае перавагу звычайным чалавечым роздумам, падымаем за

здароўе Адама Антонавіча чарку каньяку. Другую выпіваем за саміх сябе, а трэцюю – за ўсе міфы і легенды, без якіх народы знікаюць у чорнай прорве гісторыі.

KAMUNIKAT.org

# Вош

У нядзелю раніцай, прыводзячы ў парадак сваю густую прычоску, начальнік Гікала напароўся на абсалютна жывую вош. Засеў якраз за пісьмовы стол, разгарнуў чыстыя карткі паперы, між папераў абсталяваў кубак чорнай кавы. І горкі, прыпалены водар лашчыўся аб начальніцкія ноздры, пранікаў у начальніцкае нутро бязмежным шчасцем ды такой жа асалодай. Яшчэ толькі страўнік чвякануў раніш-няй яечняй і начальніку стала хораша. Значыць, можна было даць пачатак даўно, гадоў ці не пяць, абмяркоўваемым успамінам. Было ж поспехаў ды подзвігаў. Усё, чаго захочаш, было. І усё тое, як ні глядзі, трэба давесці да ведама наступных пакален-няў. Усе тыя дні, загружаныя сумненнямі і супярэчлівымі думкамі, хмурныя і чорныя, зараз, з перспектывы часу, бачыш зусім іначай. Стаяць, бы на далоні, светлымі фарбамі. Ні воблака там, ні хмурынкі. Гісторыя – адзіны справядлівы і непад-купны суддзя. Усё астатняе не мае значэння. Закіды скептыкаў, нараканні буркуноў – дзе яны зараз?

З такімі думкамі начальнік апусціўся ў крэсла. І ў той момант, калі яго дупа намацала мяккую апору, адурманеныя шматгадоваю звычкай, апошнія фраг-менты цела здрадзілі. Бо трэба вам ведаць, у на-чальніка Гікалы быў такі маленькі, няшкодны на-вык, у далёкай маладосці метадам капіравання прыжыты ад старшыні павятовай партыйнай

арганізацыі Антося Куца, косць ад косці варшаўскага хлопца, які, ніхто не ведае чаму, адразу пасля ваеннай завірухі, апынуўся ў заняпадлай ды зусім несвядомай правінцыі. Сеўшы за які-небудзь стол, Антось, можна сказаць, інстынктыўна заглыбляўся ў кішэню, даставаў грэбень і прыгладжваў прычоску. Штосьці элегантнае і экзатычнае было ў гэтым прыгладжванні. А затым падымаўся на ногі, стаяў хвіліну з высока ўзнятай галавой, позіркам абмацваў залу. І калі знікаў апошні шэпт, яшчэ раз прыгладзіўшы чупрыну, зараз ужо толькі раскірэчанымі пальцамі, кідаў у натоўп першае слова. Затым чарговае і яшчэ сотню слоў, і тысячу, і дзесятак тысяч. Мужчыны слухалі, а ў жанчын разгараліся вочы.

Па інерцыі, кранутая далёкім успамінам, і цяпер рука начальніка Гікалы пашыбавала ў кішэню пінжака, адшукала там стары, блакітненькі грэбень, пакаўзнулася па мяккасці чупрыны. Штосьці невялічкае шлёпнула на беззаганную бель паперы. Зноў танцуюць на чацвёртым, падумаў начальнік і задраў галаву. Падумаў правільна, бо шматсямейнае будаўніцтва наогул не за ахову інтымнасці. І калі на суседнім паверсе твае добрыя суседзі ўголас праводзяць звычаёвы абмен думкамі, хочаш ці не, іхнія эмоцыі распаўзаюцца на ўвесь блок. А часам каго-небудзь наведвае ахвота заняцца танцамі, і тады столь у тваім самым вялікім пакоі асыпаецца белымі пялёсткамі вапны. „Сёння ж першы тыдзень посту, а яны вось чым займаюцца, танцамі”. Але на чацвёртым не танцавалі. І начальніцкае вока, злётаўшы туды і назад, прызямлілася на пісьмовым стале. На паперы, якая так і не паспела запоўніцца гераічнымі ўчынкамі, прысеўшы на кукішках, чарнява-рыжая істота разглядала сваё новае становішча.

“Далібог, гэта ж...” Начальнік Гікала засунуў на нос акуляры, асцярожна, каб не стрэсці няпрошаную госцю ў бязмежныя калідоры дывана, падняў паперу, прыблізіў яе да вока.

– Ты хто будзеш? – перапытаў, стрымліваючы дыханне.

– Вош, – адказала яна.

– Як гэта – вош? Якая вош? Чыя?

– А нармальная. Спакон вякоў родная-народная, твая. Забыў жа, га? – Узнялася на заднія ножкі, быццам для паўнейшай прэзентацыі сваёй, някепска адкормленай фігуры.

– Ды як жа, – сканфузіўся начальнік. – Чаўпеш ты. Дурное што-та. Мы ж вас...– Указальным пальцам аб’ехаў кадык, вобразна адмаляваўшы тое, што яны зрабілі з адвечнымі паразітамі.

– Вось табе, на! – узяўшыся пад бокі, раскірэчылася вош у цэнтральным пункце снежнай паперы. – А я быццам што? Прывід хіба ж нейкі? Ілюзія? Не такая простая справа, пазбыцца нас. Думаў – памыўся, пабрыўся, чыстыя кальсоны апрануў і ўжо на другі свет выправіўся?!

Фігура на паперы, сапраўды, стаяла рэальная, фізічная, ўздоўж яе глядзі, упоперак. Як толькі захочаш. І начальнік збялеў.

– Значыць, што? Заўсёды ты...

Прадоўжыць пытанне ён пабаяўся.

– А заўсёды, каб ведаў, – адказ быў упэўнены і бесцырымонны.

– Нават...

– А як жа, нават там, у начальніцкім кабінеце разам мы з табою, удваіх мы, – адказ прыйшоў раней, чым прагучала пытанне.

– І нават...

– І ў Варшаву я з табой ездзіла, у тыя міністэрскія пакоі, і ў Кракаў. І не падумаў нават – і ў гэтай

палюбоўніцы, памятаеш? Адвячоркамі забягала ў кабінет – там мы таксама разам.

– Адкуль ты ведаеш, пра што я, – пачаў начальнік, але скончыць слова і на гэты раз яму не далі.

– Нармальна. Я твая, косць ад косці, кроў ад крыві, – вош выскалілася ў зубатай усмешцы. – Перш за ўсё ад крыві тваёй я, таму і ўсе твае думкі ведаю. Га-га-га.

Смяялася. А начальніку было зусім нясмешна. Усе мінулыя дні зараз вярталіся на памяць, раскладаліся ў паасобныя хвіліны, абразкі, словы. Прыпомніўся міністэрскі кабінет, доўгая шарэнга начальнікаў з усяе краіны. І ўсе, бы струна, і ўсе выпінаюць грудзі, і залатымі крыжамі прызямляецца на тыя грудзі рука пана міністра. А ён, Гікала, як і другія. Як і другія? Як жа, калі з гэтай вось, між вушамі... А міністр – бачыў усё? Усё ведаў? Мабыць, так. Дзіўна ж неяк усміхаўся, зазіраючы ў вочы. І па плячу – усіх апошніх палопаў, а яго, Гікалу – не. Мабыць, пабаяўся... А Соня? – Раптоўная думка ашарашыла начальніка. Былі ж у іх з Соняй хвіліны своеасаблівыя, інтымныя, калі не астаецца між людзьмі нават самая сціплая, самая сарамлівая занавеска... Соня. Ніколі і словам не заікнулася, што нешта не так. Але ж пайшла аднойчы за гэтым варшаўскім Антосем і ніколі ўжо не вярнулася ў мястэчка...

– Ведалі яны? – прыхоўваючы вочы, спытаў начальнік. Яму было сорамна і нязручна. Падумаў бы хто – давядзецца ў жыцці заводзіць гутарку з такой агідай. Але цікавасць была мацнейшая за ўсё астатняе, і ён спытаў. І вош адказала. І толькі ад болю, які ў такім выпадку супольны для дваіх, яе голас памякчэў, набраў мяккасці і лагоднасці.

– Я табе ніколі не здрадзіла. Ніколі. Усё, што бачыла, усё, што чула – як камень у ваду. Магіла. І

ніколі не здраджу, нават тыя ўспаміны, што збіраешся пісаць, выпраўляць не думаю. Што захочаш, тое і пішы.

Але пісаць начальніку ўжо не хацелася.

KAMUNIKAT.org

# Знічка

З цэнтральных раёнаў неба, ад Млечнага Шляху апускаецца знічка. Мільёны зор стаяць у знерухамелым сне і толькі яна абудзілася ды ляціць светлым, радасным полымем насустрач няўхільнаму знікненню. Здаецца, не страшны той нябыт, не мае значэння, калі на адну хвіліну, на адзін міг засяроджваеш, згартаеш на сябе позірк і ўвагу ўсяго сусвету.

Лёт знічкі звязвае бязмежны космас з панадворкам, што на прадмесці мястэчка. Панадворак малы, квадратны, трыццаць метраў на трыццаць. У іншыя дні маўклівы, закінуты ў сонную дрымоту, сёння запрашае да сябе ўсю вуліцу.

Прыйшоў Коля, раней чыгуначнік, зараз на пенсіі, прыйшоў Андрэйка – той, які ў лепшы свой час ведаў, як мёртвы кавалак драўніны пераўвасобіць у жывое крэсла або багаты стол. Ёсць і міліцыянер на пенсіі Чарнейка.

– Во, глядзіце, – Колька праводзіць позіркам знічку за мяжу далягляду. – Ці не наш Сенька абарваўся.

Вочы слухмяна ўзводзяцца ў вечаровае неба, на адну хвіліну спыняецца гутарка.

– Э, – скептычна хрыпіць у паўсвятле чыйсьці голас. – Напэўна хто другі. Сенька ж раніцой... Зараз, пэўна, на месцы ўжо ён, дзе трэба.

Але пан Сенька поўнасцю не дабрыў яшчэ да

месца прызначэння. У хаце за жоўтымі вокнамі хістаецца полымя грамнічнай свечкі, наўкол бабы-суседкі расселіся, заводзяць жалобныя песні. Час ад часу блытаюцца іх галасы, тая-другая нотка азываецца фальшам. Ну, нічога ўсё. Не ад сэрца ж і не ад душы такія дысанансы. Нараджаюцца ў гартані, у галасавых струнах, як вынік вялікага старання за заземскі поспех пана Сенькі.

Бабы заўсёды так спяваюць. Ці не трыста пакаленняў ужо. І калі слухаеш іх, калі паглыбляешся ў сумныя літаніі, так і здаецца: усё будзе добра, куды трэба накіруюць пана Сеньку. Але пакуль што ён яшчэ ляжыць між бабамі і грамнічнай свечкай і чакае.

А на вуліцы мужчыны заступаюцца за пана Сеньку па-мужчынску.

Згуртаваўшыся ў грамаду, кураць, прыпальваючы чарговую папяросу ад папярэдняй. І ўсе добрыя ўчынкі, што з дзяцінства да ўчарашняга дня трапілася зрабіць нябожчыку, узлятаюць на крылах тытунёвага дыму. Адплываюць па-над садам, над бліжэйшымі домікамі і далей, у цэнтр мястэчка над сівымі блокамі, капулястымі цэрквамі, касцёлам, што белай вежай забіваецца ў раззоранае неба.

– А памятаеш, як шукалі той дуб? У семдзесят шостым у пушчы мы яго ўкралі, – струменіцца дым з-за зубоў чыгуначніка Колі.

– Ой там, зараз – ўкралі, – крывіцца Андрэйка. – Ссяклі на Вапавай трыбе, вялікая мецыя.

– Ну, ссяклі, – згаджаецца Коля. – А вось ляснічы – маленькі такі, тоўсценькі, Клёцкам яго зва-лі – а што ж бядняга набегаўся, напытаўся. Дуе вёскай, хмара гаёвых за спіною, па панадворках шныраць, у хлеўчыкі зазіраюць, у нужнікі запуска-юць вока, а дубіско ў мястэчку ўжо. На стаўпы парэзаны, фарбай намаляваны, стаіць вуструніўшы-ся ў маім

плоце – будавацца якраз пачаў. І зараз там ён. Нічуць не спарахнеў дуб.

– Прызнавацца, бо ўсіх пасаджу пад халеру, – вішчыць Клёцак. А Сенька ведаў, і бачыш ты – нікому не сказаў. А баяўся я – скажа. З сабакамі ж вадзіўся...

Апошнія словы сказаліся ненаўмысна, з-за звычайнай шчырасці.

– А што, міліцыянер, – выпадкова прымушаны адзываецца Чарнейка. – Горшы які гатунак, ці як? Чалавек, калі прыстойны ён, ад мундзіра хіба ж не псуецца.

Так больш-менш гамоняць, узгадваючы мінулыя гісторыі.

А між сказанага трымцяць словы прамоўчаныя, што не падыходзяць да абставін гэтага месца і здарэння. Пустыя, лішнія, як бутэлькі ў жоўтых півонях пад плотам.

Заядла тыя бутэлькі капіў пан Сенька. Старанліва чысціў ад пылу, здзіраў знішчаныя або спаленыя сонцам этыкеткі, абмываў у цёплай вадзе, глянцаваў фланельнымі анучкамі, аж пакажацца бляск, які малавопытны спецыяліст успрыме як фабрычны прадукт.

Адкуль такі клопат, спытаеце. Дык вось: займаўся пан Сенька продажам алкаголю невядомага паходжання. Хаця папраўдзе тут, на памежжы, і так кожны ведае радавод ягоны – прыязджае крадком, з-за ўсходняй мяжы, у пластмасавых мяшэчках, тут раздзяляецца на паасобныя пляшкі. У падвалах даюць яму шляхецтва і які захочаш смак. На кожную кішэню і густ.

– Вам *зубровачку?* А можа *Ельцын* або *Петроў*? Каньяк? Калі ласка, ёсць і каньяк. Ці не фальшывы ён? Ну, як жа фальшывы. У мяне арыгінальны тавар, усё ў краме купляецца. У краме, – за гэтыя сло-

вы кулак пана Сенькі тры разы забіваецца ў грудзі, туды, дзе за рэбрамі няспынна працуе сэрца – гарант чалавечай прыстойнасці.

Сіла ўгавору спрыяе гандлю. І яшчэ – давер. Не рэклама, як хочуць адукаваныя мужы. Рэклама адно нервуе, калі вылазіць з тэлевізара ў нечаканы момант.

А дарэчы, спрабаваў жа які адукаваны муж пусціць у народ адну хаця б пляшку рускай гарэлкі? Выстаяў вочы ў вочы з мясцовым кліентам? А ў кліента заўжды свая рацыя і ён канчаткова перакананы: хвілінка яшчэ, і стане ахвярай ашуканства.

Тады і пачынаюцца ўзаемныя хітрыкі, тупанне, паціранне рук, мацанне вачыма. І кулакі забіваюцца ў грудзі, аж грымяць рэбры. Ідэнтычна, бы на конскім базары.

Але ж коньмі пан Сенька ніколі не займаўся. Бо і на халеру зараз каму конь? Аформіць агарод за домікам? Аднаго ў мястэчку даволі. А пляшка – калі ласка, для радасці добрая і для смутку.

Вось і прадаваў пан Сенька такія пляшкі, запоўненыя ў падвале, між картопляў і скрынак буракоў, морквы, цыбулі. А ўсё сваё, не закінеш тут хіміяй.

Працоўны, рабацяшчы мясцовы народ. Такім нараджаецца і ўсё.

Тады адвячоркам або і апоўначы стукай у акно пана Сенькі. Адкрые.

– *Зуброўка? Ельцын?* А можа – *Петроў?*

Вось чаму і запаўняецца бляшаная баначка з-пад гарбаты. Ад кожнай дваццаткі палова трапляе якраз туды. Другая – адводзіцца на чарговую бутэльку спірту *раяль*. Час такі, рыначны. Хто не інвесціруе, ідзе ў адстаўку.

Але пан Сенька больш улюбёны ў першую дзесятку. Любіць яе асаблівым чынам, пяшчотна. Гладзіць бронзавую паперу, разглядае падабізну

князя Мешка, а ў вачах стаіць улюбёнае аблічча наймалодшага, Славічка.

Цяпер у Беластоку ён. І дай добры божа – няхай там астаецца. Адно неўдалоты вяртаюцца ў мястэчка, закончыўшы адукацыю. І прыдуркі. Ну, яшчэ ўсялякія сваякі мясцовага чыноўніцтва – ім і ў складаны час прыдбаецца які сэнсоўны занятак.

А Славічка забяспечыць трэба кватэрай – дзве тысячы злотых квадратны метр.

Колькі ж тады разоў трэба збегаць да бляшанкі з рукой, узброенай дзесяткай, каб неабмежаваную прастрань сціснуць у квадратны метр падлогі?

А усё проста, калі чалавек ведае, дзеля каго і чаго ён жыве.

Ды вось ужо пана Сенькі няма сярод жывых. Яшчэ раніцай, як і штодзённа, выйшоў на сходы, на вуліцу, накіраваўся ў краму. І зваліўся на тратуар. Дарма клікалі дапамогу.

– Але так зразу, з месца, – здзіўляецца міліцыянер на пенсіі Чарнейка. – За нашым часам не здаралася такое.

І пачынаюць ўспамінаць усіх, хто апошнім часам, і зусім нечакана, кульнуў на другі бок. Карагод адкрывае Яша, што памёр стоячы – у аўтобусе, у натоўпе. Затым ідзе Францік – у красавіку не падняўся з ночы, і ніхто не ведае чаму.

– Хімія і стрэс, – кажа Андрэйка.

Далей прыходзяць на памяць тыя, хто знік па тэхнічна-цывілізацыйных прычынах. Антошка, што знойдзенай на агародзе бліскучай цацкай ляснуў у ручку плуга, так ляснуў, што аж бэбухі на электрычныя драты ўзляцелі. Затым стаіць у чарзе Мішка – ладным куском жалеза пацэліла яго ў патыліцу незразумелая машына на фабрыцы. Ёсць яшчэ і Сяргей, які ўпісваецца ў першую ды ў другую катэгорыю. Ад інфаркту памёр, а хвілінай раней

паспеў яшчэ засадзіць швайку проста ў сэрца святочна-вялікоднага кабанчыка. Так і зваліліся смяротным дуэтам – чалавек і парсюк.

Пойдуць раніцай а полове дзевятай.

У хату пана Сенькі заходзілі не раз, не два разы. Вось і ведаюць, што там і як.

Напачатку трэба ўвайсці ў сенцы – шмат якія функцыі выпаўняюць яны – калідор, складзік лішніх трантаў. Затым будзе кухня – чвэрць яе запаўняе хлебная печ, што, дарэчы, па інерцыі, без канкрэтнай патрэбы зайшла сюды. Не аддзячыла ні адной буханкай хлеба. Ды як жа іначай, калі побач за плотам – спажывецкая крама, што працуе з раніцы да вечара, па будзённых і выхадных днях.

А наўкол печкі – дубовы паркет. Так і спрачаюцца між сабой:

– А ты, насенне мужыцкае, ты чаго тут?

– А калі б якая вайна, дык што, у крамік за хлебам злётаеш? А баба замесіць у дзежцы, на бляху пакладзе і ад голаду не загінуць нам.

Ёсць, значыць, кухонная печ гарантам сытасці ў нядобры час, да якога, як падказвае мястэчковы вопыт, добрыя дні адно гаманлівая падрыхтоўка..

З кухні адны дзверы выходзяць на маленькую спальню, другія – на гасцінны пакой. Там якраз і ляжыць пан Сенька.

Можна было, вядома, зняць месца у спецыялістаў, закінуць туды нябожчыка на апошнюю ноч, а з раніцы прыйшлі б смутныя хлопцы ў чорных пінжаках, у белых рукавічках, спраўна ўзялі б, што трэба ўзяць. Шмат хто зараз карыстаецца такімі выгодамі, асабліва жыхары шматпавярховых блокаў. Не трэба потым сціраць, прыбіраць, чысціць паркет.

Але на прадмесці ўсё іначай. З прадмесця адыходзяць у вечнасць, пераступаючы свой парог і на спіне лепшых суседзяў.

Чэрвеньскі Млечны Шлях апоўначы разгортваецца белай хусткай. Колькі гадзін і нябачна перальецца ў светласць раніцы.

Да світанку трэба было б здрамнуць, адпачыць. А восьмай прыйдзе бацюшка.

Суседскі іх абавязак – адправіць пана Сеньку ў апошні шлях.

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

# Дом

На гэтай вулачцы ўсе дамы нараджаліся ў адзін час і цяпер, узаемна пераклікаючыся, салідарна адступалі ў нябыт. Спачатку зніклі маленькія, драўляныя домікі. Затым пайшлі следам большыя, двухпавярховыя, мураваныя. Наш дом быў самы вялікі і аднае раніцы застаўся са свайго пакалення адзін. Застаўся, бы правадыр заваёванага чужынцамі племя – на радасць турыстаў і славу сённяшніх валадароў.

А наўкол выраслі ўжо новыя будынкі – чыстыя, элегантныя, светлыя вялікімі вокнамі.

Думалі разбурыць яго. Быў стары і неахайны, колькі год назад апошнія кватаранты закрылі за сабою дзверы. Потым жэўжыкі знялі іх і закінулі побач са сцяной, у высокую крапіву. Яшчэ пазней невядомыя рукі пазбавілі яго вокнаў.

Год, можа, два стаяў так, узіраючыся ў тратуар сляпымі зрэнкамі, абдзёртыя, абшастаныя сцены надавалі яму выгляд жабрака. І людзі міжвольна пачалі абмінаць гэты дом шырокім колам, пераходзілі на другі бок вуліцы. Бо людзі заўсёды абмінаюць жабракоў, ступаюць на супрацьлеглы тратуар, а калі з-за сваёй няўвагі здараецца ім сутыкнуцца твар у твар з такім асобенем, тады адводзяць вочы абы-куды або пільна ўзіраюцца ў насы сваіх чаравікаў.

Аднае восені сышлася высокая камісія. Запус-

калі вока ў чорныя вокны, кружылі наўкол сценаў, тузалі іх кулакамі, абштурхоўвалі малаткамі, а сцены адгукаліся глухім, мёртвым голасам. І эксперты сумна ківалі галовамі, спазіралі адзін на другога, разводзілі рукамі, як сумуюць і разводзяць рукі лекары над смяротна хворым пацыентам.

“Што ж, адно бульдозер тут”, – можна было здагадацца па іхніх позірках і жэстах.

Дом выратавала зіма. Прыйшла рана, як ніколі, засыпала снегам усе мястэчковыя бульдозеры, закавала іх у халодныя кайданы.

Часам варта выстаяць, перачакаць яшчэ адну зіму. Нават тады, калі вясна ўяўляецца як адлеглы, недасягальны бераг.

З вясною прыйшлі ў дом другія спецыялісты. Таксама зазіралі ў сляпыя вокны, хадзілі наўкол сценаў, абмацвалі іх, але іначай – пяшчотна, ласкава краналі пальцамі прыімшэлы тынк. Шукалі прыгажосці ў старых мурах і знайшлі яе. Бо чалавек, калі моцна стараецца, знаходзіць тое, што шукае.

“Будзем рамантаваць”, – можна было здагадацца па іхніх позірках і жэстах. А напрыканцы вясны дом абступілі страхары, столяры, тынкары. Дзіравы дах апранулі ў бліскучую бляху, замацавалі новыя дзверы і светлыя вокны. Стары тынк аблажылі новым, памалявалі ў аптымістычныя жоўтыя і ясназялёныя колеры. І летам ён нічым не адрозніваўся ад маладых суседзяў.

Напачатку пасяліліся тут ветэраны. Дакладней – ваенныя інваліды. Адзін быў без вока – на ваенны час выпалі дзіцячыя гады, так і не ведае – чужы ці свой асколак асляпіў яго, калі ў мястэчку нашы ворагі страляліся з нашымі сябрамі.

Другі быў без рукі, трэці без нагі. Дзе прапалі тыя канчыны – дом не пытаў. Ён дастаткова доўга жыў, і аб усім здагадваўся сам.

Ветэраны засялілі адзін невялікі пакойчык па ўсходняй сцяне. Невядома адкуль, ці не з сваёй пакалечанай мінуўшчыны, прыцягнулі абдзёртую шафу, хісткія крэслы, стол на трох нагах, бо чацвёртая чамусьці зламалася ў палове лыткі. І цяпер стаяў гэты стол побач з імі, абапіраючыся аб сцяну, аддыхваючыся ад нявыгады сходаў, што ўзводзяцца на другі паверх.

Да гэтых ветэранаў пачалі заходзіць іхнія сябры. Прысаджваліся на хісткія крэслы, на кульгавым стале разгортвалі тоўстыя папкі, дакументы, фатаграфіі. Пісалі нейкія прашэнні, дамагаліся кампенсацыі, падтрымкі, што неабавязкова выяўляецца ў польскіх залатоўках.

Усе тыя лісткі і лісты дылетант успрыняў бы як звычайную паперу. Але дом быў вопытным назіральнікам, здагадваўся, што якраз у гэтых старых фатаграфіях і ўчарашніх дакументах прыхоўваюцца правы на сённяшні дзень.

Следам за ветэранамі прыйшла нейкая партыя. Паставілі пісьмовы стол, чатыры крэслы. На сцяне разгарнулі дзяржаўны герб, бела-чырвоны сцяг.

У гэтым пакойчыку ішлі важныя размовы – будаваліся новыя вуліцы і новыя дамы, узнікалі новыя хатэлі і фабрыкі. Увогуле час быў давыбарчы і сённяшні дзень аддаваў усе свае сілы і ўсе правы невыразна акрэсленай будучыні. Дом глядзеў на гэтую мітусню, сачыў, як мінаюцца на сходах справы сусветнага маштабу з праблемамі штодзённага існавання, а адважныя абяцанкі крочаць упоруч з асноўнымі законамі эканомікі.

Зараз пасля выбараў у паўночна-ўсходнім навугольніку пасяліліся інжынеры-архітэктары. З раніцы да вечара загружаліся ў пакой камп'ютэры, ксераксы, эстампы, запоўненыя накідамі чалавечых мараў, а з чарговым днём з'явіліся і першыя кліенты.

Да інжынераў прыходзілі маладыя людзі. Прыходзілі парамі – ён і яна – прысаджваліся ў калідоры, бралі ў рукі каляровыя праспекты, лісталі старонкі. А на старонках, сонечнымі абразкамі выяўляліся новыя дамы. Часам яны даўжэй спыняліся над паасобнымі рысункамі, можна падумаць – заходзілі ў уяўныя сцены. Ён адчыняў дзверы ў гасцінны пакой, яна – у дзіцячы, на кухню. Чулліва абняўшыся, іх пальцы адляталі ў спальню.

А потым закрывалі праспект, выходзілі з каляровых абразкоў. Крадком, сарамліва, як чалавек, што памылкова і ў непрысутнасці гаспадароў зайшоў на чужую кватэру.

Апошнім пасяліўся ў доме пісьменнік. Выпаў яму на долю пакойчык з заходняга боку, самы маленькі, затое з акном на вуліцу. На гэтае якраз акно былі ў яго вялікія спадзяванні. “Ці раскрыецца акно новай кніжкай”, – думаў, спаглядаючы з другога паверху на чорны хрыбет вуліцы. І сумняваўся. Бо вуліца нат не вуліцай была, а вулачкай, што малаважнай жылкай пульсуе ў сетачцы такіх жа сяброўак. Яе важнасць, яе значэнне, хто ведае, мабыць, зводзілася да нямой прысутнасці на карце мястэчка, да транспарту звычайных спраў з аднае хвіліны ў другую.

У пісьменніка было жаданне напісаць кніжку, важкую і незвычайную. Ён не быў ужо маладзенькім, заходзіў у той час, калі дзверы ў чарговыя дні звужаюцца, левы касяк бліжэй і бліжэй прыгортваецца да правага, а ноч расстаўляе густое сіта зор і трэба бязлітасна адсеяць слова ад балбатні. Што ёсць быццё, што чалавек? Што справядлівасць, а што праўда? На такія пытанні яму хацелася даць адказ.

Але па вуліцы ішлі звычайныя людзі і звычайныя дні. Часам восеньскі дождж вышываў іх

шэрымі ніткамі ў банальны настальгічны смутак. Часам летнім сонцам падмалёўвалася радасная кірмашовая мазня. Не хацелася запісваць такія абразкі і такія настроі.

Ён адыходзіў ад камп'ютэра і глядзеў за акно. А насупраць акна была крама з вопраткай. Называлася аптымістычна: "Капейка". Значыць, кожнаму па кішэні, кожнаму яна даступная. У цёплыя летнія дні прадаўшчыцы раскрывалі дзверы насцеж і можна было назіраць, як няспынным крокам струменяцца туды мясцовыя элеганткі. Пераступіўшы парог, прыпыняюцца між вешалкамі, разглядаюць сукенкі і спадніцы. Гартаюць вопратку, згодна, калектыўна, быццам спалучаныя якой нябачнай сілай у адзін першапачатковы арганізм, у адну бязмежную думку, лістаюць супольную ўсім людзям кніжку, напісаную далёка раней, мабыць, у тую хвіліну, калі святло і змрок раздзяліліся, пайшлі кожны сваім шляхам.

Так думаў пісьменнік і яму не хацелася пісаць. Усё ўяўлялася лішнім і раней сказаным.

Але зноў аднаго дня стаяў ён у акне і глядзеў на вуліцу. Тратуарам ішлі хлопец і дзяўчына, няспешна, нага за нагу. У іхніх далонях, шчыльна сплеценых, бы ў сонечных арэлях, калыхаліся і агульна даступны чэрвеньскі дзень, і маленькае прыватнае шчасце. Спыніліся перад крамай, стаялі хвіліну, зазіраючы адно другому ў вочы, а затым пераступілі адчыненыя насцеж дзверы.

Дзяўчына і хлопец, можна здагадацца, рыхтаваліся да шлюбу. Здымалі з вешалак гарнітуры, ён знікаў на адну хвіліну ў паўзмрочным нутры прымяральні, разгортваючы занавес, яна цікавала за ім. Выходзілі на тратуар, разглядалі ў летнім сонцы колер пінжака або нагавіц і зноў вярталіся ў краму. У хлопца з дзяўчынай было наперадзе ўсё жыццё і яны зараз дэталёва абмяркоўвалі – у які касцюм, у

якую сукенку апрануць свой першы супольны дзень.

Ля прылаўка, побач з хлопцам і дзяўчынай прыпынілася жанчына ў чорнай вопратцы. У яе ўчора памёр муж – малады, трыццацігадовы.

Маладая смерць у малым мястэчку – ніколі не ананімная. Усе ведаюць яе імя і прозвішча, на адну кароткую хвіліну стараюцца адшукаць у памяці яе твар. Пісьменнік глядзеў за акно і таксама стараўся прыгадаць мужчынскую постаць – дзень, тыдзень раней, мабыць, у пары з жанчынай сустракаў іх на гэтай вуліцы.

Але ні твар, ні постаць у памяці не знайшліся.

Жанчына ў чорнай сукенцы, не губляючы залішне часу, прыхапіла штось з прылаўка – нат не паспеў адсачыць – можа хустачку, можа блузачку – загарнула гэта ў пластмасавы пакет і апынулася на вуліцы.

Час гэтай жанчыны размяжоўваўся між цяперашняй хвілінай і заўтрашнім днём, калі на могілках, на ўскраіне мястэчка трэба будзе развітвацца з усім, што было раней.

“Кожны чалавек – усё-такі аўтаномны космас. Людзі ідуць паралельна, плячо ў плячо і папраўдзе – ніколі не сустракаюцца. Нават на вуліцы, нават у краме з вопраткай”, – падумаў пісьменнік. Ён адышоў ад акна, сеў за пісьмовы стол. Глядзеў на тэлефон, што драмаў побач з камп’ютэрам. Хацелася патэлефанаваць Іне – як заўжды, калі было яму дрэнна. Падняў трубку, набраў добра знаёмы нумар. Павярнуўшыся спіной да камп’ютэра, распавядаў абразок за акном.

– Людзі не ідуць паралельна адзін аднаму, – запярэчыла Іна. – Мы перасякаемся кожны дзень і кожную хвіліну. Адчуваем, думаем адзін пра аднаго і нашыя думкі – гэта тыя скрыжаванні, на якіх мы ўвесь час сустракаемся.

У голасе Іны прагучала, як заўсёды, штосьці незвычайнае. Ён не ведаў, як тое штосьці назваць. Кожнае слова здавалася банальным і агульным. А ў голасе Іны непаўторная жаночая лагоднасць спалучалася з па-дзіцячы безабароннай ўпэўненасцю ў перавагу добрага над злым. Гэты голас напаўняў яго спакоем.

Часам прыходзіла на думку і другое: “Я кахаю яе голас”. І ў такіх выпадках ён моцна хваляваўся, як хвалюецца і трывожыцца чалавек, ступаючы ўпершыню на невядомую яму сцежку.

Зараз слухаў яе голас і хацелася спытаць: “А ты? Думаеш пра мяне?”.

Але ён не спытаў. Як ніколі не пытаў яе: “Кахаеш?”. Ён ведаў – паставіўшы такое пытанне і самому трэба даць на яго адказ.

Часам заходзіў да пісьменніка ягоны лепшы сябра Уладзік. Пачынаў размову з надвор’я – раз яркім сонцам выпальвае яно кукурузу ў полі, іншым разам наводзіць неўраджай трускавак празмернымі ліўнямі. І кожная лішняя кропля дажджу, кожны прамень, легкадумна кінуты сонцам на зямлю, выгартае з чалавечых кішэняў залатоўкі.

Ніхто не ведае, на чым грунтавалася гэтае сяброўства.

– Пішаш? – пытаў Уладзік і прысаджваўся побач.

– Не, – адказваў пісьменнік, калі якраз ні адным словам, ні адным сказам не павялічылася напісанае раней. І Уладзік пытаў далей:

– Чаму не пішаш?

І тады пісьменнік распавядаў пра словы, што таксама, бы трускаўкі і кукуруза, спеюць сваім шляхам – часам ад сонца, часам ад дажджу. Часам днём, а часам ноччу. А паскораныя нецярплівасцю вырастаюць вялікімі, пустымі гібрыдамі.

Але здаралася – адказ быў станоўчы: “Пішу”. І Уладзік прысаджваўся яшчэ бліжэй.

– Пра што пішаш?

– А, такое там, – пісьменнік бязрадна разводзіў рукамі. Яму хацелася сказаць пра словы, што даюць адказы на ўсе самыя істотныя пытанні, але дасканала ведаў – няма такіх слоў на ягоных старонках. І яшчэ шырэй разводзіліся рукі. – Пра нас пішу. Зрэшты – няважна.

– І я таксама буду ў тваёй кніжцы? – Уладзік зазіраў у экран камп’ютэра. Можа шукаў там сябе, а можа ўглядаўся і глыбей, шукаючы адказу на пытанне: чаму дарослыя, сталыя мужчыны пішуць кніжкі?

Але на такія пытанні нават камп’ютэру не адказаць.

Дом таксама маўчаў. Бо толькі той, хто ўсё ведае, можа сабе такое дазволіць.

KAMUNIKAT.org

# Змест

Шафа.............................................................. 5
Клёсы.............................................................. 11
У цягніку ........................................................ 17
Дзяўчына ........................................................ 28
Мастацкі нос ................................................... 37
Гравітацыя....................................................... 47
Верш .............................................................. 58
Клаксон........................................................... 65
Сустрэча ......................................................... 73
Ветэраны ........................................................ 81
Зубр................................................................ 89
Кандыдат ....................................................... 121
Вош ................................................................ 127
Знічка.............................................................. 132
Дом ................................................................ 139

KAMUNIKAT.org